WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

18 чэрвеня 2011 г.
СУБОТА
№ 113 (26977)
Кошт 750 рублёў

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «НЕКАЛЬКІ МЕСЯЦАЎ, І МЫ ВЫЙДЗЕМ З ГЭТАЙ СІТУАЦЫІ»


Фота БЕЛТА.

**УЧАРАШНЯЯ прэс-канферэнцыя Аляксандра Лукашэнкі беларускім сродкам масавай інфармацыі выклікала надзвычайную цікавасць з боку прадстаўнікоў мас-медыя з усіх рэгіёнаў краіны. Безумоўна, сказалася эканамічная сітуацыя, якая ўжо пэўны час развіваецца ў Беларусі. І хоць гэта сустрэча з журналістамі была запланавана працоўным графікам Прэзідэнта, па вядомых прычынах мерапрыемства кіраўніку дзяржавы раілі адкласці. «Тады навошта ўвогуле прэс-канферэнцыі праводзіць?» — задаў рытарычнае пытанне Аляксандр Лукашэнка. І адказаў больш як на 30 пытанняў прадстаўнікоў СМІ. Прычым жывую гутарку — з дадатковымі пытаннямі з боку Прэзідэнта, рэмаркамі, выказваннем меркаванняў па той ці іншай праблеме самімі журналістамі — цяжка ўмясціць у пратакольны жанр уласна прэс-канферэнцыі. Прадстаўнікі цэнтральных і рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі сабраліся ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Мінску, каб з першых вуснаў атрымаць адказ на пытанні, што ж насамрэч адбываецца ў краіне зараз і чаго чакаць у бліжэйшай перспектыве? Менавіта гэтага ад нас чакаюць нашы чытачы і гледачы. Больш як пяцігадзінная сустрэча з Аляксандрам Лукашэнкам не пакінула ніякіх сумненняў: і з гэтага крызісу Беларусь выйдзе годна. Як ужо не раз было.**

### БЕЛАРУСЬ ЗАХАВАЕ СВАЮ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНУЮ МАДЭЛЬ РАЗВІЦЦЯ

Паводле слоў Прэзідэнта, ва ўзніклай у краіне паніцы, у тым ліку на спажывецкім і валютным рынках, вялікую ўдзельную вагу адыграла і работа журналістаў. «На валютным рынку з гэтага ўсё і пачалося. Пры спакойным ходзе падзей мы б і сёння спакойна жылі. Але пры той рыначнай, у гэтым выпадку чыстай «некіруемай» эканоміцы, мы атрымалі тое, што маем. Я гавару не таму, што хачу лішні раз папракнуць прэсу, а для таго, каб нагадаць кожнаму журналісту аб яго грамадзянскай адказнасці і прафесійным абавязку. Задача сапраўднай журналістыкі — гэта сумленнае і поўнае інфармаванне людзей аб сітуацыі, фарміраванне канструктыўнага грамадскага меркавання, кансалідацыя намаганняў на вырашэнне задач і ўстараненне праблем», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Сёння ўжо крыху іншымі метадамі спрабуюць расхістаць Беларусь, у тым ліку шляхам гэтага сметніка, імя якому інтэрнэт. Гэта новы падыход, які ўжо апрабаваны ў асобных краінах», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Каментуючы артыкулы ў некаторых СМІ аб тым, што нарэшце беларуская сацыяльна-эканамічная мадэль абвалілася, Прэзідэнт падкрэсліў: «Нікуды яна не абвалілася і ніколі не абваліцца». «Сацыяльна-эканамічнай мадэлі развіцця беларускай дзяржавы быць. Мы ад яе ні на ёту, ні на крок не адступім. Так, сёння склаліся пэўныя праблемы. І я ўжо гаварыў: не трэба ніводнаму чыноўніку выходзіць і бразгаць языком, што трэба тужэй зацягнуць паясы. Больш глупства не знойдзеш, — падкрэсліў беларускі лідар. — Няма той сітуацыі, каб сёння зацягваць паясы. Мы ішлі сваім шляхам, і мы будзем ім ісці».


Фота БЕЛТА.

«Нам трэба працаваць на сваю краіну, на свой народ. Калі мы гэтага не будзем рабіць, а ісці такім шляхам і самі сабе падкідаць гадасці, мы страцім краіну. Сёння ўжо па перыметры стаяць і ляскаюць зубамі, хутчэй бы мы ўпалі. Гэтага не будзе», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

Хойніцкая акушэрка Марыя КУЗЯКІНА:

# «ХАЧУ РАТАВАЦЬ ЛЮДЗЯМ ЖЫЦЦЁ»


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**ДЗІЦЯЧАЯ медыцынская сястра радзільнага аддзялення першай катэгорыі Хойніцкай райбальніцы Марыя Кузякіна яшчэ ў пятым класе ведала, што будзе медыкам. У школьным сачыненні яна так і напісала: «Хачу ратаваць людзям жыццё» (нядаўна адна з дачок Марыі Міхайлаўны адшукала сшытак з гэтым сачыненнем).**

— Я добра вучыла хімію і біялогію і наогул добра вучылася, каб мара, стаць навучэнкай Мазырскага медвучылішча — здзейснілася. А потым, адвучыўшыся, вярнулася ў родную вёску Уласы.

Праца акушэркай у глыбінцы — вялікая школа для медыка. Дзевяць гадоў Марыя ўзначальвала ФАП і апекавала парадзіх, адвозіла іх у райбальніцу.

— Тройчы давялося прымаць роды ў аўтамабілі на паўдарогі да Хойнікаў. А аднойчы — нават у будцы вартавога каля чыгуначнага моста цераз Прыпяць.

А чыгунка, дарэчы, вяла на Чарнобыльскую станцыю, з-за якой пазней назаўсёды знікнуць дзясяткі хойніцкіх вёсак. У тым ліку і Уласы. Марыя Кузякіна была сярод апошніх, хто пакідаў сваю маленькую радзіму. Спачатку эвакуіраваўшы дзяцей і цяжарных жанчын, адправіўшы з вёскі ўсіх да аднаго сваіх суседзяў і старэйшых аднавяскоўцаў, пагрузіўшы калгасную жывёлу. Да 4 мая 1986 года вёска яшчэ жыла звычайнымі зямнымі клопатамі, атрымліваючы вялікія рэнтгены апраменьвання.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

**Работнікам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь**

**Дарагія сябры!**

Сардэчна віншую вас з прафесійным святам — Днём медыцынскага работніка.

Вы з'яўляецеся сапраўдным прыкладам міласэрнасці, спачування і гатоўнасці заўсёды прыйсці на дапамогу. Аўтарытэт медыкаў у грамадстве пастаянна расце, а ролю аховы здароўя ў сучасным свеце наогул немагчыма пераацаніць.

У апошнія гады беларуская медыцына дэманструе значныя поспехі ў распрацоўцы перспектыўных метадаў прафілактыкі, дыягностыкі і лячэння. Асвойваюцца перадавыя тэхналогіі, ствараюцца новыя лекавыя прэпараты. Гэтыя дасягненні па заслугах ацэнены не толькі на радзіме, але і далёка за яе межамі.

У сваю чаргу, дзяржава надае асаблівую ўвагу сістэме аховы здароўя, умацаванню яе матэрыяльна-тэхнічнай базы. У нашай краіне павелічэнне нараджальнасці, павышэнне працаздольнасці і якасці жыцця грамадзян — найважнейшыя прыярытэты нацыянальнай палітыкі.

Прыміце шчырую ўдзячнасць за вашу працу, за тое, што з гонарам працягваеце традыцыі айчыннай аховы здароўя.

Жадаю вам дабра, міру, моцнага здароўя і новых дасягненняў у вашай нялёгкай, але такой неабходнай службе на карысць народа Беларусі.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк», расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 24 ИЮНЯ 2011 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

***1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.***

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 21 июня), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 24 июня) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

**Дата окончания приема бюллетеней – 21 июня 2011 года.**

**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 12, 218 84 73.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

**ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА**

**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, принадлежащего ОАО «Мастра»**

**Лот № 1.** Изолированное помещение, инв. № 500/D-708009831, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 2В, помещение 10, общей площадью 165,3 кв.м, назначение — производственное помещение. Начальная стоимость — 486 273 600 белорусских рублей. Минимальная величина первого шага составляет 5% стоимости имущества в размере 24 313 680 белорусских рублей.

Стоимость имущества указана с учетом НДС.

Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/, а также в помещении хозяйственного суда г. Минска: г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

**Торги состоятся 12.07.2011 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.**

**За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Есина Л.С., тел./факс: 294 93 84, (029)1773254 ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67.**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет хозяйственного суда город Минска № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» Минск, код 795, УНП 101541763 не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

# «НЕКАЛЬКІ МЕСЯЦАЎ, І МЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Сёння людзі перажываюць, што цэны высокія, а некаторым імпарту не хапае. Але паесці ёсць што. Грошай не хапае? Некалькі месяцаў, і мы выйдзем з гэтай сітуацыі. Але галоўнае, што мы можам вырабіць сваё. І калі наогул будзе катастрофа, закрыем граніцы і будзем купляць толькі тое, што нам трэба. Вядома, не дай бог, калі нам давядзецца перакрываць граніцы, як гэта мы робім па асобных таварах сёння на паўднёвым і заходнім напрамках», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

## КРЫЗІСУ ЎЛАДЫ Ў БЕЛАРУСІ ДАПУСЦІЦЬ НЕЛЬГА

«Многія кажуць: хто вінаваты, чаму Прэзідэнт да гэтага часу не адрэзаў некаторым галовы? На гэта я хачу сказаць. Паважаныя таварышы, я не пацан і не хлопчык. Я бачу аб'ектыўныя прычыны і суб'ектыўныя. Я бачу, хто вінаваты і не вінаваты. І я сказаў — так, ёсць людзі, якія за гэта павінны адказаць, але попелам галаву пасыпаць нельга», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, калі нават Нацыянальны банк ажыццявіў залішнюю эмісію грошай, укінуўшы гэтыя грошы ў эканоміку, то і многае зроблена, пачынаючы ад сельскай гаспадаркі, завяршаючы мадэрнізацыяй у нафтаперапрацоўцы. «Чаго мы мітусімся, чаго мы пасыпаем попелам галаву і крычым: «Давай, Лукашэнка, рэж! Я ж ведаю, хто падкідае гэтыя ідэі. Нам што, яшчэ на гэту паніку і ажыятаж, які мы перажываем, накласці крызіс улады? Вось тады будзе канец. Усе гэта добра разумеюць», — сказаў Прэзідэнт.

...«У нас новы ўрад, куды яму даваць адстаўку? Гэта першае пытанне. І другое — назавіце прозвішчы тых, хто можа ўзначаліць урад і Нацбанк, — сказаў Аляксандр Лукашэнка і назваў гэтыя пытанні рытарычнымі. — Людзей, якія ведаюць, што такое праца і адкуль бярудца грошы, вопытных людзей — адзінкі».

«Вінавацьце мяне — у мяне ў руках усе паўнамоцтвы, — прадоўжыў Прэзідэнт. — Я гэта перажыву, мне не прывыкаць. Для мяне важна цяпер не вышукваць кагосьці і публічна для піяру некаму скруціць галаву. Не гэта галоўнае».

Тыя, хто заклікае да пошуку і пакарання вінаватых у існуючай сітуацыі, хочуць спарадзіць хаос улады, лічыць Аляксандр Лукашэнка. «Такі падарунак я ім зрабіць не магу», — дадаў ён.

«Цяпер трэба супакоіцца і спакойна перажыць гэтыя часы. Гэта не крызіс. У нас няма ніякага крызісу. У нас былі паніка і ажыятаж, якія прывялі да масавай скупкі валюты ў абменніках і, у выніку, рэзкаму скачку цэн», — дадаў ён.

## ВАЛЮТЫ Ў АБМЕННІКАХ ПАКУЛЬ НЕ БУДЗЕ

«Калі вы хочаце ў мяне спытаць, ці будзе ў абменніках валюта, — не будзе пакуль. А можа, і будзе, калі хтосьці прынясе. Але дзяржава ў гэту гульню да 1 ліпеня як мінімум гуляць не будзе. Ведаеце чаму? Таму што многія хочуць купіць аўтамабілі. Не спаў ажыятаж. Скупяць гэту валюту, $2 млрд. вылецяць у трубу. Я на гэта не пайду», — сказаў Прэзідэнт.

«Вось як мы ідзём спакойна, так і пойдзем. А потым — паскорымся. Але гэта будзе ў ліпені месяцы. Вось, калі хочаце, праўда. Большага я сказаць вам проста не магу і не маю права. Не таму што я цямню. Таму што нам трэба дакладней выбраць курс, або выхад з балота, у якое мы трапілі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Нават Br5 тыс. за $1 — завышаны курс, лічыць Прэзідэнт. «Мы стварылі паніку, узнялі цэны, і гаворыць — крызіс. Які крызіс, калі мы ўпершыню ў гісторыі нашай краіны за гэты год атрымалі каля $20 млрд. Будзе яшчэ больш», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, перш чым рэзка вырашаць валютную праблему, неабходна пагледзець, куды пайшлі гэтыя грошы. «На лекі, на газ, на нафту... Колькі насельніцтва скупіла? Насельніцтва да гэтага часу прадаўжае купляць валюту, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Прадае больш, чым купляе».

Як адзначыў старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч, які таксама прысутнічаў на прэс-канферэнцыі, у сярэднім у дзень насельніцтва прадае каля $10 млн. Акрамя таго, ужо сёння пасля прыняткі мер поўная колькасць валюты ў памеры $20-30 млн. застаецца пасля разлікаў за лекі, газ і іншыя тавары, якія ўвазходзяць у крытычны імпарт.

«За паўгоддзе мы будзем бачыць поўную карціну, і тады можна будзе на нейкую педаль націснуць, коць усе педалі вызначаны. Я доўга маўчаў, але потым зрабіў вавад: Br5 тыс. за $1 — гэта нават завышаны курс для нашай краіны. Пакуль ёсць адкладзеная чаканне, пакуль яшчэ сёй-той хоча купіць аўтамабіль да 1 ліпеня, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Попыт на валюту захоўваецца ажыятажны. Вы хочаце, каб я яго задаволіў, — можна, але за адзін раз трэба ўкінуць мільярд, а, можа, і два мільярды долараў. Вы гатовы сёння $2 млрд. з золатавалютных рэзерваў укінуць на рынак. Я — не. Таму што гэту валюту атрымаюць тыя, хто можа або пачакаць, або ўвогуле яны не павінны яе атрымліваць. Прыносіш у краіну валюту — трацьце. Не прыносіш — не спадзявайся, што ты яе атрымаеш».

«Трэба прывыкаць да свайго. З крызісу мы павінны выйсці з меншым імпартам. Галоўная прычына цяперашняй сітуацыі ў краіне ў тым, што мы купляем больш, чым прадаём», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Золатавалютныя рэзервы не будуць выкінуты на рынак, заявіў Прэзідэнт. «Вы хочаце, каб я выкінуў на рынак золатавалютныя рэзервы, якія належаць нашым дзецям? Я гэтага не зраблю! — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Таму што вы мяне потым пракленяце. Гэта стратэгічны запас, выбачайце, на выпадак вайны. І я загадаў ураду і Нацыянальнаму банку: больш валюту не выкідваць. Прыносяць валюту — няхай жывуць, не прыносяць валюту — няхай цярпяць».

Паводле слоў Прэзідэнта, існуючая сітуацыя абумоўлена ў тым ліку тым, што за тры гады ў 4,1 раза ўзнялася цана на прыродны газ, а розніца ў цане за блакітнае паліва ў Смаленску і ў Беларусі — у 3 разы. «Якая эканоміка гэта вытрымае? Вы думаеце, лёгка прадпрыемствам канкурыраваць на расійскім рынку, а туды мы палавіну прадукцыі прадаём? — задаў пытанне Прэзідэнт. — Нафта каштавала паўтара года таму $60-70 за барэль, а цяпер — $115-120. Якая эканоміка вынесе такі ўдар?!»

## РЭФОРМА — НЕ ПРОДАЖ ЛЕПШЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ЗА БЯСЦЭНАК

Беларусі не патрэбны рэформы ў выглядзе прыватызацыі за бясцэнак лепшых прадпрыемстваў краіны, перакананы Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што апошнім часам часта чуваць размовы аб неабходнасці правядзення ў Беларусі нейкіх рэформ. «Калі нам прапанаваў сёй-той крэдыт, нам гаворыць: трэба рэфармаваць беларускую эканоміку. Вы ведаеце, што яны мелі на ўвазе, — сказаў Прэзідэнт. — У нас сёння вельмі шмат дзяржаўных прадпрыемстваў і закадта многа дзяржаўных пакетаў акцый у акцыянерных таварыствах. Нам кажуць: рэформа — гэта прыватызацыя, прадаць прадпрыемства».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ён не выступае супраць прыватызацыі. «Але калі б гэта была ваша ўласнасць або вы былі б на маім месцы, вы падумалі б: так, прадаць можна, але падаражэй. Танна ніхто не прадасць», — канстатаваў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што Беларусь гатова прадаць нават адно з самых каштоўных прадпрыемстваў — «Беларуськалій», рэнтабельнасць якога, паводле слоў Прэзідэнта, складае ад 70 да 100 працэнтаў. «Мы нават гэта прадпрыемства гатовы прыватызаваць. Умовы прапісаны: каб яно развівалася, каб яго не закрылі, каб работнікі атрымлівалі кожны год большую заработную плату, сацыяльна былі абаронены, і галоўнае — каб гэта прадпрыемства мадэрнізавалася», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што цана продажу «Беларуськалія» ўжо называлася — $30 млрд. «Я назваў суму — $30 млрд. Прыходзьце, будзем вырашаць. Калі ў вас $12 млрд., прадаю 40 працэнтаў», — паабяцаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што ведае тых, хто сёння точыць зубы на беларускія прадпрыемствы. Прычым інтарэс перш за ўсё да такіх, як «Беларуськалій», МАЗ, БМЗ, БелАЗ, нафтаперапрацоўчыя прадпрыемствы. У свой час яны былі мадэрнізаваны за кошт дзяржавы і сёння адны з лепшых у Еўропе. «На дрэнныя ніхто не будзе тачыць зубы. Таму пад рэформамі ў нас разумеюць перш за ўсё ў дзяржавы забраць, аддаць прыватніку, а калі і прадаць — за адзін долар або па малой цане», — лічыць Прэзідэнт. Ён падкрэсліў: «Такая прыватызацыя нам не патрэбна».

## БЕЗ РЭЗКАГА РОСТУ ЦЭН

У Беларусі не павінна быць ні рэзкага росту цэн, ні рэзкага павышэння заработнай платы, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў, што пенсіі па яго рашэнні ў чэрвені павысілі ўжо. Будуць павышаны пенсіі ў жніўні, потым восенню «яшчэ раз пенсіі ўзнімем, будзе магчымасць, у гэтым годзе яшчэ раз праіндэксуем», сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Мы выведзем пенсіянераў, студэнтаў, дзяржаўны сектар прыкладна на той жа ўзровень, што і быў да гэтага ажыятажу, выведзем, таму на запас нічога не купляйце», — сказаў ён.

Што датычыцца прадпрыемстваў, то яны таксама павінны стрымана павышаць зарплату. Як не павінна быць рэзкага росту цэн, так не павінна быць і рэзкага росту зарплат. «Калі толькі мы цяпер пачнём шалёнымі тэмпамі павышаць зарплату, чакайце новай хвалі інфляцыі», — папярэдзіў Прэзідэнт. Гэта можа прывесці да таго, што адразу ж узнімуцца цэны. Таму павышаць зарплаты трэба паступова, што цяпер і робіцца ў дзяржаўным сектары. І прыватнаму сектару на гэта таксама трэба арыентавацца. «І мы спакойна на працягу некалькіх месяцаў пры адсутнасці гэтага ажыятажу і гвалту вырулім на тую вышыню, на якой мы павінны знаходзіцца, для таго, каб спакойна будаваць сваё жыццё, гэта самае галоўнае», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Да таго ж глебы для ажыятажу цяпер няма, цэны і так высокія, лічыць ён.

Кіраўнік дзяржавы параіў тым, хто крытыкуе ўладу за існуючую сітуацыю, выступаць з прапановамі. «Крытыкуеце? Прапануйце!» — заклікаў ён. Усе шляхі выхаду з гэтай сітуацыі вядомы, а ў свеце іх было нямала, лічыць Аляксандр Лукашэнка. «Нам трэба выбраць адзін з іх і прыстасаваць да яго краіну, — лічыць Прэзідэнт. — Абсалютна аднолькавых шляхоў не бывае. Толькі дурань можа ісці тым шляхам, якім ішлі калісьці Расія, якім нейкія дзяржавы. Мы павінны, зыходзячы з нашага курсу, зыходзячы з нашай палітыкі, зыходзячы з патрабаванняў нашага народа, прыстасаваць той ці іншы шлях».

Паводле слоў Прэзідэнта, краіна выбрала шлях спакойнага выхаду з гэтай сітуацыі. Пасля першага паўгоддзя, калі будуць статыстычныя вынікі, «мы яшчэ хутчэй пойдзем», упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

## ДВА БАКІ ДЭВАЛЬВАЦЫІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што і пасля гэтай дэвальвацыі народ у Беларусі будзе жыць нармальна, але дзяржаўныя сродкі неабходна расходаваць больш ашчадна.

«Так, на жаль, двойчы мы прыходзілі да гэтай непапулярнай меры, але не загінулі ж. Пасля той дэвальвацыі мы нармальна жылі. І пасля гэтай будзем нармальна жыць. Але ўжо такога размаху, і ў жыллёвым будаўніцтве, і ў сельскай гаспадарцы, нам і не трэба, і не будзе, нават калі будзе патрэба. Трэба крыху нам больш акуратнымі быць. Так размахвацца мы больш не будзем, будзем весці палітыку больш акуратна», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.


Фота БЕЛТА.

«Дэвальвацыя нацыянальнай валюты — гэта карысць для экспартаарыентаванай эканомікі. І сёння прадпрыемствы, якія працуюць на экспарт, маюць нармальныя грошы, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Так, ёсць некаторыя прадпрыемствы, чыста імпарцёры, мы іх будзем падтрымліваць і выдзяляць валюту, каб яны не абваліліся».

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што гаворыць аб адсутнасці ў Беларусі крызісу, маючы на ўвазе тое, што ў краіне не закрываюцца заводы і фабрыкі, людзей не выкідваюць на вуліцу.

«Галоўнае, каб мы гэты час не праелі. Галоўнае цяпер — атрымаць з гэтага выгаду. Трэба ўкласці грошы ў мадэрнізацыю і павышэнне якасці прадукцыі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка

## ПАДУШКА БЯСПЕКІ — ЗА КОШТ КРЭДЫТАЎ

Крэдытныя рэсурсы патрэбны Беларусі для стварэння падушкі бяспекі, заявіў кіраўнік дзяржавы. «Нам гэтыя мільярды тры патрэбны не для таго, каб кудысьці ўкінуць, а для таго, каб у Нацыянальным банку стварыць падушку бяспекі. Каб у нас не 5-7 мільярдаў было вось гэтых золатавалютных рэзерваў, а 10-13. Як толькі будзе больш за 10, нам гэтыя катаклізмы будуць не страшныя», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы таксама сказаў, што калі б і не былі выдзелены гэтыя сродкі ЕўрАзЭС, выйшлі б з гэтай сітуацыі. «Тым больш гэта крэдыт. Хоць і невялікі працэнт, але ўсё роўна яго трэба вярнуць. Проста так бясплатна грошай ніхто не дасць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка і падкрэсліў, што трэба разумна распарадзіцца грашыма.

## ДА НІЗКІХ ПЕНСІЙ УСТАНОВЯЦЬ ДАПЛАТЫ

На пытанне карэспандэнта «Звязды», ці не адбудзецца «адкату» цэн на некаторыя тавары, як гэта было з аўтамабільным палівам, кіраўнік дзяржавы патлумачыў, што ў Беларусі будзе выкарыстана іншая методыка. У прыватнасці, даходы насельніцтва будуць паявлічвацца адпаведна росту цэн.

Прэзідэнт у прыватнасці сказаў, што не з'яўляецца прыхільнікам прыняцця такіх рашэнняў у існуючай сітуацыі, пакольку і так цэны на многія віды тавараў у Беларусі ніжэйшыя, чым у суседніх краінах. «Калі яшчэ панізім цану, яшчэ больш будзем карміць нашых суседзяў», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. Ён лічыць, што замест павышэння цэн Беларусь выбрала больш правільны шлях: «Мы цяпер выводзім даходы насельніцтва на больш высокі ўзровень, каб людзі маглі жыць, прыстасаваўшыся да гэтых цэн. Гэта правільны шлях. Але нельга тузаць людзей пастаянна і біць іх па галаве. Нельга рэзка ўзнімаць цэны».

Паводле слоў Прэзідэнта, цэны «самі па сабе не страшныя, страшна, калі ў людзей не хапае грошай па гэтых цэнах купіць тавары». Таму павышэнне цэн павінна адбывацца сінхронна з ростам узроўню даходаў насельніцтва.

Рост зарплат і стыпендый будзе залежаць ад напаўняльнасці бюджэту, патлумачыў Аляксандр Лукашэнка. «Прыкладна 800 тыс. чалавек ужо атрымалі даплаты, — сказаў Прэзідэнт. — І каля Br180 тыс. будзем даплачваць тым, у каго невысокія памеры пенсій. Я аддаў такое распараджэнне: у ліпені даплацім, і нядрэнна даплацім, каб яны маглі справіцца з сітуацыяй».

«А потым паціху-паціху будзем выходзіць на той узровень (ёсць міжнародная методыка), каб чалавек мог нармальна існаваць пры гэтых цэнах, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Вось якая палітыка ў гэтым плане будзе ажыццяўляцца. Людзям не трэба крыўдзіцца, што няма інфармацыі».

«Зарплаты і стыпендыі зменяцца ў залежнасці ад таго, колькі мы будзем мець грошай у бюджэце, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы прыпынім шмат што, каб паправіць матэрыяльнае становішча людзей».

Разам з тым, каб дагадзіць спажыванню, не будзе прыпынена фінансаванне мадэрнізацыі аховы здароўя, а таксама харчавання дзяцей ва ўстановах адукацыі. «Дзеці — гэта святое, — дадаў Прэзідэнт. — Скарачаць у гэтым плане не будзем».

«Мы на працягу некалькіх месяцаў, нават без крэдытаў, якія нам выдзелілі, з сітуацыяй справімся. Паверце, справімся», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, бюджэт у краіне фарміруецца з прафіцытам. Рэсурсы будуць пераразмяркоўвацца па прыярытэтных напрамках, у тым ліку і на падтрымку насельніцтва. «Дзесьці прыпынім, штосьці прытармозім, а перакінем на тое, каб падтрымаць людзей», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Золатавалютныя рэзервы Беларусі ў бліжэйшы час дасягнуць $10-12 млрд.

«Гэта будуць нашы грошы, не крэдыты», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Выстаяць, вытрымаць і выйсці на той узровень, на якім мы былі, — справа майго гонару, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — І я бачу ўжо гэтыя расткі».

## Br 4500 — НА «НАРОДНЫ» БЕНЗІН

Аляксандр Лукашэнка лічыць магчымым павышэнне цэн на высокаактанавы бензін. Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што, аддаючы даручэнне знізіць цэны на паліва да Br4,5 тыс., ён меў на ўвазе бензін маркі Аі-92, якім карыстаецца большасць. А што датычыцца высокаактанавых марак Аі-95 і Аі-98, то павышэнне цэн на гэтыя віды бензіну магчыма, бо ім карыстаецца, паводле слоў Прэзідэнта, усяго толькі каля 10 працэнтаў насельніцтва. «Гэта крутасць, бізнэсмены і чыноўнікі. Ну, дык няхай і даражэй плацяць. Бензін не павінен каштаваць даражэй за Br4,5 тыс. — гэта я меў на ўвазе бензін Аі-92 — той, які масава спажываецца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. У той жа час ён падкрэсліў, што рост цэн нават на высокаактанавы бензін павінен быць без рэзкіх скачкоў на 30 працэнтаў, або на 10 працэнтаў. Павышэнне кошту павінна ісці паступова і сінхронна з ростам даходаў насельніцтва.

Прэзідэнт прызнаў, што цяперашняя цана на паліва «не занадта ўжо рэнтабельная для нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў, але жыць можна».

## АКЦЫІ СУПРАЦЬ АБМЕЖАВАННЯЎ НА ВЫВАЗ ТАВАРАЎ БУДУЦЬ РАСЦЭНЬВАЦЦА ЯК ВЫПАДЫ НЕ ТОЛЬКІ СУПРАЦЬ УЛАДЫ, АЛЕ І СУПРАЦЬ НАРОДА

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што меры па абмежаванні вывазу паліва і іншай прадукцыі з Беларусі прыняты правільна ў сувязі з бягучай сітуацыяй, калі цэны з дзяржавамі-суседзямі адрозніваюцца.

«Я не супраць таго, каб мы гандлявалі, і людзі ў тым ліку. Але калі мы бачым — такая сітуацыя, што ў нас 75 цэнтаў літр бензіну ў сярэднім, а ў Польшчы 2 долары і прыкладна столькі ў Прыбалтыцы, выгадна туды вазіць прадаваць. Гэта ненармальна. Больш таго, не толькі для нас, але і для літоўцаў і палякаў гэта яшчэ большы ўрон. Мы амаль паў-Польшчы і ўсю Прыбалтыку забяспечвалі сваім бензінам за кошт гэтага кантрабандната, так званага бензіну, і ў іх на запраўках ніхто гэта паліва не купляў. Гэта вялікі ўрон для бюджэту, і яны пачалі прымаць меры барацьбы супраць нашых спекулянтаў, якія ўвозілі туды бензін і іншыя тавары», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён дадаў, што асабліва сітуацыя абвастрылася, калі ён распарадзіўся панізіць цану на паліва і выходзіць на роўныя цэны з суседзямі паступова. Гэта адбудзецца бліжэй да зімы, «калі палова насельніцтва ўжо на аўтамабілях ездзіць не будзе». «Можа, гэта будзе зусім іншая цана да таго часу, калі мы прыйдзем да аднаго цвёрдага курсу», — адзначыў Прэзідэнт.

# ВЫЙДЗЕМ З ГЭТАЙ СІТУАЦЫІ»



«Што яны ад мяне патрабуюць? Адкрыйце граніцу, мы будзем туды-сюды вазіць і ездзіць. Граніца — гэта вялікі рэгулятар, у тым ліку і эканамічнай сітуацыі. Камусьці хочацца вывозіць паліва — дзяржаве пакуль гэта не выгадна, таму і было прынята такое рашэнне. Цяпер ужо гэтай праблемы няма. Можа, у кагосьці застаўся дрэнны настрой ад гэтага, але мы пакуль будзем і тут рэгуляваць, нам гэта трэба», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Пакуль мы будзем зыходзіць з гэтага. Як толькі спыніцца адток бензіну і іншых, як толькі мы ўбачым, што гэта неактуальна, мы адменім. А пакуль гэта будзе дзейнічаць, і акцыі пратэсту тут толькі на шкоду. Пакуль мы спакойна размаўлялі, можа, людзі не чулі, не зарыентаваліся і іншае. А наступныя акцыі мы будзем расцэньваць як выпад не толькі супраць улады, але і народа. Адпаведна, будзем паводзіць сябе ў рамках закона. Бяры, чытай закон і глядзі, што будзе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што такія абмежавальныя меры на вываз тавару прымаюць і іншыя краіны, у тым ліку Расія. Ён лічыць неправамерным крытыку за такія дзеянні. «Чаго нас крытыкаваць, у сябе паглядзіце!» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

## УМЯШАННЕ ДЗЯРЖАВЫ Ў ЭКАНОМІКУ БЕЛАРУСІ АБГРУНТАВАНАЕ

«Я ведаю сітуацыю ў эканоміцы, і гэтыя размовы аб тым, што дзяржава не павінна перашкаджаць бізнэсу працаваць. Скажыце, а каму мы перашкаджаем, у чым? Мы нават праверкі змянілі. Я ўжо разагнаў кантралёраў, і яны баяцца хадзіць нават там, дзе трэба правяраць», — адзначыў Прэзідэнт.

«Так, можа быць, дзе-нідзе ёсць і валакіта. Але гэта жыццё», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. У асноўным жа, напрыклад, з рэгістрацыяй бізнэсу ў краіне праблем няма: ідзі рэгіструйся і працуй.

«Гавораць, трэба спрасціць падатковае заканадаўства, скараціць падаткі, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Але мы ўжо тры разы рэфармавалі падатковае заканадаўства. І гэты працэс прадаўжаецца». Калі параўнаць падатковую сістэму Беларусі з сістэмамі іншых краін, то аказваецца, што наша сістэма прасцейшая. Што датычыцца бухуліку, то ён таксама ў Беларусі пастаянна спрашчаецца. «Мы першыя сярод краін СНД перайшлі на ўлік па стандартах Еўрапейскага саюза. Таму сёння не так проста, і ўсе стогнуць, што трэба прасцей. Я іду на повадзе і, калі трэба,


Фота БЕЛТА.

спрашчаю. Напэўна, на працягу года-двух мы створым зусім простую сістэму», — дадаў Прэзідэнт.

...«Слава богу, што прыкладна 30 працэнтаў аптовага гандлю я захаваў у дзяржаве. І слава богу, што канкрэтныя прадпрыемствы, супер- і гіпермаркеты і іншыя будаваліся па маім дазволе. Не так проста іх было пабудаваць. Я настаяў, каб яны былі пабудаваныя. І бізнэсмены ў нейкай ступені мне абавязаны. Мы да іх звярнуліся, таму што яны сёння асноўны гандаль ажыццяўляюць. Людзі, цяжка, давайце, пацярпіце, няхай рэнтабельнасць будзе невялікая. І яны адгукнуліся. А калі б гэтага не было? І што мне ад гэтага неўмяшання і некантролю цэн? — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Таму так, у гэтай сітуацыі я ўмяшаўся. Некаму не падабаецца, але я так вырашыў. Я маю права прыняць гэта рашэнне. І як аказалася, яно справядлівае. Гэта было абгрунтаванае рашэнне. Нават пры гэтых цэнах усе працуюць і не гінуць. Дык якое ж тут умяшанне?»

«Мы ўмешваліся ў эканоміку, калі трэба. Але наконт эфектыўнасці ў нейкай ступені я спрачацца не буду. Не буду спрачацца, што прыватнік палічыць лепш за дзяржаўнага дырэктара. Але ведаеце, калі прыйдзе прыватнік на «Беларуськалій», там будзе рэнтабельнасць не 80 працэнтаў як сёння, а 82 працэнты, то, я думаю, атрымаем мы няшмат. Не трэба абагаўляць прыватніка. Не трэба з яго рабіць свяшчэнную карову. Супакойцеся. Эфектыўнасць пакуль не ляжыць у сферы дзяржаўных прадпрыемстваў або прыватных», — сказаў Прэзідэнт. Эфектыўнасць вытворчасці ў Беларусі сёння ў многім залежыць ад знешніх фактараў, у тым ліку ад цаны на газ, ад кошту новага абсталявання. «Таму


Фота БЕЛТА.

пакуль дзяржаўныя прадпрыемствы, якія нармальна і рэнтабельна функцыянуюць, няма неабходнасці рэзаць. Мы можам іх прадаць, але трэба будзе заплаціць добрую суму», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

## ЦЭНЫ НА ТАВАРЫ ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ — ПАД КАНТРОЛЕМ

Аляксандр Лукашэнка даручыў трымаць на кантролі цэны на школьныя тавары.

«Дзеці з бедных сем'яў у парваных штанах прыйдуць у школу? Гэтага быць не павінна! — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандра Радзькова. — Немалыя грошы мы рэзервуем на тое, каб дапамагаць сем'ям у падрыхтоўцы дзяцей да школы».

## ГРОШЫ НА ЎКЛАДАХ ІНДЭКСУЮЦЦА

Няма ніякай неабходнасці здымаць грошы з банкаўскіх укладаў, заявіў Прэзідэнт. «Калі вы хочаце яшчэ і банкі ў крызіс увесці, то бяжыце і здымайце, але потым будзе яшчэ складаней. Няма ніякай неабходнасці беларускія грошы здымаць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, калі пачнецца актыўнае зняцце грошай з укладаў, то тады не трэба разлічваць на павелічэнне дапамог і зарплат: «Гэта ж эканоміка нашай краіны. Гэта самая галоўная падушка бяспекі. Самыя вялікія сродкі ў нас у насельніцтва. У любой дзяржаве грошы насельніцтва ў банках — гэта вялікі рэсурс».

«І калі вы іх адтуль возьмеце, вы спародзіце новы крызіс. Хочаце новага крызісу, банкаўскага, — бяжыце здымайце», — сказаў беларускі лідар.

Пры гэтым ён адзначыў: «У банку, няхай не на 30 працэнтаў пад інфляцыю, хоць мы плануем і гэта зрабіць, але грошы індэксуюцца. Навошта сёння з рахункаў здымаць грошы?»

Аляксандр Лукашэнка таксама паведаміў, што ў разы павялічыліся выпадкі рабавання грашовых сродкаў, паколькі злачынцы скарысталіся сітуацыяй.

«Максімум у ліпені-жніўні мы практычна адкажам на ўсе вашы пытанні па дзеяннях, накіраваных на стабілізацыю ў эканоміцы», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

## БЕЛАРУСЬ НЕ БУДЗЕ ПАВЫШАЦЬ ЦЭНЫ НА ТАВАРЫ ДА ЎЗРОЎНЮ СУСЕДНІХ КРАІН

Адказваючы на пытанне, ці вырастуць у Беларусі цэны да ўзроўню суседніх краін, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Не. Калі ў нас будуць такія цэны або крыху вышэйшыя, мы не прададзім свой тавар. Усё ж такі цану тут трэба трымаць крыху ніжэйшую. І потым, у нас няма ніякай неабходнасці ў такой цане, як там. Там вельмі рынкавая эканоміка і ёсць іншыя нагрузкі. Таму там, нягледзячы на таннасць прыроднага газу і нафты, у іх адпаведныя цэны».

«Мы блізка да гэтага будзем трымаць цэны, але так, каб у нас яны былі крыху ніжэйшыя, каб яны ўсё ж такі ў нас тавар куплялі. Не будзе ажыятажнага попыту, але тавар купляць будуць», — адзначыў Прэзідэнт.

«Мы ж чаму цэны павышаем? Таму што долар падаражэў. Але я задаю іншае пытанне: а ці трэба нам усё гэта прывязваць да долара ў гэтым выпадку? Хто гарантуе, што долар застанецца на тым жа ўзроўні, калі мы пачнём рынкавае рэгуляванне? А калі ён стане Br4,5 тыс. за $1? Які сэнс тады павышаць цэны?» — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Таму, што датычыцца цэнаўтварэння, тут трэба ісці не рыўкамі, паколькі потым цану ўжо не знізіш, а паступова. Потым, калі мы ўбачым, што няма неабходнасці павышаць цэны, спынімся», — дадаў ён.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што дзяржава прадоўжыць падтрымліваць маламаёмныя слаі насельніцтва. «Студэнтам стыпендыі мы праіндэксавалі. Да верасня я даручыў яшчэ раз праіндэксаваць стыпендыі. Паглядзім, якая сітуацыя будзе. Пенсіянерам дапамаглі. Дзецям праіндэксуем, карміць будзем. Я нават цяпер забараніў рухацца па ЖКГ, хоць з 26 працэнтаў долю аплаты насельніцтвам мы да 23 працэнтаў зменшылі. А трэба выйсці хаця б на 30 працэнтаў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

## БУДАВАЦЬ СВОЙ ДОМ НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ

Прэзідэнт Беларусі лічыць, што беларусы павінны жыць на сваёй зямлі і будаваць сваё шчасце самі.

«Я прэзідэнтам не першы тэрмін, не пяць гадоў і не тры гады. Я вось наеўся ўжо гэтага. І калі камусьці так хочацца паспрабаваць — прыйдзе час, паспрабуеце. Толькі падумайце, ці зможаце вы з гэтым чалавекам утрымаць краіну. Я ж разумею, што вы не хочаце ні ў складзе Расіі быць, ні ў Еўрасаюзе на прынцыпах прыбалтыйскіх дзяржаў. І правільна, і я гэтага не хачу. Я хачу, каб мы сваё шчасце знайшлі тут», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Такая палітыка і такая незалежнасць дорага каштуюць, нагадаў Аляксандр Лукашэнка. «Гатовы вы за яе плаціць — давайце будзем плаціць. Не гатовы — скажыце, што вы не гатовы, 90 працэнтаў нашага насельніцтва. Я з вамі, вядома, не пайду іншым шляхам, але вы — калі ласка, можаце ўваходзіць у склад любой дзяржавы, у склад Еўрасаюза, але без мяне, — сказаў ён. — Але пакуль тое, што я прапаную грамадству і вам: давайце жыць на сваёй зямлі і як ні было б складана і цяжка будаваць сваё шчасце самім тут — пераважнай большасцю грамадства гэта нармальна ўспрымаецца».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што іншай палітыкі, як жыць на сваёй зямлі, у Беларусі не будзе. «Нам гавораць так: вы хочаце смаленскую цану на прыродны газ? Я гавару: так, мы ж у Саюзнай дзяржаве. Тады ўступайце ў склад Расіі, калі вы будзеце ў складзе Расіі, будзе такая ж цана. Напэўна, яны маюць рацыю, але я сказаў: не, будзем плаціць $250 за тысячу кубоў. Я выбраў гэты шлях. Як бачыце, ён няпросты. Вы хочаце іншым шляхам — ідзіце, але без мяне», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

**Сяргей ПРОТАС.**

Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ:

## «Заявы Аляксея Кудрына аб абмежаваннях у Беларусі для расійскіх СМІ нічым не абгрунтаваны»

**Заявы кіраўніка Міністэрства фінансаў Расіі Аляксея Кудрына аб нібыта існуючых у Беларусі абмежаваннях для работы расійскіх СМІ не маюць нічога агульнага з рэальным станам спраў і нічым не абгрунтаваны. Аб гэтым БЕЛТА заявіў міністр інфармацыі Беларусі Алег Праляскоўскі, каментуючы адпаведныя выказванні расійскага міністра фінансаў.**

«Гэтыя заявы не маюць нічога агульнага з рэальным станам спраў і нічым не абгрунтаваны. Больш за тое, мы здзіўлены, што такія папрокі гучаць менавіта з вуснаў міністра фінансаў, які, наколькі мне вядома, не адказвае за работу СМІ. Тым больш некарэктна пераводзіць гэтыя пытанні ў плоскасць эканамічнага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі», — падкрэсліў Алег Праляскоўскі.

Паводле яго слоў, у Беларусі няма ніякіх праблем для работы расійскіх сродкаў масавай інфармацыі. «Усе журналісты, якія жадаюць асвятляць падзеі ў Беларусі, свабодна атрымліваюць акрэдытацыю пры Міністэрстве замежных спраў, і для іх няма ніякіх абмежаванняў. Расійскія журналісты рэгулярна прысутнічаюць на ўсіх грамадска значных мерапрыемствах, у тым ліку з удзелам кіраўніка беларускай дзяржавы», — адзначыў міністр інфармацыі. «Калі спадару Кудрыну вядома аб нейкіх абмежаваннях або ўціску ў Беларусі адносна расійскіх журналістаў, няхай прадставіць канкрэтныя факты, і мы разгледзім гэта пытанне па сутнасці. Аднак пакуль ніякіх афіцыйных прэтэнзій наконт гэтага расійскі бок не выстаўляў».

**ПАСТАНОВА**
**Савета Рэспублікі**
**Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

**Аб прызнанні паўнамоцтваў члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання Патупчыка У. М.**

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Прызнаць паўнамоцтвы члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання Патупчыка Уладзіміра Мікалаевіча, прызначанага Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь 16 чэрвеня 2011 года.

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А. РУБІНАЎ.**

*17 чэрвеня 2011 года, г. Мінск.*
*№ 449-СР4/VI*

**ПАСТАНОВА**
**Савета Рэспублікі**
**Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

**Аб абранні намесніка Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Абраць намеснікам Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Патупчыка Уладзіміра Мікалаевіча.

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А. РУБІНАЎ.**

*17 чэрвеня 2011 года, г. Мінск.*
*№ 451-СР4/VI*

## ПАТУПЧЫК Уладзімір Мікалаевіч


Фота БЕЛТА.

**Нарадзіўся 17 лістапада 1958 года ў горадзе Светлагорску Гомельскай вобласці. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут, Расійскую акадэмію дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі.**

Працаваў машыністам турбіннага абсталявання Мазырскай ЦЭЦ «Гомельэнерга», начальнікам змены Светлагорскай ЦЭЦ «Гомельэнерга», намеснікам начальніка цэнтральнай службы раённага энергетычнага ўпраўлення «Гомельэнерга», начальнікам лабараторыі металаў Светлагорскай ЦЭЦ «Гомельэнерга», інструктарам арганізацыйнага аддзела, загадчыкам прамыслова-транспартнага аддзела, загадчыкам арганізацыйнага аддзела Светлагорскага гаркама КПБ, намеснікам старшыні Светлагорскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, намеснікам старшыні, першым намеснікам старшыні Светлагорскага гарвыканкама, старшынёй камітэта па эканоміцы і рыначных зносінах Гомельскага аблвыканкама, старшынёй Мазырскага гарвыканкама.

З 2001 года — намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама.

У 2004 годзе назначаны памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўным інспектарам па горадзе Мінску.

З мая 2006 года — міністр працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.

З чэрвеня 2009 года — намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 чэрвеня 2011 г. № 252 назначаны членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання. 17 чэрвеня 2011 г. абраны намеснікам Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

# ХАЧУ РАТАВАЦЬ ЛЮДЗЯМ ЖЫЦЦЁ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Цяпер пра Уласы нагадвае толькі камень-помнік і вясковыя могілкі. А за мужнасць падчас эвакуацыі ўласаўскую акушэрку ўзнагародзілі ордэнам «Знак Пашаны». Цяпер, калі з удзячнасцю ўзгадваюць ліквідатараў, такіх, як Марыя Міхайлаўна Кузякіна, павінны называць першымі (напэўна, у Мазырскім медвучылішчы імя былой выпускніцы ў спісе сапраўдных герояў — нашых сучаснікаў).

Працуючы ў радзільным аддзяленні, Кузякіна, без перабольшвання, сваімі рукамі вывела ў свет ці не ўсю дзятву Хойнікаў і раёна. Нават першай сустракала і прымала сваіх унучак. А іх у медсястры ажно пяцёра. Летась на Хойнікшчыне нарадзілася 264 немаўляты. 74 з іх прыйшлі на гэтую грэшную і радыеактыўную зямлю з дапамогаю бабулі-медсястры Марыі. А яна, па-ранейшаму, хвалюецца, ці здаровым з'явіцца ў новы свет маленькі безабаронны чалавек. Хоць пасля чарнобыльскай аварыі прайшло ўжо чвэрць стагоддзя. Хвалюецца яшчэ і таму, што ў Хойніках сёння вялікі недахоп медработнікаў.

— На насельніцтва раёна ў 23 тысячы толькі адзін урач-гінеколаг — пагадзіцеся, не густа. Цяжарным жанчынам, каб праверыцца на апараце УГД, даводзіцца ездзіць у Брагін, Рэчыцу і Гомель, — медсястра-ліквідатар спадзяецца, што праз нашу газету яе трывогу і клопат пачуюць і будучыя медыкі, і адміністрацыя медыцынскіх устаноў, і кіраўнікі Міністэрства аховы здароўя.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.06.2011 г. (для б/н разлікаў) | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ |
|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША ........ 4 994,00 | 1 чэшская крона ........ 291,83 | USD ........ 28,1778 |
| ▲ 1 еўра ........ 7 066,01 | 1 польскі злоты ........ 1776,34 | 10 UAH ........ 35,2663 |
| 1 латвійскі лат ........ 9 964,09 | ▼ 1 расійскі рубель ........ 177,23 | 1000 BYR ........ 56,3669 |
| 1 літоўскі літ ........ 2 047,22 | украінская грыўня ........ 625,42 | EUR ........ 39,8913 |

**ПАСТАНОВА**
**Савета Рэспублікі**
**Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**
**Аб вызваленні Л.Ф. Крупца ад пасады намесніка Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.**

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з часткай другой артыкула 85 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь» і артыкулам 31 Рэгламенту Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь вызваліць Крупца Леаніда Фёдаравіча, згодна з пададзенай ім заявай, ад пасады намесніка Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у сувязі з пераходам на іншую працу.

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А. РУБІНАЎ.**

*17 чэрвеня 2011 года, г. Мінск.*
*№ 450-СР4/VI*

**ПАСТАНОВА**
**Савета Рэспублікі**
**Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**
**Аб абранні членам Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Крупца Л.Ф.**

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абраць членам Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Крупца Леаніда Фёдаравіча.

2. Пастанову Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ад 31 кастрычніка 2008 года № 15-СР4/I «Аб абранні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 266, 4/5785) пасля пазіцыі «Жорава Маргарыта Анатольеўна» дапоўніць пазіцыяй «Крупец Леанід Фёдаравіч».

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А. РУБІНАЎ.**

*17 чэрвеня 2011 года, г. Мінск.*
*№ 453-СР4/VI*

Парламенцкі дзённік

# СЕНАТАРСКАЕ ПАПАЎНЕННЕ

**Уверхняй палаце беларускага парламента абралі нового віцэ-спікера. Месца ў прэзідыуме па левую руку ад кіраўніка Савета Рэспублікі Анатоля Рубінава заняў Уладзімір Патупчык. Напярэдадні ён быў прызначаны сенатарам Указам кіраўніка дзяржавы. У папярэднім складзе ўрада спадар Патупчык быў на пасадзе віцэ-прэм'ера. Занятае ім учора крэсла стала вакантным пасля прызначэння Леаніда Крупца паслом Беларусі ў Бразіліі. Члены Савета Рэспублікі вызвалілі яго ад ранейшай пасады, аднак сенатарам ён па-ранейшаму застаецца. Спадар Крупец уключаны ў склад Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.**

Кандыдатуру свайго новага намесніка старшыня верхняй палаты парламента прапанаваў сам. Ён высока ацаніў яго вопыт, уменне «вырашаць пытанні» і выказаў упэўненасць, што спадар Патупчык будзе вельмі карысным Савету Рэспублікі на гэтай пасадзе. У падтрымку прапанаванай кандыдатуры выказаліся сенатары, якія ведаюць спадара Патупчыка па ранейшай рабоце. Сенатар Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Андрэй Дзюжаў адзначыў яго канструктыўнасць і карэктнасць, манеру дзейнічаць мякка, але настойліва, і знаходзіць правільны падыход да складанага пытання.

Новы віцэ-спікер, у выбары якога 52 сенатары былі аднадушныя, прызнаўся, што ўспрымае выказанае ў яго адрас як аванс, і абяцаў адпрацаваць.

— У Савет Рэспублікі я прыйшоў для таго, каб разам з вамі працаваць на карысць нашай любімай Рэспублікі Беларусь, — звярнуўся ён да новых калег. — Я зраблю ўсё, каб апраўдаць ваш давер і зрабіць свой пасільны ўнёсак в ўдасканаленне беларускага заканадаўства.

Унёсак не змусіў сябе чакаць. На ўчарашняй сесіі сенатарамі было разгледжана амаль два дзясяткі дакументаў. Сур'ёзнае папаўненне заканадаўчай базы. Сярод іх і тыя, што датычаць дзейнасці Мытнага саюза і яго структур. Ратыфікаваны парламентарыямі дакумент уносіць змены ў дзейнасць Камісіі Мытнага саюза. Рашэнні камісіі зараз уводзяцца ў дзеянне толькі праз месяц пасля іх афіцыйнага апублікавання. Здараецца ж так, што сітуацыя не цярпіць. Вось новыя заканадаўчыя рашэнні і дазваляюць прызначаць меншы тэрмін.

Змены закрануць не толькі хуткасць прыняцця рашэнняў, але і метад. У прыватнасці, Камісіі даецца права ствараць каардынацыйныя і кансультацыйныя органы — для разгляду прапаноў і ўзгаднення пазіцый. Каб «на высокім экспертным узроўні», як выказалася старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Ніна МАЗАЙ, разглядаць і прапрацоўваць неабходныя дакументы.

Сенатары таксама зацвердзілі справаздачу аб выкананні бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва за мінулы год. Як расказала ў Савеце Рэспублікі міністр працы і сацыяльнай абароны насельніцтва Марыяна ШЧОТКІНА, даходы фонду склалі 19,7 трлн рублёў. Асноўнай крыніцай іх фарміравання сталі ўзносы на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне. Дзякуючы гэтаму было выдаткавана 18,4 трлн, якія пайшлі ў першую чаргу на пенсіі (80,7 адсотка) і дапамогі (17 адсоткаў). Пераразлік працоўных пенсій, паводле інфармацыі міністэрства, праводзіўся летась тройчы, а сацыяльныя пенсіі павялічваліся нават чатыры разы.

Яшчэ адзін ухвалены сенатарамі дакумент палегчыць, як чакаецца, дзейнасць Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК. Цяпер ён зможа самастойна звяртацца па прававую дапамогу па грамадзянскіх, сямейных і крымінальных справах у кампетэнтныя органы іншых краін, з якімі ёсць адпаведныя міждзяржаўныя дамоўленасці. Дагэтуль адсутнасць магчымасці ўзаемадзейнічаць напрамую зацягвала працэс, а значыць, і паступленне сродкаў у бюджэт. Паводле інфармацыі Камітэта дзяржкантролю, за чатыры месяцы сёлета была разгледжана больш як тысяча спраў і сума «ўратаваных» сродкаў склала пад 40 млрд рублёў.

Верхняя палата парламента таксама прыняла да ведама два дэкрэты кіраўніка дзяржавы. Першы выводзіць з-пад дзеяння выключнага права дзяржавы імпарт высакаякасных алкагольных напояў, якія не складаюць канкурэнцыі айчыннай прадукцыі. Прынятыя заканадаўчыя рашэнні, разлічваюць распрацоўшчыкі, не прывядуць да дэстабілізацыі на рынку і будуць садзейнічаць пашырэнню асартыменту напояў сусветных брэндаў. Пры гэтым імпарт гарэлкі ды брэндзі застаецца ў выключным распараджэнні дзяржавы.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

# ЗА ЭКАЛАГІЧНУЮ ЧЫСЦІНЮ ПРАДУКТАЎ ГАТОВЫ ПЛАЦІЦЬ 70% СПАЖЫЎЦОЎ

## *...але не больш як 10 працэнтаў ад звычайнай цаны*

**ШТО вы ўлічваеце, калі набываеце прадукты ў супермаркеце? Ці гатовы вы плаціць больш за прадукты, экалагічная чысціня якіх пацвярджаецца аўтарытэтнай арганізацыяй? Якія вы ведаеце маркіроўкі і спецыяльныя значкі, якія пацвярджаюць якасць прадуктаў? Гэтыя пытанні былі адрасаваныя ўдзельнікам сацыялагічнага даследавання, якое праводзілася ў рамках партнёрскага праекта «Устойлівае спажыванне для паляпшэння якасці жыцця», які выконваўся беларускімі экалагічнымі арганізацыямі, што ўтвараюць сетку «Зялёнае партнёрства», Беларускім таварыствам абароны спажыўцоў і арганізацыяй з Нідэрландаў Milieukontakt International.**

Апытанне праводзілася ў буйных харчовых крамах пяці гарадоў (Мінска, Брэста, Баранавіч, Гомеля і Магілёва), прычым у два этапы (у лістападзе 2009 года і ў лютым 2011 года). Менавіта ў гэтых гарадах дзейнічалі інфармацыйныя цэнтры па ўстойлівым спажыванні.

— Нашай мэтай было вызначыць, наколькі змяніліся ўяўленні беларускіх спажыўцоў аб устойлівым спажыванні за 15 месяцаў рэалізацыі праекта, — тлумачыць **загадчыца кафедры сацыяльнай камунікацыі факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ, кандыдат сацыялагічных навук Вольга ЦЯРЭШЧАНКА**. — А для таго, каб ахапіць усе сацыяльныя пласты насельніцтва, апытваліся наведнікі магазінаў не толькі ў цэнтры гарадоў, але і ў спальных і прамысловых раёнах. Узрост рэспандэнтаў вагаўся ад 15 да 60 гадоў. Для атрымання больш аб'ектыўнай карціны на большасць пытанняў рэспандэнты давалі адказы ў адвольнай форме без выбару падказак.

Напрыклад, без падказак спажыўцы адказвалі на пытанне «Што вы ўлічваеце пры набыцці прадуктаў у супермаркеце?» Калі ў лістападзе 2009 года цана мела значэнне для 60,8 працэнта рэспандэнтаў, то ў лютым 2011 года гэта лічба зменшылася на 8 працэнтаў. На 12 працэнтаў зменшылася і колькасць спажыўцоў, для якіх не мае значэння якасны склад прадуктаў (у 2009 годзе — 39,7 працэнта).

Затое пакупнікі сталі больш увагі надаваць знешняму выгляду тавару (плюс 6 працэнтаў), смаку і паху (плюс 9 працэнтаў), прывабнасці ўпакоўкі (плюс 6 працэнтаў). Павялічыўся таксама ўплыў на спажыўцоў абвешчаных прадаўцом скідак і рэкламы (плюс 4 працэнты). На гэтым фоне можна адзначыць рост патрабаванняў да адсутнасці ў прадуктах дабавак (плюс 5 працэнтаў), генетычна мадыфікаваных арганізмаў (плюс 7 працэнтаў), а таксама да экалагічнасці ўпакоўкі (плюс 4 працэнты). Але вось пакупнік важнасці пры выбары прадуктаў экалагічнай чысціні практычна не змяніўся — магчыма, з прычыны сваёй нявызначанасці.

Ведаюць аб існаванні маркіровак, якія пацвярджаюць якасць прадуктаў і адпаведна звяртаюць на іх увагу 57,2 працэнта рэспандэнтаў (у 2009 годзе 54,5 працэнта). Аднак гэты паказчык моцна вар'іруецца паміж сацыяльнымі групамі. У прыватнасці, сярод высокаадукаваных рэспандэнтаў ён дасягае 70-75 працэнтаў. Прычым жанчыны часцей за мужчын цікавяцца такімі маркіроўкамі. Колькасць рэспандэнтаў, якія не лічаць патрэбным звяртаць увагу на маркіроўку, не задумваюцца над гэтым і не ведаюць аб іх існаванні, фактычна не зменшылася: у лістападзе 2009 года іх было 45,5 працэнта, а ў лютым 2011 года — 42,8 працэнта.

Падчас другога апытання, канстатуе Вольга Цярэшчанка, узрасла колькасць рэспандэнтаў, якія не толькі ведаюць экамаркіроўкі, але і набываюць пазначаныя імі прадукты. Праўда, даволі часта рэспандэнты адзначалі, што «чыстыя прадукты больш дарагія, а грошай і так не хапае». Не хапае таксама і ведаў для здзяйснення інфармаванага выбару. Працэнт рэспандэнтаў, гатовых плаціць за сертыфікаваныя на экалагічную чысціню прадукты больш грошай, практычна не змяніўся: 71 працэнт падчас першага апытання і 69 працэнтаў — падчас другога. Прычым абсалютная большасць згодна пераплачваць не больш як 10 працэнтаў ад звычайнай цаны (а сярэдні паказчык склаў 20 працэнтаў).

Сярод тых, хто заявіў аб сваёй негатыўнай да такога кроку, людзі са сціплымі даходамі (7,5 працэнта ў першым апытанні і 8,5 працэнта — у другім), спажыўцы, якія не давяраюць маркіроўкам (10,9 і 9,6 працэнта) і не жадаюць пераплачваць за эмблему (8,5 і 11,9 працэнта), што таксама можна разглядаць як форму недаверу, паколькі ў каментарах да свайго адказу некаторыя рэспандэнты спасылаліся на тое, што «ў Беларусі няма чыстых прадуктаў». У той жа час сустракаліся меркаванні, што «усе прадукты павінны адпавядаць нормам экалагічнай чысціні і таму пераплачваць няма за што».

Што тычыцца пазнавальнасці экамаркіровак, то найбольш «раскручанай» маркіроўкай з'яўляецца беларускі знак «Натуральны прадукт» — яе бачылі 84,6 працэнта гарадскога насельніцтва, з іх 68,5 працэнта ведаюць яе значэнне (пытанне задавалася з выкарыстаннем падказак — рэспандэнтам паказвалі картку з выявай маркіроўкі). Увогуле за прайшоўшы пасля першага апытання час веданне насельніцтвам экалагічных маркіровак істотна вырасла (у лістападзе 2009 года знак «Натуральны прадукт» ведалі толькі 52,4 працэнта рэспандэнтаў). Добра пазнаюцца таксама шырока распаўсюджаныя маркіроўкі «Рэцыклінг» (67,6 працэнта) і «Зялёная кропка» (32 працэнты), звязаныя з перапрацоўкай упакоўкі. А замыкае групу пазнавальных маркіровак знак «Энергастар» (Energy Star), які разумеюць большасць з тых, хто яго ведае ў вочы. А вось экамаркіроўкі іншых краін (такія, як «Лісток жыцця», экамаркіроўка ЕС, украінская экамаркіроўка) рэспандэнты пазнаюць намнога радзей і менш чым у палове выпадкаў могуць іх патлумачыць.

**Ці лічыце вы, што ў магазінах, якія вы наведваеце, маецца дастатковы выбар экалагічна чыстых прадуктаў?** Адказы на гэта пытанне прыкметна змяніліся за прайшоўшы перыяд. На 30 працэнтаў зменшылася колькасць спажыўцоў, якія лічаць, што выбару экалагічна чыстых прадуктаў у магазінах няма, аднак яны не далучыліся да тых «аптымістаў», якія лічаць, што такі выбар ёсць (іх колькасць засталася ранейшай — 25 працэнтаў), а далучыліся да тых, хто сумняваецца («мне цяжка адказаць»). На цяжкасці з адказам спаслалася 32 працэнты рэспандэнтаў (раней такіх было ўсяго 2 працэнты).

**Ці ведаеце вы, што такое ўстойлівае спажыванне?** Працэнт рэспандэнтаў, якія далі станоўчы адказ на гэта пытанне, у перыяд паміж апытаннямі ўзрос з 25 да 38 працэнтаў. Тых, хто даў станоўчы адказ, прасілі дадаткова патлумачыць сваё разуменне гэтага тэрміну без падказкі. «Правільнымі» лічыліся адказы, якія звязвалі ўстойлівае спажыванне з адсутнасцю шкоды для здароўя людзей і навакольнага асяроддзя. У лістападзе 2009 года правільныя адказы далі 99 рэспандэнтаў з 2013, ці 4,9 працэнта ад агульнай колькасці. У лютым 2011 года — 243 рэспандэнта з 2004, ці 12,1 працэнта, прычым аднача́сова дзве правільныя адказы (і для здароўя, і для навакольнага асяроддзя) далі толькі 3,5 працэнта рэспандэнтаў. «Аднак па-ранейшаму большасць рэспандэнтаў памылкова лічаць, што яны ведаюць, што такое ўстойлівае спажыванне, маючы на ўвазе стабільнае спажыванне, гэта значыць, спажыванне тых жа прадуктаў, у той жа колькасці і якасці», — падкрэсліве Вольга Цярэшчанка.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Даведка «Звязды»:**

Знак «Натуральны прадукт» — гэта адзіная зарэгістраваная ў Беларусі маркіроўка, якая пацвярджае якасць прадуктаў айчынных вытворцаў. Прадукты з гэтым знакам выраблюцца з натуральнай айчыннай сыравіны жывёльнага, раслiннага і мінеральнага паходжання. Пры іх вытворчасці не прымяняюцца метады геннай інжынерыі, пестыцыды, гармоны і штучныя харчовыя дабаўкі. Маркіроўка носіць добраахвотны характар. Сертыфікат на маркіроўку прадукцыі знакам «Натуральны прадукт» выдае Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь. Часцей за ўсё яго можна пабачыць на малочнай, радзей — на хлебабулачнай і мясной прадукцыі. Падрабязны пералік размешчаны на сайце www.gosstandart.gov.by.

Аднак беларускія «Натуральныя прадукты» пакуль нельга назваць экалагічнымі і арганічнымі прадуктамі, паколькі па міжнародных стандартах такая прадукцыя павінна вырабляцца ва ўмовах арганічнай сельскай гаспадаркі з мінімальным ўздзеяннем на навакольнае асяроддзе.

Рэпартаж

# Грузінка, якая нарадзіла ў беларускім аэрапорце,

## ПРАЕХАЛА ПЕРАД ГЭТЫМ 700 КМ...

**СЕНСАЦЫЙНАЯ навіна ахапіла ўчора ўвесь інтэрнэт: грамадзянка Грузіі Медэя Каландыя ў медпункце аэрапорта «Мінск-2» нарадзіла дзіця. Жанчына збіралася ляцець у Тбілісі разам яшчэ з чатырма дзецьмі, аднак схваткі пачаліся раней...**

**Як сцвярджаюць урачы, жанчына проста «растрэслася» ў дарозе — перад гэтым яна праехала на машыне каля 700 кіламетраў. Свой шлях з Масквы ў Мінск цяжарная жанчына разам са спадарожнікам пераадолела на аўтамабілі. Воды пачалі адыходзіць, калі яна знаходзілася ў аэрапорце: жанчына была на 36-ым тыдні (8-ы месяц цяжарнасці).**

Прыехаўшы ў бальніцу, куды паступіла парадзіха, я даведаўся, што жанчыну ўжо «адведала» каля дваццаці журналістаў. А нехта асабліва знаходлівы нават умудрыўся памяняць у парадзіхі 100 долараў па курсе Нацбанка...

### Маці і дзіця

— Дзіцятка нарадзілася здаровым — дзяўчынка, вага — 2400 кг, — расказалі мне ў радзільным аддзяленні 3-й гарадской клінічнай бальніцы. — Не хвалюйцеся вы так: у жанчыны гэта ўжо пятая цяжарнасць, так што роды нават вы змаглі б прыняць. А ў медпункце аэрапорта — і тым больш, медыкі аказаліся на вышыні.

Аднак рабіць нейкія прагнозы ўрачы пакуль не спяшаюцца: стан здароўя ў парадзіхі здавальняючы — абследаванне паказала, што ў жанчыны адна нырка. А цяжарнасць, як вядома, пры такіх умовах і зусім рэч рызыкоўная. Да таго ж, як канстатуюць урачы, дзіця нарадзілася неданошаным, таму пэўны час таксама патрабуе асаблівай пільнай увагі.

— Жанчына паступіла да нас у 20:20, — узгадвае ўрач Тацццяна Зяноўка, на змену якой і прыйшоўся гэты выпадак. — Роды былі ў 18:26, іх прынялі супрацоўнікі медпункта — медсястра і фельдшар-акушэр. Дзяўчынку назвалі Ніно.

### Жанчыне дапаможа Пасольства Грузіі

— Я хачу заявіць, што здароўе грамадзянкі Грузіі Медэі Каландыя і дзіцяці, якое яна нарадзіла ў аэрапорце, стабільнае, аднак выпісваць іх пакуль не рэкамендуюць, — пракаментаваў сітуацыю «Звяздзе» консул Пасольства Грузіі ў Беларусі Рэваз Сакварэлідзэ. — Пасольства Грузіі будзе аказваць усю неабходную дапамогу: як матэрыяльную, так і маральную і фізічную. Я асабіста буду наведваць жанчыну кожны дзень.

Паводле слоў консула, асаблівую падзяку ён хацеў бы выказаць 3-й бальніцы, якая ўдзяляе вялікую ўвагу жанчыне, а таксама Міністэрству аховы здароўя Беларусі.

Іншыя чацвёра дзяцей жанчыны (дзяўчынкі 15-ці, 12-ці, 9-ці гадоў і трохгадовы хлопчык), як удакладніў консул, ужо даляцелі да Грузіі і адчуваюць сябе нармальна — там іх сустрэла бабуля.

— Жанчына сама дала згоду на тое, каб дзеці адны — без яе — селі ў самалёт і паляцелі ў Тбілісі. Мы звязваліся з бабуляй гэтых дзетак: той эмацыйны шок, які атрымалі дзеці, калі пакінулі цяжарную маці ў аэрапорце, ужо прайшоў.

### Чыё грамадзянства атрымае дзіця?

Як адзначыў пасол Грузіі ў Беларусі, народжаная дзяўчынка беларускага грамадзянства не атрымае. Заканадаўства Грузіі прадпісвае, што дзіця ў падобных выпадках аўтаматычна атрымлівае грамадзянства маці (маці дзяўчынкі — грузінка). У выпадку, калі бацька дзяўчынкі — іншай нацыянальнасці, то пасля сумеснай згоды бацькоў дзяўчынка можа атрымаць грамадзянства бацькі.

Як патлумачылі ўрачы, менавіта ў 3-ю бальніцу Медэя паступіла таму, што не была абследавана (у трэцюю бальніцу паступаюць толькі неабследаваныя жанчыны).

— Жанчыне назначаны курс антыбіётыкаў. У панядзелак яна атрымае кансультацыю ўролага. Аднак бум, падняты журналістамі, неапраўданы, — заключылі ў бальніцы.

Сама жанчына ад каментарыя адмовілася.

**Ілья ЛАПАТО.**

# ДЗЯРЖАВА БУДЗЕ І НАДАЛЕЙ СТРЫМЛІВАЦЬ ПАВЕЛІЧЭННЕ КОШТУ БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ

**ПРА гэта ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» паведаміў начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ. (Пачатак гутаркі ў папярэднім нумары «Звязды»).**

***— Апошнім часам у газету звяртаецца шмат нашых падпісчыкаў, якіх цікавіць тэндэнцыя ў сістэме будаўніцтва жылля, што ўзводзіцца менавіта для асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў. Як могуць змяніцца аб'ёмы будаўніцтва жылля для гэтай катэгорыі насельніцтва пасля стварэння новага алгарытму льготнага жыллёвага крэдытавання?***

— Па лініі будаўніцтва жылля з дзяржаўнай падтрымкай, дзе выкарыстоўваліся льготныя крэдыты, штогод у краіне будуецца прыкладна 3,1 млн кв. м жылля. Такі аб'ём жылля для чаргавікоў будзе абавязкова пабудаваны ў нашай краіне і ў наступным годзе. Сацыяльную накіраванасць гэтага будаўніцтва ніхто не адмяняе. Зменіцца толькі структура і ўзровень самой дзяржаўнай падтрымкі для асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў.

***— У не вельмі простых эканамічных умовах будаўнічай галіне будзе, мабыць, складана вытрымліваць усе запланаваныя на сёлета паказчыкі?***

— Сёлета мы павінны пабудаваць усе запланаваныя на год жыллёвыя аб'екты з улікам больш актыўнага прыцягвання фінансавых сродкаў насельніцтва. Каб людзі панеслі ўласныя грошы ў будаўніцтва, было прынята рашэнне аб мэтанакіраваным стрымліванні росту кошту квадратнага метра жылля. За 5 месяцаў года рост індэкса будаўніча-мантажных работ (БМР), у параўнанні са снежнем 2010 года, склаў 6,4 працэнта. Спадзяёмся, што па выніках першага паўгоддзя рост гэтага індэкса будзе невялікім, бо за чэрвень ён прыплюсуе, магчыма, не больш чым на 1,5—2 працэнты.

***— У другім паўгоддзі стрымліваць цэны будзе складаней?..***

— Перад галіной пастаўлена задача абмяжоўваць рост індэкса БМР прыкладна на ўзроўні першага паўгоддзя. За кошт чаго можна ўтрымаць кошт будаўніцтва? Каб неяк згладзіць павелічэнне коштаў, мы цяпер у некалькі разоў знізілі будаўнічым арганізацыям накладныя выдаткі, «падрэзалі» падрадным арганізацыям іншыя ўнутрызменныя моманты. Увялі абмежаванне рэнтабельнасці па выпуску будаўнічых матэрыялаў, якая сёння павінна быць плюсавай, але і вельмі маленькай. Прынята рашэнне аб змяншэнні тэрмінаў будаўніцтва жыллёвых аб'ектаў на 15—20 працэнтаў, што паменшыць агульнаструктурныя выдаткі будаўнічых арганізацый.

Менавіта за кошт такіх мэтаў неабходна вытрымаць сабекошт будаўніцтва жылля ў межах прапісаных у дагаворах цэн, якія ўжо былі заключаны грамадзянамі з будаўнічымі арганізацыямі. Змяненне цаны можа быць толькі ў межах росту індэкса БМР, а не так, як гэта днямі назіралася ў камерцыйным будаўніцтве. Асобныя вельмі «разумныя» камерсанты павялічылі кошт будаўніцтва квадратнага метра адразу ў 2—3 разы. Тлумачылі яны гэта тым, што цяпер могуць набыць долар на міжбанкаўскім рынку недзе ў 2,5—3 разы даражэй, чым гэта было раней. Але прычым тут долар? Айчынныя будматэрыялы не падаражэлі так моцна, ды і будаўнікі атрымліваюць заробкі не ў замежнай валюце.

Больш за тое, валютны складнік у сабекошце жыллёвага будаўніцтва складае 5—7 працэнтаў па дамах масавых буйнапанельных серый і максімум да 10 працэнтаў па каркасных сучасных будынках. Таму падаражанне замежнай валюты можа прывесці да павелічэння сабекошту будаўніцтва жылля не больш чым на 8—10 працэнтаў, але ніяк не ў 2—3 разы. Сёння ў пэўных будаўнічых структурах новыя астранамічныя цэны на будаўніцтва жылля былі ўжо адменены. Разам з тым заўважу, што тыя вельмі хітрыя дзялкі, якія спрабуюць на сённяшняй сітуацыі зарабіць шалёныя грошы, могуць праз пэўны час і адказаць перад законам за свае дзеянні.

***— Існуе меркаванне, што кошт будаўніцтва жылля будзе павялічвацца ўслед за падаражаннем нафты і газу...***

— Так. Нават у нашых айчынных будматэрыялах існуе ўскосны валютны складнік, які ў першую чаргу датычыцца энергіі. Пры вырабе асобных будаўнічых матэрыялаў выкарыстоўваецца вялікая колькасць энергіі, якая выпрацоўваецца за кошт расійскіх энерганосьбітаў. Расце кошт гэтых энерганосьбітаў, што цягне за сабой падаражанне будматэрыялаў. Аднак, заўважу, што дзяржава і надалей будзе стрымліваць сабекошт будаўніцтва жылля.

***— Калі перайсці на канкрэтыку, то можна нам спадзявацца, што ў другім паўгоддзі кошт будаўніцтва жылля павялічыцца не больш чым на 30 працэнтаў?***

— Цяпер я не магу называць вам дакладныя лічбы, але заўважу, што для сістэмы жыллёвага будаўніцтва з дзяржаўнай падтрымкай пастаўлены нават больш жорсткія абмежавальныя ўмовы па магчымым росце цэн, чым вы назвалі.

***— Апошнія падзеі паказваюць, што ў Мінску будзе будавацца абмежаваная колькасць жылля...***

— Па сталіцы ў год вызначаны аб'ём будаўніцтва ў межах 1 млн 200 тысяч кв. м жылля. Так, тэмпы будаўніцтва жылля ў сталіцы значна меншыя, чым у іншых рэгіёнах Беларусі. Хутка ў Мінску будуць уведзены больш жорсткія ўмовы пастаноўкі на жыллёвы ўлік. Каб стаць у жыллёвую чаргу, неабходна будзе пражыць у сталіцы не менш як 10 гадоў. Забяспечанасць жыллём чаргавіка павінна быць не менш за 15 метраў, а 10 м кв. на чалавека. Дакумент аб гэтым будзе прыняты ў бліжэйшы месяц або два. Разглядаюцца больш жорсткія ўмовы выдзялення жыхарам Мінска льготных крэдытаў пад будаўніцтва жылля. Разам з тым, чаргавікі сталіцы будуць мець спрыяльныя ўмовы для будаўніцтва жылля ў гарадах-спадарожніках. Магчыма, будуць створаны нейкія дадатковыя эканамічныя механізмы, якія паспрыяюць міграцыі бескватэрных жыхароў сталіцы ў гэтыя невялікія гарады.

***— Як, на ваш погляд, будзе развівацца долевае будаўніцтва ў Мінску?***

— У долевым будаўніцтве льготнага крэдытавання без чаргі ўвогуле больш не будзе. Днямі вядомае рашэнне № 101 гарвыканкамам было адменена. У свой час менавіта льготнае крэдытаванне грамадзян ажывіла долевае будаўніцтва галоўнага мегаполіса краіны. Цяпер колькасць кліентаў сістэмы долевага будаўніцтва можа зменшыцца, а ў выніку аб'ём такога камерцыйнага жыллёвага будаўніцтва пачне звужацца. Фінансаванне долевага будаўніцтва павінна ажыццяўляцца выключна за кошт уласных сродкаў грамадзян або з выкарыстаннем крэдытаў, атрыманых на агульных падставах. Калі ёсць у людзей грошы і магчымасць браць камерцыйныя крэдыты — будуйся без чаргі. Гэта, на мой погляд, справядліва.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ШОКАВАЯ ЗАМАРОЗКА. ЦЯПЕР ГЭТА ПА-НАШАМУ?

**СЁЛЕТА Белкаапсаюз укараніў сучасную тэхналогію шокавага ахаладжвання і замарозкі гатовых страў і вырабаў. Такая тэхналогія выкарыстоўваецца грамадскім харчаваннем у краіне ўпершыню, для чаго некаторыя прадпрыемствы закупілі спецыяльнае абсталяванне.**

Замарозка гатовых страў адбываецца ў апараце шокавай замарозкі з далейшай вакуумнай упакоўкай. Працэс адбываецца пры тэмпературы вакол прадукту мінус 40 градусаў, што дазваляе захаваць смак, пах, кансістэнцыю, а таксама харчовую і энергетычную каштоўнасць і яго гігіенічнасць. Пры тэмпературы мінус 10 градусаў прадукт можа захоўвацца да аднаго месяца, пры тэмпературы мінус 18 градусаў тэрмін рэалізацыі можа даходзіць да двух і больш месяцаў (мясныя паўфабрыкаты). Замарожаная прадукцыя ад месца вытворчасці да гандлёвага прадпрыемства дастаўляецца аўтатранспартам з нізкатэмпературным халадзільным агрэгатам. Для аднаўлення замарожанага вырабу да тэмпературы падачы спажыўцу (плюс 75 градусаў) у кавярні трэба мець параканвектамат ці СВЧ-печ.

Як тлумачаць у Белкаапсаюзе, укараненне гэтай тэхналогіі — невыпадковае. У сістэме спажывецкай кааперацыі з 1,8 тысячы агульнадаступных аб'ектаў грамадскага харчавання каля 800 не маюць уласнай кухні.

Зараз у сістэме спажывецкай кааперацыі арганізаваная вытворчасць замарожаных паўфабрыкатаў, у тым ліку кулінарнай прадукцыі, у 12 раённых спажывецкіх таварыствах (Іванаўскім, Маларыцкім, Кобрынскім, Пастаўскім, Глыбоцкім, Дзятлаўскім, Мастоўскім, Рэчыцкім, Старадарожскім, Быхаўскім, Клімавіцкім, Шклоўскім). Да канца года будзе ўстаноўлена такое абсталяванне па шокавай замарозцы яшчэ ў шасці раённых спажывецкіх таварыствах. Набыццё камплекта неабходнага абсталявання абыходзіцца прыкладна ў 35-50 мільёнаў рублёў. Аднак укладзеныя сродкі хутка акупліваюцца: калі раней многія прыдарожныя кавярні маглі прапанаваць толькі піражкі, сасіскі ў цесце, блінчыкі, дык цяпер, дзякуючы ўкараненню новай тэхналогіі замарозкі гатовых страў, гэтыя ж кавярні прапануюць ужо паўнавартаснае меню з першымі і другімі стравамі. У далейшым плануецца ўкараніць тэхналогію ў райцэнтрах на базе ўсіх рэстаранаў спажывецкай кааперацыі, што дазволіць павялічыць аб'ём вытворчасці, узровень заработнай платы работнікаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## На 92 годзе жыцця памёр беларускі пісьменнік Сцяпан Кухараў

**Сцяпан Іванавіч нарадзіўся ў сялянскай сям'і 31 ліпеня 1919 года ў вёсцы Стайкі Краснапольскага раёна. Пэўны час працаваў выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, прайшоў баявы шлях ад Беларусі да Берліна. Працаваў у рэдакцыях газет «Мінская праўда», «Рудзенская праўда», «Настаўніцкая газета», «Чырвоная змена», у часопісе «Маладосць».**

Аўтар зборнікаў нарысаў «Незабыўныя сустрэчы» (1959), «Людзі крылатага ўзросту» (1961), «Ад вашага карэспандэнта» (1966), «Жыццё-легенда» (1971), «Светлая пара» (1978), аповесці «Бацькавічы» (1974), зборнікаў аповесцяў, апавяданняў і нарысаў «Бацькавічы» (1980), «Суніцы для сына» (1986), «Сцішанае поле» (1986). Літаратурныя творы Сцяпана Кухарава прысвечаны пераважна беларускай вёсцы і яе руплівцам.

*Шчыра смуткуем і выказваем спачуванні сям'і і сябрам нашага былога калегі.*

**Звяздоўцы.**


## Извещение о проведении 19.07.2011 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

| Номер предмета торгов | № 1 | № 2 |
|---|---|---|
| Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота | Складское помещение общей площадью 318,6 кв.м, инвентарный номер 500/D-679755 | Складское помещение общей площадью 208,7 кв.м, инвентарный номер 500/D-679756 |
| Местонахождение имущества | г. Минск, ул. Маяковского, д. 176, пом. 102 | г. Минск, ул. Маяковского, д. 176, пом. 103 |
| Балансодержатель имущества | ОАО «Камволь», г. Минск, ул. Маяковского, 176 | |
| Организатор аукциона | УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39 | |
| Начальная цена | 944 072 000 белорусских рублей | 618 417 000 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 94 000 000 белорусских рублей | 61 000 000 белорусских рублей |
| Обременения | Аренда | |

На продаваемое имущество обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней, примененных экономических санкций.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Заявитель, желающий участвовать в торгах по нескольким предметам торгов, вносит задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый предмет торгов. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **19 июля 2011 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 20.06.2011 по 15.07.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: (017) 227 48 36.**



Минский городской центр недвижимости

## Извещение о проведении 19 июля 2011 года открытого аукциона по продаже имущества Белкоопсоюза

| | |
|---|---|
| Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества) | - здание специализированное автомобильного транспорта (гараж) общей площадью 782 кв. м, инвентарный номер 500/С-42213;<br>- здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад готовой продукции) общей площадью 4136,1 кв. м, инвентарный номер 500/С-42208;<br>- здание специализированное растениеводства (теплицы) общей площадью 2839,2 кв. м, инвентарный номер 500/С-45463;<br>- здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака (здание «Ангар») общей площадью 430 кв. м, инвентарный номер 500/С-42210;<br>- здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ общей площадью 73,4 кв. м, инвентарный номер 500/С-45471;<br>- здание специализированное иного назначения (контора строительного участка) общей площадью 77 кв. м, инвентарный номер 500/С-45472;<br>- здание специализированное иного назначения (цех для ремонта ящиков и бочек) общей площадью 475 кв. м, инвентарный номер 500/С-42209;<br>- здание специализированное иного назначения (банно-прачечный комплекс) общей площадью 259 кв. м, инвентарный номер 500/С-42207;<br>- здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад товарный) общей площадью 363,1 кв. м, инвентарный номер 500/С-45474;<br>- здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад пиломатериалов) общей площадью 205,7 кв. м, инвентарный номер 500/С-45460;<br>- здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (цех товаров народного потребления) общей площадью 145,2 кв. м, инвентарный номер 500/С-45459;<br>- здание специализированное иного назначения (весовая) общей площадью 26,1 кв. м, инвентарный номер 500/С-45457;<br>- здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (ангар) общей площадью 397 кв. м, инвентарный номер 500/С-45461;<br>- площадка с асфальтобетонным покрытием и фундаментом (площадь площадки – 2 500 кв. м);<br>- не завершенное строительством здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака (спиртохранилище) общей площадью 146,1 кв. м, инвентарный номер 500/U-54924 |
| Сведения о земельном участке | Имущество, входящее в состав предмета торгов, расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000002005960 |
| Местонахождение продаваемого имущества | г. Минск, пр-т Партизанский, д. 168 |
| Сведения о продавце | ЧУП «Пищевой комбинат Белкоопсоюза», 220075, проспект Партизанский, 168, г. Минск, телефон (017) 345 85 85 |
| Сведения об организаторе аукциона | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017) 227 48 36 |
| Начальная цена предмета торгов без учета НДС | 39 167 095 000 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 1 000 000 000 белорусских рублей |
| Наличие обременений | Аренда, залог |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019, в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости» УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 20 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Аукцион состоится **19 июля 2011 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с **20.06.2011 по 18.07.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 227 48 36, (017) 345 85 85.**

**Сайт в интернете: www.mgcn.by**




# «РУСАЛКІ СМАЖАЦЬ ЯЕШНЮ!»











Унядзелю на Любаншчыне зноў будуць смажыць яешню на вогнішчах і вадзіць карагоды. На этнічных землях Беларусі тыдзень пасля Троіцы называюць Русальным. Рэканструкцыя русальшчыны як абрада дзявяты год запар будзе адбывацца там, дзе ён сапраўды яшчэ зусім нядаўна бытаваў. Нядаўна — гэта не больш за паўстагоддзе. Па меркаваннях спецыялістаў — час невялікі. Але тысячагадовы звычай можа назаўсёды знікнуць, калі памрэ апошняя бабулька, якая яго памятала.

Літаральна па крупінках аднаўляў і працягвае аднаўляць элементы старажытнага абраду фалькларыст і даследчык нематэрыяльнай спадчыны, выпускнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Сяргей Выскварка. Наведвае вёскі, распытвае старэйшых жыхароў, запісвае іх успаміны і песні. Распрацоўвае сцэнарыі праводзення свята ўдзельнікамі вясковых фальклорных калектываў — на іх сёння кладзецца асноўны цяжар аднаўлення найкаштоўнейшага народнага скарбу.

— Русалле праводзілі там, дзе не было Купалля. Звычайна ўвечары, падаіўшы кароў, жанчыны збіраліся на «розыгры», абыходзілі карагодам вёску, выбіралі «русалку», выводзілі яе ў жыта ці да ракі, — тлумачыць абрадавыя сюжэты Сяргей Выскварка. — У жыце рвалі русальчын вянок на кавалкі і ўцякалі ў розныя бакі.

Паводле народнага павер'я, калі не вывесці русалку за вёску, яна будзе шкодзіць жыхарам і жывёле, з-за яе можа палегчы ў полі жыта.

*«Праводзім Русалку да бору,*
*А сама вярнуся дадому.*
*Вам, Русалкі, у вадзе спаць,*
*А нам, маладзенькім,*
*жыта жаць...»*

З гэтай песняй заўтра павядуць «русалінак» у вёсках Загалле і Нежын Любанскага раёна. Правядуць, будуць смажыць яешню і гуляць да раніцы.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

**Ад прадзедаў ...**

# СІТНІЦА

**Нядаўна пасля непрацяглага перапынку Гродзенскі хлебазавод аднавіў выпечку смачнага жытняга хлеба — сітніцы. Для беларусаў, ды і не толькі іх, гэта адзін са звыклых штодзённых прадуктаў, які ніколі не надакучвае і не прыядаецца. Таму і кажуць у народзе, што хлеб — усяму галава.**



Калісьці паэт Маякоўскі, апісваючы цяжкі побыт рабочых на будоўлі Кузнецкага металургічнага камбіната ў Сібіры, апавядаў, як яны марылі: «Здесь дом дадут хороший нам и ситный без пайка».

А яшчэ заходнебеларускі паэт Міхась Васілёк пісаў перад вайной:

*— Век 20-ы, век харошы*
*Эх, каб грошы, тыя грошы —*
*Пану войту дагадзіў бы,*
*Усе падаткі заплаціў бы,*
*Накупляў бы рыбы, мяса*
*Кілю кракаўскай каўбасы,*
*Хлеба сітнага паўторбы,*
*Дый, дальбог, за раз упёр бы.*

Спрадвек вядома ў народзе, што жыта на нашых землях — самая распаўсюджаная і непераборлівая культура. Яна можа расці як на гліністых, так і на пясчаных глебах, стойка пераносіць любое надвор'е. Беларусь, наша Бацькаўшчына, знаходзіцца ў такой кліматычнай зоне, што «мужык-беларус, пан сахі і касы» дзякуючы менавіта жыту ў любы час, пры розных фармацыях мог добра выжываць і ніколі не галадаць, ствараць немалыя сем'і, гадаваць дзяцей і прыстойна жыць.

Помню сваё дзяцінства «за польскім часам» і пасля, да стварэння калгасаў, калі маці, як і ўсе гаспадыні, выпякала свой хлеб. Як мясіла ў дзежцы цеста, як паліла печ і, сфармаваўшы вялікія боханы, на драўлянай лапаце садзіла ў печ. Пры гэтым абавязкова пакідала ў дзяжы кавалак цеста для будучай закваскі. Нейкі час хлеб выпякалі з мукі простага памолу, а пазней, калі млынары асвоілі выраб так званай шатраванай і сеянай мукі, ужо ў 30-х гадах мінулага стагоддзя, пачалі выпякаць сітны хлеб. Як правіла, яго выпякалі багацейшыя, заможныя людзі, і лічылася, што гэта далікатэсны, шляхетны хлеб. Ён і на выгляд быў не зусім белы, але і не шэры. А смак быў спецыфічны, асаблівы: ім можна было, калі з салодкай гарбатай, то і добра пад'есці.

Яшчэ больш запомнілася мне вучоба ў пачатковых класах польскай школы. Тады дзятлаўскія яўрэі ў сваіх пякарнях шмат выпякалі менавіта сітніцы. Настаўнік — паляк Ян Міхаляк — раз у тыдзень прывозіў гэты хлеб, і нам, малым, на перапынку давалі па лусце з кубачкам гарбаты ці кавы. О, як смачна елася!

Ужо пазней, у 1950-х гадах, падчас маёй вучобы ў Мінску ў політэхнічным інстытуце ў крамах зноў з'явілася сітніца пад назвай «Хлеб мінскі», а літоўцы выпякалі хлеб «Паланга».

І яшчэ. Прыгадваецца цікавы эпізод у сярэдзіне 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Саюз палякаў Беларусі ладзіў збор былых жыхароў нашага краю, якія ў пасляваенны час па розных прычынах з'ехалі на сталае жыццё ў Польшчу. Былі цікавыя сустрэчы з роднымі мясцінамі, людзьмі, успаміны пра былое. І вось адзін з арганізатараў гэтага збору, галоўны інжынер інстытута «Гроднаграмадзянпраект» Рышард Кацынель вырашыў прыдумаць нешта асаблівае, каб гэтая падзея надоўга засталася ў памяці. Ужо пры расставанні, калі людзі сядзелі ў аўтобусе, Рышард Браніслававіч уручыў кожнаму па булцы гродзенскай сітніцы. Гэта трэба было бачыць, наколькі былі расчулены ад'язджаючыя, у многіх на вачах паказаліся слёзы. Яны пакідалі Беларусь не толькі з прыемнымі ўспамінамі, але і са смакам роднага хлеба, які жыве ў нашай генетычнай памяці, бо прыйшоў у яе эвалюцыйна разам з нашай культурай жыта.

**Уладзімір ЛОГАШ,**
*жыхар г. Гродна.*

## КАМЕНТАРЫЙ СПЕЦЫЯЛІСТА

Наколькі ж цяперашні сітны хлеб адпавядае ўспамінам Уладзіміра Міхайлавіча пра сваё дзяцінства, традыцыям нашых продкаў?

Вось што паведаміла карэспандэнту «Звязды» намеснік **начальніка вытворча-тэхнічнай лабараторыі РУП «Гроднахлебпрам» Іна СІТНІКАВА,** калі азнаёмілася з лістом нашага чытача:

— Калі ў даўніну малолі ў жорнах, то атрымлівалі буйную муку. А потым прыдумалі млын, сіта, і з'явілася мука дробнага памолу. Менавіта такая мука і называецца сітнай, яна найбольш светлая сярод іншых відаў.

Мы з павагай ставімся да вопыту нашых продкаў. Не пераходзім на спрошчаную схему вытворчасці, калі фактычна замешваюць з вадой гатовыя сумесі і выпякаюць хлеб, а захоўваем традыцыйную тэхналогію хлебапячэння. У гатаванні сітнага хлеба выкарыстоўваем закваску, гэта значыць, у працэсе ўдзельнічаюць жывыя малочна-кіслыя бактэрыі. Гэты працэс даволі працяглы, бо патрабуе пэўнай тэмпературы, часу, адпаведнага саставу пажыўнай сумесі для кругласутачнага падтрымання закваскі.


Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Рэцэптура сітнага хлеба даволі простая. Дрожджы, соль, цукар, без нейкіх хімічных дабавак альбо чагосьці яшчэ. І людзям, вядома, падабаецца (цяпер гандаль штодзённа заказвае каля 10-15 тысяч боханаў), бо гэта наш традыцыйны хлеб. Жытняя мука змяшчае шмат вітамінаў, мінеральных рэчываў — значна больш, чым пшанічная. У ёй шмат харчовых валокнаў, клятчаткі. Гэта натуральнае, правільнае харчаванне. Да таго ж сітны хлеб — адзін з самых танных.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# НАТУРАЛЬНЫ АДПАЧЫНАК





**НЕКРАНУТАЯ прырода на «Рыбацкім падворку»: гаспадар аграэкасядзібы ў Дрыбінскім раёне Уладзімір Чорненькі лічыць сваім брэндам натуральнасць.**
**Сваю прыватную справу былы марак Уладзімір пачынаў у вёсцы Кароўчына ў 2004 годзе, і за тым часам меркаваў зрабіць умовы для няхітрага адпачынку аматараў рыбалкі, дзе галоўнае — не камфорт, а сажалка і рыба ў ёй.**

З цягам часу запатрабаваліся і выгоды, справа пашырылася. Сёння «Рыбацкі падворак» можа прыняць тры дзясяткі гасцей: адны прыязджаюць на шашлыкі на свежым паветры, іншыя — на рыбалку і адпачынак. Сядзіба стаіць у маляўнічым месцы, на невялікім пагорку, побач з сажалкай.

Навінка сезона — экасцежка, працягласць якой больш за два кіламетры. Аздараўленчы шпацыр па сцежцы, якая ідзе ўздоўж лесу, падабаецца турыстам. Тым больш што па дарозе можна збіраць грыбы і маліну.

Частыя госці ў Кароўчыне — замежнікі. Асабліва частыя — масквічы, якія бягуць са свайго загазаванага мегаполіса і жыццёвай мітусні ў спакой і свежае паветра беларускай вёскі. Аднак і немцы, і італьянцы, якія гасцявалі на «Рыбацкім падворку», у адзін голас гавораць, што з'ехаць з асфальту, прайсціся басаногам па траве, палавіць рыбу — вялікае задавальненне, ужо маладаступнае сучаснаму чалавеку ва ўрбанізаваным свеце.

Кошты на адпачынак розныя, ад 25 тысяч рублёў за суткі. Аднак і ўмовы пражывання адрозніваюцца: можна пасяліцца ў звычайным сельскім доме з выгодамі на вуліцы, можна і ў сучасным катэджы. А некаторыя хочуць проста спаць у адрыне, як гэта зрабіла адна маскоўская сям'я: не з эканоміі сродкаў, а з жадання быць бліжэй да прыроды.

Сам Уладзімір Чорненькі даўно зразумеў, што натуральнасць карыстаецца сёння попытам. Напрыклад, на сваёй сядзібе ён свядома не садзіць экзатычныя расліны: маўляў, няхай усё будзе, як у нашай беларускай прыродзе. Мінімум добраўпарадкавання, а болей травы. Усе пабудовы зроблены з прыродных матэрыялаў і з традыцыйнымі для беларускай вёскі ўпрыгажэннямі.

Рыба ў сажалцы — звычайныя карпы, ліні, амуры, карасі. Цяпер разам з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і пры падтрымцы глабальнага экалагічнага фонду пры ААН гаспадар Чорненькі збіраецца разводзіць ракаў. Але асноўны курс застаецца ранейшым — на некранутасць прыроды, што дае чалавеку асаблівае задавальненне і натуральны адпачынак.

**Ілона ІВАНОВА.**

ОАО «Лукомльэнергомонтаж»,
расположенное по адресу: г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8,
тел.: 02133 51273; 02133 38338,

**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ ОАО «Лукомльэнергомонтаж».**

**Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются: ОАО «Лукомльэнергомонтаж»**, 211162, г. Новолукомль Витебская область, Лукомльское шоссе, 8, УНП 300007839.
**Цель приобретения акций, определенная общим собранием акционеров:** для аннулирования и последующего уменьшения уставного фонда в целях сокращения их общество количества.
**Количество приобретаемых акций:** 10 000 штук.
**Цена, по которой приобретаются акции:** 15 000 рублей за 1 акцию.
**Форма, способ оплаты акций и порядок расчетов:** перечисление денежных средств на расчетный счет акционеров-владельцев акций — в свободные сроки, не ранее тридцати дней и не позднее шести месяцев с момента заключения договора купли-продажи.
**Договоры купли-продажи будут заключаться по адресу:** г. Новолукомль, Витебская область, Лукомльское шоссе, 8.
**Даты начала и окончания срока представления предложения акционеров о продаже акций:** с 22 апреля 2011 г. по 30 ноября 2011 г.
**Даты начала и окончания совершения сделок купли-продажи акций:** с 25 июня 2011 г. по 31 декабря 2011 года.

**Объявления, опубликованные в газете «Звязда» № 95 от 25.05.2011 г. и № 100 от 01.06.2011 г. считать недействительными.**

Утерянный страховой полис обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВС № 2817865 СООО «Белкоопстрах» считать недействительным.
УНП 400230227

Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний формы 2РН серии БН № 0665843 считать недействительным.
УНП 101883943

***Уважаемые акционеры ОАО «Мостоотряд № 88»***

**29 июня 2011 года СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**ОАО «МОСТООТРЯД № 88».**

Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, д. 16, третий этаж, актовый зал.

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**
1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Мостоотряд № 88».
2. Об утверждении изменений в Устав ОАО «Мостоотряд № 88».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по указанному выше адресу в рабочие дни с 20 июня по 28 июня 2011 г. с 13 до 17 часов у председателя наблюдательного совета, а в день собрания — в помещении, где оно будет проводиться — в актовом зале в здании управления на третьем этаже.

Регистрация участников собрания **с 16.00 до 16.25** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания — 29 июня 2011 года в 16.30.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 20 июня 2011 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
**акционеру Общества — паспорт,**
**представителю акционера — паспорт и доверенность.**

УНП 100299744 ***Наблюдательный совет.***

**Калинковичский районный исполнительный комитет (Гомельская область)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже права заключения договора аренды земельного участка сроком на 99 лет юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям для строительства и обслуживания торгово-общественного центра по адресу: Гомельская область, г. Калинковичи, ул. 50 лет Октября, 20 Б.**

Площадь участка 1,2579 га, кадастровый номер 322350100002003173. Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка составляет 610 582 710 белорусских рублей. Ограничений в использовании нет. К земельному участку подведены инженерные коммуникации (газ, вода, канализация, электроэнергия). Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, в сумме 1 534 952 белорусских рубля и затраты на объявления в СМИ. Условие проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется на счет Калинковичского райисполкома № 3604419002150, ЦБУ № 313 филиала 317 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Калинковичи, код 678, УНН 400061401. Оплата за объект аукциона должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона. После оплаты, но не позднее 2 рабочих дней, необходимо заключить договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Возможность ознакомиться с земельными участками предоставляется продавцом в срок **до 15 июля 2011 года.**

**Аукцион состоится 21.07.2011 года в 10.30 по адресу: Гомельская область, г. Калинковичи, пл. Ленина, 1 (райисполком).**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения до **17.30 15 июля 2011 года** по адресу: г. Калинковичи, ул. Князева, 4, кабинет 218 (землеустроительная служба Калинковичского районного исполнительного комитета).

**Контактные телефоны: 8 (02345) 3 38 55, 3 26 00.**

Афіцыйна

# 42 ДНІ АДПАЧЫНКУ НЕ ДЛЯ ЎСІХ ВЫХАВАЛЬНІКАЎ...

## ...а для тых, хто пайшоў у водпуск не раней 4 чэрвеня

**Як паведамлялі раней «Звязда», пастановай Савета Міністраў ад 31 мая 2011 года № 679 працягласць працоўнага водпуску ў педагагічных работнікаў дашкольных устаноў была павялічана з 30 да 42 дзён. Аднак на месцах узніклі розначытанні наконт таго, ці ўсім педагагічным работнікам належаць 42 дні адпачынку? Таму кіраўніцтва Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі звярнулася ў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь з просьбай даць тлумачэнні ў пытанні вызначэння працягласці працоўных адпачынкаў работнікам дашкольных устаноў гэтым летам.**

Як паведаміў журналісту «Звязды» намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман Дапіра, днямі яны атрымалі з Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ліст «Аб прадастаўленні працоўных водпускаў педагагічным работнікам устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі» наступнага зместу»:

«...Пастанова № 679 апублікавана ў газеце «Рэспубліка» ад 3 чэрвеня 2011 года № 102 і ўступіла ў сілу 4 чэрвеня 2011 года.

У мэтах аднастайнага прымянення пастановы № 679 Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь тлумачыць наступнае:

Артыкулам 9 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь вызначана дзеянне заканадаўства аб працы ў часе. Так, згодна з названым артыкулам заканадаўства аб працы не мае зваротнай сілы і прымяняецца да адносін, якія ўзніклі пасля ўступлення яго ў сілу, калі іншае не прадугледжана гэтым заканадаўствам.

Па адносінах, якія ўзніклі ў сілу актаў заканадаўства аб працы, яны прымяняюцца да правоў і абавязкаў, што ўзніклі пасля ўступлення іх у сілу.

Такім чынам, калі працоўныя адносіны паміж наймальнікам і работнікам узніклі да ўступлення ў сілу пастановы № 679 (да 4 чэрвеня), асноўны працоўны адпачынак прадастаўляецца педагагічным работнікам працягласцю 42 каляндарныя дні з 4 чэрвеня 2011 года.

На падставе выкладзенага пры прадастаўленні працоўных водпускаў указанай катэгорыі педагагічных работнікаў за бягучы рабочы год іх працягласць трэба вылічваць у залежнасці ад даты прадастаўлення працоўнага водпуску (даты пачатку водпуску):

калі дата пачатку працоўнага водпуску прыпала на дату да 4 чэрвеня 2011 года, яго працягласць вылічваецца ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў ад 24 студзеня 2008 года № 100 з дапаўненнямі ад 8 жніўня 2008 года (30 каляндарных дзён);

калі дата пачатку працоўнага водпуску прыпадае на дату, пачынаючы з 4 чэрвеня 2011 года, яго працягласць вылічваецца ў адпаведнасці з Пастановай № 679 (42 каляндарныя дні);

пры раздзяленні працоўнага водпуску на часткі яго працягласць вылічваецца ў адпаведнасці з працягласцю, вызначанай на дату пачатку першай часткі адпачынку.

Пры прадастаўленні педагагічным работнікам нявыкарыстаных працоўных водпускаў за мінулыя рабочыя гады працягласць вызначаецца у аналагічным парадку».

**Такім чынам, як бачна, не пашанцавала тым педагогам, чый працоўны адпачынак «стартаваў» да 4 чэрвеня, гэта значыць, да ўступлення ў сілу Пастановы ўрада.**

Раман Дапіра дадаў, што працягласць працоўнага адпачынку павялічылася ў загадчыкаў устаноў адукацыі, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі, намеснікаў загадчыкаў па асноўнай дзейнасці, выхавальнікаў-метадыстаў, выхавальнікаў, музычных кіраўнікоў і кіраўнікоў фізічнага выхавання.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Калинковичский районный исполнительный комитет (Гомельская область)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже права заключения договора аренды земельного участка сроком на 10 лет юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям для установки торгового киоска по адресу: Гомельская область, Калинковичский район, агрогородок Домановичи, ул. Советская в районе здания церкви.**

Площадь участка 0,0025 га, кадастровый номер 322381401601000104. Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка составляет 10145 белорусских рублей. Ограничений в использовании нет. К земельному участку подведены инженерные коммуникации (вода, канализация, электроэнергия). Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона в сумме 652 758 белорусских рублей и затраты на объявления в СМИ. Условие проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

Задаток в размере 15 % от начальной цены перечисляется на счет Калинковичского райисполкома № 3604419002150, ЦБУ № 313 филиала 317 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Калинковичи, код 678, УНН 400061401. Оплата за объект аукциона должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона. После оплаты, но не позднее 2 рабочих дней, необходимо заключить договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Возможность ознакомиться с земельными участками предоставляется продавцом в срок **до 15 июля 2011 года.**

**Аукцион состоится 21.07.2011 года в 10.00 по адресу: Гомельская область, г. Калинковичи, пл. Ленина, 1 (райисполком).**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения до **17.30 15 июля 2011 года** по адресу: г. Калинковичи, ул. Князева, 4, кабинет 218 (землеустроительная служба Калинковичского районного исполнительного комитета).

**Контактные телефоны: 8 (02345) 3 38 55, 3 26 00.**

**Мирский поселковый исполнительный комитет (Кореличский район, Гродненская область)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**Лот 1** — На право заключения договора аренды земельного участка площадью 3,0016 га на 50 лет для строительства и обслуживания гостиничного комплекса в г.п. Мир, ул. Фестивальная, У-1. Кадастровый номер 423355100001001023, начальная цена — 424 142 972 белорусских рубля. Ограничение в использовании земель: охранная зона линий электропередачи площадью 0,7816 га. Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона в сумме 1 052 471 белорусский рубль, и затраты на объявления в СМИ.

**Лот 2** — На право продажи в частную собственность земельного участка площадью 0,2203 га гражданам РБ для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Криничное, У-5. Кадастровый номер 423375703601000051, начальная цена — 986 988 белорусских рублей. Ограничение в использовании земель: весь участок находится в водоохранной зоне водных объектов. Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона в сумме 1 402 275 белорусских рублей, и затраты на объявления в СМИ.

**Лот 3** — На право продажи в частную собственность земельного участка площадью 0,2215 га гражданам РБ для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Криничное, У-6. Кадастровый номер 423375703601000050, начальная цена — 992 364 белорусских рубля. Ограничение в использовании земель: весь участок находится в водоохранной зоне водных объектов. Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона в сумме 1 402 275 белорусских рублей, и затраты на объявления в СМИ.

**Лот 4** — На право продажи в частную собственность земельного участка площадью 0,2204 га гражданам РБ для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Криничное, У-7. Кадастровый номер 423375703601000052, начальная цена — 987 436 белорусских рублей. Ограничение в использовании земель: весь участок находится в водоохранной зоне водных объектов. Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона в сумме 1 402 275 белорусских рублей, и затраты на объявления в СМИ.

**Лот 5** — На право продажи в частную собственность земельного участка площадью 0,0898 га гражданам РБ для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г.п. Мир, пер. Кирова, 2 «А». Кадастровый номер 423355700001000734, начальная цена — 22 530 030 белорусских рублей. Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона в сумме 84 000 белорусских рублей, и затраты на объявления в СМИ.

**Лот 6** — На право продажи в частную собственность земельного участка площадью 0,0900 га гражданам РБ для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г.п. Мир, пер. Кирова 2 «Б». Кадастровый номер 423355700001000688, начальная цена — 22 580 210 белорусских рублей. Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона в сумме 84 000 белорусских рублей, и затраты на объявления в СМИ.

Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется на р/с 3600518070258 в ЦБУ № 411 г.п. Кореличи, филиала № 413 г. Лида, ОАО «АСБ Беларусбанк», код 696, УНП 500008202, код платежа 4901. Оплата за объект аукциона должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 22.07.2011 года в 15.00 по адресу: Кореличский район, Гродненская область, г.п. Мир, ул. Первомайская, д. 2 (поссовет).**

**Заявление на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения до 17.30 15 июля 2011 года по адресу: г.п. Мир, ул. Первомайская, д. 2 (поссовет).**

**Контактные телефоны: 8 (01596) 23 1 93, 23 3 75, 23 1 35.**

## ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

### НЯДЗЕЛЯ, 19 ЧЭРВЕНЯ

Дзень спрыяльны для стабілізацыі адносін, захавання старых сувязяў, наймання важнага супрацоўніка, памочнікаў, куплі свойскай жывёлы, для кахання і зачацця дзіцяці, наваселля (але не пераезду!).

### ПАНЯДЗЕЛАК, 20 ЧЭРВЕНЯ

Спрыяе гарманічнаму, спакойнаму вядзенню спраў і мірным, ураўнаважаным зносінам, пазітыўным зменам, паляпшэнню якасці жыцця. Падыходзіць для будаўніцтва, пачатку паездкі.

### АЎТОРАК, 21 ЧЭРВЕНЯ

Новыя рамантычныя знаёмствы абяцаюць доўгі, устойлівы працяг. Падыходзіць для адкрыцця бізнэсу, пачатку будаўніцтва, медыцынскіх працэдур, пачатку навучання і ўсяго таго, што задумваецца быць стабільным.

### СЕРАДА, 22 ЧЭРВЕНЯ

Неспрыяльны для пераезду ў новы дом, вандраванняў. Не наклікайце на сябе праблемы з законам, уладамі, начальствам і супрацоўнікамі, не ўвязвайцеся ў сваркі, пазбягайце агрэсіі і разбурэння сувязяў.

### ЧАЦВЕР, 23 ЧЭРВЕНЯ

Неспрыяльны для пачатку судовага разгляду, любой дзяльбы, размеркавання або завяшчання, праявы агрэсіі, празмернай актыўнасці або, наадварот, поўнай бяздзейнасці — ва ўсім важная ўраўнаважанасць і баланс.

### ПЯТНІЦА, 24 ЧЭРВЕНЯ

Спрыяльны для вяселля, пачатку вандровак і закладкі падмурка, для новых пачынанняў і ачышчэння абмываннем. Не пакідайце маленькіх дзяцей без нагляду на вуліцы.

### СУБОТА, 25 ЧЭРВЕНЯ

Спрыяльны для прыборкі. Гэта дзень, калі дасягае піка ваша фізічная энергія. У такі дзень добра займацца справамі, якія патрабуюць канцэнтрацыі і намаганняў. Не гуляйце па вуліцах дапазна і старайцеся не рызыкаваць.

# Хутка год, як жыхары сталічнай новабудоўлі не могуць заехаць у свае кватэры

**З-за будаўнічых праблем больш за 300 чалавек, уключаючы дзяцей, жывуць амаль у спартанскіх умовах, а яшчэ 200 не могуць засяліцца.**

На сённяшні дзень прыгожы дом на вуліцы Судмаліса, 22а Мінска стаіць без газу. Хутка будзе год, як здадзены дом, а жыхары, што засяліліся, працягваюць гатаваць ежу на электрычных плітках.

Валянціна Ганусевіч пераехала сюды адной з першых. У сакавіку. Калі падключылі электрычнасць.

— Вы ўяўляеце, дом, які па першапачатковай дамове павінен быў быць здадзены 30 чэрвеня мінулага года, сёлета ў сакавіку быў без электрычнасці і газу? — расказвае жанчына.

Пры гэтым жыхары вымушаны былі аформіць дзяржаўную рэгістрацыю права ўласнасці на кватэру (бо тыя, хто браў крэдыты, абавязаны на працягу пайгода пасля даты ўвода ў эксплуатацыю — сёлета да 30 сакавіка — перадаць у банк пацвярджэнне аб дзяржаўнай рэгістрацыі права ўласнасці на кватэру).

Па словах жыльцоў, забудоўшчык (упраўленне капітальнага будаўніцтва (УКБ) адміністрацыі Ленінскага раёна Мінска) раздаў дольшчыкам даведкі на афармленне права ўласнасці і ключы, не перадаючы кватэры па акце прыёмкі-перадачы, як патрабуе закон.

Разам з гэтым, УКБ не паклапацілася пра тое, каб у гэтых кватэрах было газазабеспячэнне.

— Пасля рэгістрацыі мы вымушаны былі пераехаць з інтэрната, дзе жылі раней, бо там чарга вялікая. Таму і пераехалі ў кватэру без газу. І так ледзь дапрасіліся пажыцьпакуль электрычнасць правядуць.

Аналагічная сітуацыя і ў Івана Ісаенкі, які быў таксама вымушаны пераехаць са свайго інтэрната.

А Наталля Тананка, напрыклад, пераехаць пакуль у кватэру не можа: рамонт зацягваецца з-за таго ж падключэння газу.

— Рамонт з-за гэтага газу мы дарабіць не можам і засяліцца нармальна таксама, бо не ўяўляем, як з трохгадовым дзіцем штодня пешшу падымацца на 9 паверх. Ліфты ж яшчэ не гатовы да эксплуатацыі, бо не прайшлі прыёмку ў Прамнаглядзе, — расказвае Наталля. — І вось мне даводзіцца з Кастрычніцкага раёна вазіць дзяцей сюды ў сад і школу (бо мы тут зарэгістраваны).

Жыхары, якія могуць чакаць, у дом не пераязджаюць. Як, напрыклад, зрабіла Вольга Радзько. Яна кажа, што пакуль дом не будзе здадзены па ўсіх правілах, яна нічога не будзе падпісваць і пераязджаць. Але ў яе ёсць дзе жыць гэты час...

### Газу няма з-за незацэментаваных гільз і непафарбаваных труб

Зараз да выдаткаў жыльцоў дома, што пераехалі ў свае ўласныя кватэры, на якія афармілі звычайныя альбо льготныя крэдыты, дадалася вялікая графа — электраэнергія.

— Электраэнергія тут не па льготным тарыфе, таму што ёсць газавая пліта, — кажа Аляксандр Сузін.— Таму плацім мы поўнасцю.

Пры гэтым пытанне з газам ніяк не зрушыцца з мёртвай кропкі.

— У мяне ёсць адказ Службы эксплуатацыі унутрыдамавога газавага абсталявання Мінгаза, — расказвае Вольга Радзько. — У іх сказана, што газ немагчыма пусціць з-за будаўнічых дэфектаў, якія дагэтуль не выпраўлены. А гэта незацэментаваная гільза ў столі ці падлозе, афарбоўка труб з боку сцяны і г.д. Таму арганізацыя просіць у самыя кароткія тэрміны прыняць меры. Гэта было ў сакавіку. Аднак, як вы бачыце, і зараз газу няма. Ды што тут казаць, калі прадстаўнікі ўпраўлення капітальнага будаўніцтва адміністрацыі Ленінскага раёна ніводнага разу не былі на абследаванні (што пазначана ў дэфектных актах).

— Апошні раз, калі я пісала ліст ва ўпраўленне капітальнага будаўніцтва з пытаннем, чаму не падключаны газ, мне адказалі, што патрэбна заключыць абаненцкія дамовы, — кажа Наталля Тананка. — Гэта пры тым, што Мінгаз быў адной з першых арганізацый, з кім мы падпісалі дамову на абслугоўванне. Некаторыя і за запуск газу ўжо заплацілі... А ўвогуле прычым тут я, напрыклад, да таго, што ў кагосьці там не заключана дамова? Няхай іх кватэры і не падключаюць.

### «Дзе вы бачылі будаўнікоў, якія выконваюць дамоўныя абавязкі?»

Акрамя газу, дарэчы, у доме вельмі шмат недапрацовак: не працуе ліфт, адсутнічае добраўпарадкаванне прыдамавой тэрыторыі, няма казырка над пад'ездамі. Пры гэтым дом рэальна не абслугоўваецца ЖЭСам.

Па словах жыльцоў дома, на працягу ўсяго будаўніцтва з упраўленнем былі праблемы.

— Дом першапачаткова па дамове павінен быў быць здадзены 30 чэрвеня 2010 года. Ну, а пасля раз працягнулі тэрмін, другі раз працягнулі тэрмін, трэці раз... — апавядае Наталля Тананка. — І ў выніку здалі 30 верасня 2010 года. Прычым пра працягненне тэрміну ніхто нас не папярэджваў. Ніякія дадатковыя пагадненні нам ніхто не рассылаў. Усё неяк так распаўсюджвалася па форуме ў інтэрнэце, і праз яго мы даведваліся. Прычым плацілі мы ўсё ў тэрмін і г.д.

У маі 2010 забудоўшчык паведаміў, што «забыўся» уключыць у дамову кошт лоджый. Людзі заплацілі дадаткова каля 10% ад агульнага кошту. А потым, у кастрычніку, «успомніў», што ў кошт не ўключаны пралёты, лесвічных маршаў — усяго 14 пазіцый. І зноў кошт будаўніцтва аўтаматычна ўзрастаў на 15-20 %. Тады жыхары падалі ў суд. І выйгралі справу.

— Праўда, у судзе нам сказалі: «Дзе вы бачылі будаўнікоў, якія выконваюць дамоўныя абавязкі?» А пасля суддзя дадаў, што, маўляў, калі мы перасаджаем усіх будаўнікоў, то хто ж будаваць будзе? — расказвае Вольга Турко. — Мы былі ў шоку.

Мала таго, да сённяшняга дня акты перадачы кватэр ад забудоўшчыка да дольшчыкаў не падпісаны.

Па словах жыхароў, УКБ абышло гэтую працэдуру, бо ўсе недахопы, што запісаны ў акце, павінны былі б выпраўлены не пазней чым праз месяц пасля падпісання акта.

— У актах мы б напісалі пра ліфты, якія не працуюць, пра адсутнасць газазабеспячэння і іншыя недахопы, — кажуць жыльцы. — Ужо пасля ўводу дома ў эксплуатацыю, пачынаючы з лістапада 2010 года, дольшчыкі запісвалі заўвагі будаўнікам у дэфектных актах. Кожны акт падпісвала Будаўнічае ўпраўленне № 2 Мінска (яно не з'яўляецца бокам дамовы з дольшчыкам) з аднаго боку і дольшчык — з другога.




Як высветлілася, вось гэтыя «паперкі», не прадугледжаны заканадаўствам, УКБ называе актамі прыёмкі-перадачы — маўляў, яны і ёсць дадаткі да дамовы.

### «Прыходзіш на прыём да дырэктара ўпраўлення, а ён маўчыць...»

Неадназначова жыхары звярталіся непасрэдна да дырэктара ўпраўлення, у адміністрацыю Ленінскага раёна, у Мінскі гарадскі выканкам, але... Таму што ў рэшце рэшт іх адпраўлялі да дырэктара ўпраўлення.

— Мы ўжо год ходзім да Казакоўскага, дырэктара ўпраўлення капітальнага будаўніцтва, якое пабудавала наш дом, — кажуць жыльцы. — Прыходзіш да яго на прыём, а ён маўчыць. Вось проста маўчыць. Бывае, што кажа: «Добра, я вашы пытанні запісаў. Прыходзьце заўтра». Прыходзіш заўтра, ён кажа паслязаўтра і г.д. Пры гэтым у першы наш прыход шмат чаго новага для сябе адкрылі. Запісвалі ўсё на паперку, пасля выклікалі дырэктара УКБ. Аднак выніку гэта не дало...

— Калі сёння запытацца ў спадара Казакоўскага, чаму да гэтага часу няма газу, не працуюць ліфты і іншае, упэўнена, што ён адкажа, што у нашым доме ўсё добра, усё працуе, а тое, што няма газу ці не было прыёмкі ліфтаў, — гэта нашыя фантазіі, — разважае Вольга Турко.

— Мы лічым, што дом прыняты незаконна, — кажуць жыхары. — Таму што не здадзены ўсе сеткі. Па ўмовах дамовы, менавіта УКБ павінна нам здаць дом з усімі камунікацыямі. І камісія, якая прыняла дом, павінна была гэта ўсё заўважыць. Ад нас патрабавалася толькі прыехаць і засяліцца без усялякіх затрымак. Вось і атрымліваецца, што дом здадзены дзеля галачкі. Каб адрапартаваць, што паспелі здаць у 2010-м, атрымалася, што падмануты органы дзяржаўнай статыстыкі...

— Людзі вымушаны былі аформіць уласнасць, хоць дом і недабудаваны. Выходзіць, мы цяпер уласнікі — і ўсе праблемы толькі нашыя? Мы ж пасля звярталіся на УКБ Ленінскага раёна як на дзяржаўнае прадпрыемства. Думалі, тут будзе чэсна, адкрыта і ўсё для жыльцоў, — расстройваюцца жыхары. — А вось бачыце, якія праблемы... Паўсюль нас адпіхваюць. Дапамажыце нам. Мы ўжо звярнуліся да грамадскасці, таму што нас не чуюць. Мы не ведаем, што рабіць, у якія званы званіць. Хадзіць да кіраўніцтва — толькі нервы вымотваць. Надакучыла... Хочам газу і ўсіх выгод за свае грошы.

**Настасся ЗАНЬКО.**



АКТ
приемки квартир № ___ объекта: «Многоквартирного жилого дома на месте сносимой производственной базы по ул. Судмалиса в г. Минске»
«23» [illegible] 2010г. г. Минск
СУ – 2 ОАО «Стройтрест №7», в лице представителя [illegible]
и владельца квартиры ___
(фамилия, имя, отчество, адрес, телефон)
составили настоящий акт в том, что при приемке квартиры № ___ замечаний по составу и качеству выполненных работ не выявлено (в случае, если имеются дефекты — перечислить) [illegible]



Приложение 3

Акт приемки-передачи объекта долевого строительства

г. Минск "__" ______ 2011 г.

, проживающая по адресу: г. Минск, ул. , паспорт , выдан , личный номер ,
именуемый в дальнейшем дольщик, с одной стороны, и КУП «УКС администрации Ленинского района г. Минска с другой стороны зарегистрированный в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей "26" ноября 2004г. № 190583130 расположенный по адресу: г. Минск, ул.Маяковского,24, именуемый в дальнейшем застройщик, в лице директора Казаковского Леонида Васильевича, действующего на основании Устава, с другой стороны, составили настоящий акт о том, что в жилом доме по адресу: ул. Судмалиса22а, введенном в эксплуатацию сентября 2010 г.:

1. Застройщик передал дольщику объект долевого строительства, расположенный на , состоящий из комнат общей площадью кв. метров, кв. № стоимостью ( миллионов тысяч ) рублей без отделки.

2. Застройщик передал дольщику полный комплект ключей, обеспечивающих доступ на объект. Застройщик гарантирует, что других ключей к входным дверям в переданные дольщику помещения ни у самого застройщика, ни у известных ему третьих лиц не имеется.

3. Дольщик принял:
объект долевого строительства и переданный комплект ключей;
технические паспорта на приборы учета воды № ___;
технический паспорт на прибор учета расхода газа № ___;

Замечания дольщика по состоянию объекта долевого строительства при его приемке-передаче указываются в приложении к акту приемки-передачи объекта долевого строительства и должны быть устранены в месячный срок после подписания настоящего акта.

Застройщик ___ Дольщик ___
(подпись) (подпись)
М.П.

**Акт, які падпісалі жыльцы дома.** ➤

**Акт, згодна з якім павінна ісці прыёмка-перадача дома.** ➤

### АД АЎТАРА:

*Размова са спадаром Казакоўскім была 19 мая. Якраз праз два дні пасля размовы з дольшчыкамі. Пасля абяцанняў падключыць газ я вырашыла пачакаць вынікаў. Прачакаўшы амаль месяц, ізноў звязалася з жыхарамі дома.*

*— Газу як не было, так і няма, — адказалі мне яны.*

*Як аказалася, сітуацыя з домам засталася ранейшай. Да сённяшняга дня акты перадачы кватэр ад забудоўшчыка да дольшчыкаў не падпісаны.*

*Па каментарый «Звязда» звярнулася ў адміністрацыю Ленінскага раёна сталіцы. Намеснік адміністрацыі Дзмітрый Табакін перанакіраваў мяне да* ***дырэктара ўпраўлення капітальнага будаўніцтва Ленінскага раёна Леаніда КАЗАКОЎСКАГА****, які пагадзіўся адказаць на пытанні.*

**— Калі будзе газ у кватэрах дома па вул. Судмаліса, 22а?**

— Газ будзе праз два тыдні. Мы над гэтым працуем. Ну, так, цяпер сапраўды, газ яшчэ не пушчаны. На гэта ёсць наступныя прычыны: 15 сем'яў яшчэ не прайшлі інструктаж па газе (пакуль усе інструктаж не пройдуць, газ не дадуць). І ў 3-х кватэрах жыльцы пераабсталявалі газавую сістэму.

**— Значыць з-за гэтага ўвесь дом не можа падключыць?**

— Мы праводзілі нараду ў першага намесніка кіраўніка адміністрацыі з Мінгазам... Таму што там яшчэ шэраг розных пытанняў быў у Мінгаза: па лічыльніках і г.д. І высвятлілі, каб не пакутавалі ўсе з-за гэтых трох кватэр. Таму мы газ у іх абрэжам, каб пусціць астатнім. І па інструктажы мы з Мінгазам яшчэ канчаткова не вызначаемся. Мы дамовіліся, каб пусціць без інструктажу, але, разам з тым, працуем з жыхарамі, што засталіся, каб яны праходзілі інструктаж. Таму што ўсе члены сям'і павінны прайсці інструктаж, у Мінгазе. Навучанне і інструктаж па правілах карыстання.

**— Мне сказалі жыхары, што ў доме не працуюць ліфты таксама з-за недапрацовак у будаўніцтве...**

— Ліфты прынятыя.

**— Але я на свае вочы бачыла, што ліфты не працуюць.**

— Неяк не задавалі такога пытання. Яны ў працоўным стане, усё як паложана.

**— Але яны не працуюць.**

— Можа, іх проста не ўключалі яшчэ... Дом перададзены на абслугоўванне ЖРЭА.

**— Ужо перададзены дакладна?**

— З 1 красавіка перададзены на абслугоўванне...

**— Мне сказалі, што ЖРЭА не можа абслугоўваць дом з-за будаўнічых дэфектаў. Літаральна нядаўна ў доме была аварыйная сітуацыя і аварыйка не прыехала, таму што дом не абслугоўваецца ЖЭСам.**

— Дом належыць таварыству ўласнікаў «Судмаліса—2008». Гэта ўласнік. Гэта іх агульная маёмасць. Яны заключылі дамову са ЖРЭА, і гэта іх дамоўныя ўзаемаадносіны. Калі нейкія ёсць пытанні будаўнічыя на працягу двух гадоў (гарантыйны тэрмін), то будаўнікі іх выпраўляюць.

**— Фактычна дом гатовы да эксплуатацыі, так?**

— Большасць кватэр заселены. Зараз ёсць пытанні і нязручнасці. Многія электраплiткамі карыстаюцца, пакуль газу няма.

**— Жыхары сцвярджаюць, што кватэры не перададзены па акце прыёмкі-перадачы. А вы кажаце, што дом здадзены. Дзіўна неяк. Як вы гэта пракаментуеце?**

— Я ж вам сказаў, што дом здадзены. Яны ў БРТІ зарэгістравалі кватэры. А да гэтага ўвесь пакет дакументаў атрымалі. Як бы яны тады ў БРТІ зарэгістравалі дом? А напісаць і сказаць што заўгодна можна. Акрамя газу, з красавіка месяца ніякіх пытанняў да нас не паступала.

**— Аднак мне яны кажуць, што яшчэ вельмі шмат заўваг засталося.**

— Дык а навошта яны тады даведкі падпісвалі, калі ў іх заўвагі засталіся? Яны прадстаўляюць афіцыйную даведку, што прэтэнзій не маюць. Мы ж улік вядзём. Штотыднёва даём справаздачу кіраўніку адміністрацыі пра ход выпраўлення недахопаў.

**— Жыльцы кажуць, што неабходна перарабіць разводку газавых труб першага пад'езда з-за будаўнічых заўваг.**

— Там былі нязначныя заўвагі па падфарбоўцы труб. Усе будаўнічыя заўвагі выпраўлены.

**— А вы самі былі ў гэтым доме?**

— Часта так не бываю. Штотыднёва мы там бывалі разам з будаўнікамі. Асабліва ў сакавіку і красавіку, калі патрэбна было гэтыя даведкі збіраць.

### Факт

### ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ ДАПЛАЦІЛІ

Больш за 1,3 тысячы індывідуальных прадпрымальнікаў Віцебшчыны, дзейнасць якіх праверылі супрацоўнікі падатковых органаў, за выяўленыя парушэнні даплацілі ў бюджэт звыш 842 мільёнаў рублёў. Праверылі ўсяго каля 4,5 працэнта ад агульнай колькасці «індывідуалаў», якія знаходзяцца на ўліку. У сярэднім кожнаму прадпрымальніку, па выніках праверкі дзейнасці за некалькі гадоў, дадатковa трэба было выплаціць каля 600 тысяч рублёў. І за першыя чатыры месяцы большасць грошай, неабходных да выплаты — амаль 91 працэнт, — ужо паступіла ў бюджэт.

Дарэчы, як устанавілі супрацоўнікі падатковых інспекцый, каля пяцідзесяці індывідуальных прадпрымальнікаў, правераных сёлета, ажыццяўлялі сваю дзейнасць без усякіх парушэнняў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## 19 чэрвеня — дзень медыцынскага работніка

### СА СВЯТАМ!

### Залатыя рукі, залатыя сэрцы

Мы, жыхары вёскі Дзяніскавічы, добра ставімся да ўсіх людзей у белых халатах і вельмі ўдзячныя ім за працу. Але ж ёсць сярод іх тыя, пра каго кажуць «залатыя рукі», «залатыя сэрцы». Загадчыца нашай бальніцы сястрынскага нагляду Ала Мікалаеўна Шайтар якраз з такіх. Яна — цудоўны спецыяліст і рэдкай душы чалавек. Яна, не думаючы пра сябе, заўсёды спяшаецца на дапамогу іншым.

Приемна, што па яе слядах пайшлі дзеці. Адзін з сыноў ужо працуе педыятрам у Баранавічах, другі — давучваецца ў Гродзенскім медыцынскім універсітэце.

Хочацца верыць, што ў спадчыну ад маці яны возьмуць не толькі прафесію, але і яе дабрыню, увагу да людзей.

Мы вельмі ўдзячныя нашай Але Мікалаеўне! Шчыра віншуем яе, яе сям'ю і калектыў з прафесійным святам! Зычым таго, што не купіш і не пазычыш, — гэта значыць, моцнага здароўя, удачы і здзяйснення ўсіх пажаданняў.

Наталля Шуляк, Мікалай Бруй, Надзея Галуза і многія, многія іншыя.

*в. Дзяніскавічы, Ганцавіцкі раён.*

## Чалавек — чалавеку

### «Жыў з людзьмі і для людзей»

...Новага доктара Мікалая Аляксандравіча Цішука вёска Багданава прымала калісь з насцярогай. Ведама ж — малады... Аднак неўзабаве людзі ўбачавідкі ўбачылі, што гэта — зусім не загана, бо ў чалавека, нягледзячы на ўзрост, ёсць веды і любоў да абранай справы, ёсць вялікі запас душэўнай дабрыні і спагады да людзей — асабліва да хворых...

Кожнага наш доктар умеў выслухаць, кожнаму паставіць правільны дыягназ. Калі патрабавалася, ён сам спрытна рабіў уколы і прышчэпкі, ставіў крапельніцы. А яшчэ людзі ведалі, што да яго можна пазваніць ці прыехаць і днём і ноччу, і ў будні і ў святы, у любую непагадзь — ён заўсёды быў «на баявым пасту» і ніколі нікому не адмаўляў, дапамагаў, чым мог.

Амаль сорак гадоў ён адпрацаваў у нашай амбулаторыі галоўным урачом. Жыў з людзьмі і для людзей, быў уважлівым да ўсіх, а да калег — у меру патрабавальным і справядлівым, быў добрым...

Чаму быў? Таму што сёлета, у сакавіку яго не стала. Ён памёр, як жыў — «на баявым пасту», гэта значыць, на працы.

...А пішу я гэтыя радкі, каб яшчэ раз падзякаваць яму і сказаць, што людзі яго не забудуць.

Па просьбе жыхароў вёскі Багданава

**Хрысціна Маркоўская**, *г. Валожын.*

## Доктар адказаў

### ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

**На будучым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:**

**20 чэрвеня** — галоўны ўрач Рэспубліканскай клінічнай стаматалагічнай паліклінікі Андрэй Міхайлавіч МАТВЕЕЎ.

**21 чэрвеня** — дырэктар РНПЦ «Маці і дзіця» Канстанцін Усцінавіч ВІЛЬЧУК.

**22 чэрвеня** — галоўны ўрач Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Дзмітрый Уладзіміравіч ЗАЙЦАЎ.

**23 чэрвеня** — дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі Алег Рыгоравіч СУКОНКА.

**24 чэрвеня** — начальнік аддзела лекавага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя Наталля Уладзіміраўна МАЛАШКА.

**«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25**

**20 чэрвеня** — загадчыца неўралагічнага аддзялення для дзяцей № 2 Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Святлана Іванаўна ХІТРО.

**21 чэрвеня** — загадчыца паліклінікі пры Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы Таццяна Георгіеўна РУЛЬКЕВІЧ.

**22 чэрвеня** — намеснік галоўнага ўрача Мінскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя—наркалогія» Вячаслаў Уладзіміравіч САЛАДУХА.

**23 чэрвеня** — загадчыца неўралагічнага аддзялення № 2 Мінскай абласной клінічнай бальніцы Ніна Сяргееўна КАПЫЦКАЯ.

**24 чэрвеня** — загадчыца лячэбнага стаматалагічнага аддзялення Мінскай абласной стаматалагічнай паліклінікі Людміла Ананьеўна КОБРЫНА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



«Прамая лінія»

# Хваробы ад нерваў і задавальнення: як вылечыць першыя і не атрымаць другіх

**ЛЕТА — час прыемны ва ўсіх сэнсах слова. Але як не азмрочыць адпачынак і не атрымаць непрыемнасці ў выглядзе грыбка пасля наведвання басейна? Ці трэба хавацца хваробы скуры ад сонца? Якімі непрыемнасцямі можа закончыцца курортны раман і чаму пра іх мы можам нават не здагадвацца? Пра гэта і іншае карэспандэнты «Звязды» і нашы чытачы распыталі падчас «прамой лініі» ўрача-дэрматавенеролага, загадчыка амбулаторнага дэрматавенералагічнага аддзялення Мінскага скурвендыспансэра Уладзіміра Яроміча.**



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

**— Ці ёсць хваробы, якія не любяць сонца і абвастраюцца ў перыяд сонечнай актыўнасці?** — спыталі мы ва Уладзіміра Іванавіча.

— Такія хваробы ёсць, напрыклад, чырвоная валчанка, але ў нас яны не распаўсюджаны. Большасць скурных хвароб ставяцца да сонца лаяльна і нават з удзячнасцю. Нашы пацыенты, якія з'язджаюць на адпачынак да мора, паляпшаюць свой стан, не праходзячы ніякіх спецыфічных працэдур. Сонца, марская вада і станоўчыя эмоцыі даюць часам ашаламляльны эфект. Мноства скурных хвароб — ад нерваў, таму такім людзям карысна куды-небудзь паехаць, пакінуўшы свае праблемы дома. Вялікая частка нашых пацыентаў — пажылыя людзі, якія перад адкрыццём дачнага сезона наведалі доктара, запасліся парадамі і лекамі і з'ехалі на лецішча. А вось у канцы лета, а таксама ў вясне і кастрычніку ў нас вялікі наплыў пацыентаў: хтосьці вяртаецца з лецішча, дзеці прыязджаюць з летнікаў, а студэнты — на вучобу...

Жнівень і верасень — «урадзяйныя» месяцы і ў венеролагаў: да нас звяртаюцца людзі, якія хочуць даведацца, што, акрамя загару, яны прывезлі з адпачынку. Зараз на лідзіруючыя пазіцыі выходзяць так званыя схаваныя інфекцыі — хламідыёз і мікаплазмоз, якія працякаюць схавана, прыблізна ў 40 адсоткаў выпадкаў яны выяўляюцца толькі падчас спецыяльнага аналізу. Чалавек можа і не ведаць, што хворы, пацыху адорваючы добрых знаёмых такімі «падарункамі». Такая тэндэнцыя, калі схаваныя інфекцыі дамінуюць над класічнымі, назіраецца ва ўсім свеце, характэрная яна і для нас.

***☎— Алена, Мінск. У мяне ўжо доўгі час на скуры з'яўляюцца плямкі вітыліга. Ці можа гэта быць звязана з праблемамі печані, якія такса маю?***

— Так, гэтыя праблемы могуць быць узаемазвязаныя. Таму вам трэба абавязкова падлечваць печань. Старайцеся таксама пазбягаць стрэсаў, абмяжуйце знаходжанне на сонцы. Можна прымаць вітаміны, пажадана з мінеральным комплексам.

***— Ці можа лушчэнне ў вуху быць сімптомам грыбка?***

— Неабавязкова. Гэта можа быць і дэрматыт, і алергічны працэс. Без агляду дакладна сказаць нельга, неабходна звяртацца да спецыяліста.

***— І апошняе. Некалі грыбок на пазногцях лячылі лядзяной воцатнай кіслатой. Зверху прыкладвалі мазь. Праз нейкі час пазногаць стаў ідэальным. Ці ёсць зараз такая мазь?***

— Сапраўды, так раней лячылі. Але цяпер ёсць шмат іншых прэпаратаў гэткага ж узроўню. Але трэба, каб іх прызначыў урач індывідуальна.

***☎— Ірына Мікалаеўна, Мінск. Скажыце, доктар, ужо больш як год аналіз на хламідыі ў мяне адмоўны. Ці можна лічыць, што я вылечылася?***

— Я думаю, што так можна лічыць і ў вас усё нармальна.

***— А ці добры, на ваш погляд, такі метад даследавання, як палімеразна-ланцуговая рэакцыя (ПЛР) і ці платнае абследаванне?***

— ПЛР — гэта самы аптымальны варыянт, асабліва калі яна праводзіцца ў рэжыме рэальнага часу. Платных цэнтраў якраз для гэтага няма, бо адзіная ўстаноўка для правядзення такога абследавання ў Мінску ёсць толькі ў Мінскім гарадскім скурвендыспансэры па вул. Прылуцкай.

***☎— Святлана, Мінск. У мяне часта з'яўляюцца высыпкі пад каленямі, на руках. Што з гэтым можна рабіць?***

— У вас, хутчэй за ўсё, нейрадэрміт. А ён не любіць ваду, асабліва з-пад крана. Вам можна карыстацца мазямі апошняга пакалення. Зараз іх шмат, і ўрач можа парэкамендаваць тую, якая хутчэй за ўсё дапаможа вам.

***— А прывыкання да іх не будзе?***

— Калі вы лечыцеся невялікім курсам — 2—10 сутак, то не будзе.

***☎— Вольга Андрэеўна, Старыя Дарогі. У маёй 15-гадовай дачкі з васьмі гадоў на вуснах з'яўляецца герпес. Ці вылечваецца ён і ад чаго з'яўляецца, як можна нам дапамагчы?***

— Пазбавіцца ад герпесу практычна немагчыма. Вірус, аднойчы трапіўшы ў арганізм, застаецца там назаўсёды. Герпесам інфіцыравана каля 100% насельніцтва зямнога шара. А актыўныя праявы ёсць у 5-15% людзей. У вашым выпадку неабходна пралячыць усе хранічныя інфекцыі, якія ёсць. Калі маюцца праблемы з зубамі, трэба звярнуцца да стаматолага. Бо любы ачаг хранічнай інфекцыі абвастрае цячэнне герпесу.

Акрамя таго, ёсць і супрацьгерпетычная вакцына. Вы можаце звярнуцца ў платны цэнтр вакцынацыі або набыць вакцыну самастойна і звярнуцца ў працэдурны кабінет сваёй паліклінікі. У інструкцыі да яе падрабязна расказана, як вакцыну разводзіць, калоць. Але ўколы трэба рабіць хаця б раз месяц пасля таго, як загояцца ранкі.

Магчыма, ёсць сэнс правесці імунакарэкцыю. Але для гэтага пажадана зрабіць імунаграму, каб высветліць, ці маюцца нейкія праблемы з імуннай сістэмай. Звярніцеся да ўдастковага ўрача, і ён падкажа, дзе зрабіць імунаграму.

***— А чаму, калі мы едзем адпачываць на поўдзень, герпес праяўляецца асабліва моцна. Можа, сонца такое правакуе?***

— Не, гэта не сонца, а хутчэй за ўсё, марская вада. Перад паездкай у мэтах прафілактыкі можна выкарыстаць прэпараты ацыклавір або валтарэн.

***☎— Аркадзь Аляксандравіч, Ельск. Ужо на працягу двух гадоў у мяне ёсць праявы псарыязу. З'явіліся яны пасля таго, як я перанёс цяжкую траўму з пераломам пазваночніка. Мяне не абсыпае амаль поўнасцю. Ляжаў у бальніцы ў Мазыры, Гомелі, але паляпшэння няма. Што б вы мне параілі?***

— Псарыяз — хранічнае захворванне, і часцей за ўсё ўзнікае пасля стрэсу. А далей працякае індывідуальна. Але без агляду параіць нейкае лячэнне практычна немагчыма. Калі вам не могуць дапамагчы на мясцовым узроўні, то вы можаце парапрасіць накіраванне ў рэспубліканскі кансультацыйны цэнтр, які працуе ў Мінску на базе скурвендыспансэра (тэл. (8017) 372 73 81). Тут кансультуюць супрацоўнікі кафедры Беларускага дзяржаўнага медуніверсітэта і Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**
**Вольга ШАЎКО.**
***(Працяг будзе.)***

## ПАДАРУНАК БАЦЬКАМ

**Больш за 30 дзяцей медыцынскіх работнікаў удзельнічалі ў конкурсе малюнка «Я хачу быць здаровым», які прайшоў у Гродне напярэдадні прафесійнага свята медыкаў.**

Соф'я Фадзеева першынствавала ў намінацыі «Не — шкодным звычкам», а Сямён Трусь, Юлія Слізевіч і Дзіяна Семянчук падзялілі прызавыя месцы ў намінацыях «Здароўе, спорт, рух — сіла пакалення», «Я і маё здароўе». Усіх удзельнікаў узнагародзілі дыпломам і прызам-сюрпрызам.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# ФІЛЬТРУЙ ЗАГАР!

***Заканчэнне.***
***Пачатак у нумары за 16 чэрвеня.)***



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

• Пасля кожнага кантакту з вадой неабходна наносіць крэм паўторна. Калі ён з водаўстойлівай базай — значыць, яго нябачная плёнка будзе змывацца паступова і абнаўляць крэм пасля купання трэба не так часта.

• Падчас знаходжання на пляжы арганізм моцна абязводжваецца. Каб гэта прадухіліць, піце больш вады (да 2—3 л у дзень).

• Адпачываючы на марскім узбярэжжы, памятайце, што белы пясок і водная гладзь цудоўна адлюстроўваюць сонечнае выпраменьванне. У выніку вы атрымліваеце двайную дозу ўльтрафіялету. Да таго ж, калі пасля купання вы не выцерліся ручніком, кроплі вады на целе выступяць у якасці лінз, якія ўзмоцняць уздзеянне сонечных прамянёў.

• У ветраны дзень спёка перанасіцца нашмат лягчэй, але таму і згарэць можна нашмат хутчэй.

• Свае сюрпрызы чакаюць аматараў падводнага плавання. Здавалася б, ты ўвесь дзень ныраў з трубкай і маскай у Чырвоным моры, з вады не выходзіў, а вечарам высвятляецца, што ўся спіна абгарэла. А справа ў тым, што вада прапускае ўльтрафіялет на глыбіню да метра. Прасунутыя нырцы заўсёды выкарыстоўваюць водаўстойлівы сонцаахоўны крэм або, як мінімум, надзяваюць майку.

• Перад ад'ездам у водпуск трэба не толькі набыць сонцаахоўную касметыку, але і праінспектаваць свой гардэроб. Паколькі апёк можна атрымаць нават праз адзенне, аддавайце перавагу шчыльным тканінам. Сінтэтыка здольная прапускаць ад 20 да 50% ультрафіялету. А баваўна прапускае толькі 6% сонечных прамянёў, аднак калі намокне — і ўсе 20%.

• Вярнуўшыся з пляжа, прыміце душ і ўвільгатніце скуру сродкам пасля загару.

А калі, убачыўшы пясок і пачуўшы шум прыбою, пра ўсе правілы загару вы ўсё ж забыліся — вечарам давядзецца лячыцца. Сімптомы лёгкага сонечнага апёку знаёмыя, бадай, усім — гэта сверб і «палаючая» скура. Каб аблегчыць стан, прыміце халадняваты душ або зрабіце вільготны кампрэсы (для гэтага дастаткова намачыць марлю вадой пакаёвай тэмпературы). Не выкарыстоўвайце алей і мазі, паколькі скура так не зможа нармальна дыхаць.

У аптэчцы заўсёды павінны быць пасляапёкавыя прэпараты, якія ўзмацняюць здольнасць скуры да рэгенерацыі (пантэнол, бепантэн і інш.). А сонца, на жаль, давядзецца выключыць з раскладу да поўнага загойвання скуры — звычайна на 1—2 тыдні.

Цяжкі ж сонечны апёк суправаджаецца цеплавым ударам. Сімптомы такога ўдару — боль, слабасць, дрыжыкі, гарачка, часам пачашчанае сэрцабіцце. Пашкоджаная скура становіцца ацёчнай, на ёй могуць з'явіцца пухіры. У гэтым выпадку без урачэбнай дапамогі не абысціся.

Падрыхтавала Вольга **КУЛІНКОВІЧ.**

ЛОР-прыём

# РАЗУМНЫ ІМПЛАНТАНТ ВЯРТАЕ СЛЫХ ГЛУХІМ ДЗЕЦЯМ

**БОЛЬШ як дзесяць гадоў таму на базе Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра отарыналарынгалогіі была праведзена першая ў нашай рэспубліцы кахлеарная імплантацыя. Гэта высокатэхналагічная аперацыя, пасля якой людзям, якія раней не чулі і не маглі размаўляць, вяртаюць такія магчымасці. За апошні час у рэспубліцы было зроблена каля 240 такіх аперацый, іх праводзяць у РНПЦ отарыналарынгалогіі і Гродзенскім медыцынскім інстытуце.**

**Якія паказанні існуюць да кахлеарнай імплантацыі? З гэтага пытання пачалася наша размова з загадчыцай ЛОР-аддзялення для дарослых кансультацыйнай паліклінікі РНПЦ отарыналарынгалогіі Нінай КАСЦЮК.**

— Перш за ўсё, патрэбу ў аперацыі маюць людзі з глухатой на абодва вухі або тугавухасцю, якая не карыгіруецца слыхавымі апаратамі. Часцей за ўсё аперыруюцца дзеці з прыроджанай паталогіяй. І вельмі важна правесці ім аперацыю да трох гадоў. Чым раней прааперыравана дзіця, тым лепш у яго будзе праходзіць рэабілітацыя, тым хутчэй яно навучыцца гаварыць і зможа падрыхтавацца да школы.

***— А з якога мінімальнага ўзросту можна праводзіць кахлеарную імплантацыю дзецям?***

— Недзе ад года.

***— Як жа ў такога маленькага вызначаюць глухату?***

— Справа ў тым, што зараз па ініцыятыве РНПЦ отарыналарынгалогіі распрацавана і дзейнічае праграма «Укараненне отаакустычнай эмісіі ў раддамах». Сутнасць яе ў тым, што кожнае дзіця, якое з'явілася на свет у радзільным доме, праходзіць аўдыялагічны скрынінг. Спецыялісты з дапамогай апарата отаакустычнай эмісіі ацэньваюць слых немаўляці. Гэтая методыка дазваляе выявіць цяжкія парушэнні. Калі на скрынінгавым апараце нешта западозрылі, дзіця накіроўваюць на кансультацыю да сурдолага, праводзяцца таксама дадатковыя абследаванні. І толькі калі дакладна пацверджана, што дзіця глухое, можна думаць пра аперацыю.

***— У чым сутнасць аперацыі кахлеарнай імплантацыі?***

— Падчас аперацыі хірург размяшчае ва ўлітцы вуха электроннае прыстасаванне, якое дастаўляе гук у выглядзе электрычных імпульсаў да валокнаў слыхавога нерва і далей трапляе ў мозг. Вонкавая частка імплантанта ўяўляе сабой моўны працэсар з мікрафонам, падобны на слыхавы апарат, які мацуецца за вухам. Прасцей кажучы, мы фактычна маем пратэз вуха.

Але аперацыя — гэта толькі пачатак справы. Наперадзе працяглы рэабілітацыйны перыяд: паўгода-год. Імплантант падключаюць і настройваюць праз месяц пасля аперацыі, калі ўсё загаілася. Потым з маленькім пацыентам займаюцца сурдапедагогі, па спецыяльных праграмах яны вучаць гэтых дзяцей чуць і гаварыць. Бацькі таксама не павінны заставацца ўбаку. Спецыялісты навучаць іх спецыяльным практыкаванням, якія трэба выконваць з дзіцем дома. Калі ўсё рабіць правільна, вынікі пасля аперацыі добрыя.

Другая катэгорыя, якую мы аперыруем, гэта дарослыя, што позна аглухлі з-за нейкіх прычын. Дапусцім, чалавек перанёс менінгіт або ў яго была цяжкая чэрапна-мазгавая траўма і ён аглух на абодва вухі. Такі пацыент гаварыць можа, а чуць не. Вось для іх гэтая аперацыя — вялікая дапамога. Раней такіх людзей мы вучылі толькі чытаць гукі з вуснаў і ўсё. Зараз, калі ім ужыўляюць электрод, вучаць карыстацца «штучным вухам», яны нібы набываюць новае жыццё. Недзе праз паўгода ёсць вынік. Пацыенты ўжо могуць мець зносіны па тэлефоне, карыстацца сотавай сувяззю. Рэабілітацыя ў дарослых праходзіць добра і менш працягла, чым у дзяцей.

***— Ці можа быць праведзена такая аперацыя дзецям глуханямым ад нараджэння, але якія ўжо выйшлі з узросту немаўлят і навучаюцца ў спецыяльных школах для глухіх?***

— На жаль, мы ім вымушаны адмаўляць. Гэта позна. У 10—15 гадоў мозг ужо настроены на тое, што чалавек размаўляць не будзе. У такім узросце змяніць сітуацыю нельга.

***— Як увогуле трапіць на аперацыю кахлеарнай імплантацыі? Ці з'яўляецца паслуга платнай?***

— Спачатку чалавек павінен прайсці вельмі сур'ёзнае абследаванне, і толькі потым вырашаецца пытанне аб аперацыі. Бо імплантант трэба паставіць менавіта таму пацыенту, якому ён дакладна спатрэбіцца. Таму і вядзецца шматэтапны адбор. Да гэтага адбору дапускаюцца ўсе ахвотныя. Спецыяльная камісія, у складзе якой ёсць псіхолаг, сурдапедагогі, слухапратэзісты, іншыя спецыялісты, у выніку і прымае рашэнне аб аперацыі. Але ж перад гэтым робіцца вялікі аб'ём абследаванняў.

Сама аперацыя робіцца бясплатна, не плацяць пацыенты і за імплантанты. Хоць яны вельмі дарагія, каштуюць ад 16 да 35 тысяч еўра. Зразумела, многія бацькі наўрад ці могуць сабе гэта дазволіць. Існуе спецыяльная дзяржаўная праграма, у рамках якой выдзяляюцца грошы на аперацыі кахлеарнай імплантацыі. Таму і праводзіцца такі сур'ёзны адбор пацыентаў.

Карыстаючыся выпадкам, хачу звярнуць вашу ўвагу на наступнае. Нам стала вядома, што нейкія людзі збіраюць па пад'ездах грошы на імплантанты для глухіх дзяцей. Але ж, паўтаруся, імплантанты ў нас ёсць у дастатковай колькасці, гэта якасная сертыфікаваная прадукцыя, і яны выдзяляюцца дзяржавай бясплатна. Іншая справа, што нехта хоча набыць больш дарагі апарат, але дзяржава рабіць гэта не абавязана. Яна выдзяляе на лячэнне тыя грошы, якія ёй па кішэні.

**Гутарыла Вольга ШАЎКО.**

Яна + Ён

# НЕ ЎСЕ ЗАКАРАНЕЛЫЯ ХАЛАСЦЯКІ БЕЗНАДЗЕЙНЫЯ!



**ЁН не проста мужчына без штампа ў пашпарце і працяглых адносін у мінулым. Гэта прадстаўнік моцнага, але ў дадзеным выпадку вельмі загадкавага полу, які па нейкай прычыне старанна пазбягае і першага, і другога. Жанчыны не любяць іх за падманутыя чаканні і разбітыя ўшчэнт ілюзіі, псіхолагі — за багацце разнастайных комплексаў і страхаў, якія ідуць з дзяцінства. Асноўная сутнасць гэтых страхаў адна: блізкія адносіны — гэта нешта балючае, непрыемнае і цяжкае. Магчыма, быўшы хлопчыкам, ён назіраў частыя скандалы бацькоў, а можа, першае каханне аказалася няшчасным і неўзаемным, але асацыяцыі «прыхільнасць» = «пакуты і непрыемнасці» выпрацоўваюцца ў яго вельмі выразна. І нават калі ўсё складваецца цудоўна, халасцяк чакае падвоху — неяк падазрона ўжо ўсё добра. А каб не расцягваць пакутлівае чаканне, ён падсвядома правакуе праблему, атрымлівае яе і... адчуванне поўнага задавальнення. Што ж, я так і ведаў — нічога добрага ад жанчын чакаць нельга.**

**Зрэшты, пры правільным падыходзе не ўсе халасцякі аднолькава безнадзейныя.**



## Мамчын сынок

**Чаму ён адзін?** Таму што мама дастаткова смачна гатуе і дае грошы на кішэнныя выдаткі (з яго ўласнай, зразумела, зарплаты).

**Страх:** а што скажа мама? Або ж: мама мяне любіць, і яна мяне душыць. Значыць, усе, хто мяне любіць, будуць мяне душыць, а дзвюх мам я не вытрываю.

Практычна Жэня Лукашын з любімага ўсімі навагодняга фільма — разумны і інтэлігентны, акуратна і крыху старамодна апрануты, з першага погляду здаецца сціплым і сарамлівым, але праблема адносін з супрацьлеглым полам зусім не ў гэтым. Проста першае слова «мама» дагэтуль галоўнае ў яго лёсе, і нават калі клапатлівы сынок жыве асобна, ён штодня выслухоўвае па тэлефоне дзясятак парад і павучанняў, якіх безагаворачна прытрымліваецца.

Самую папулярную параду — знайсці сабе хутчэй жонку і парадаваць матулю ўнукамі — клапатлівы сын так і не выконвае, паколькі ідэала, які адпавядае высокім патрабаванням патэнцыйнай свякрухі, у прыродзе проста не існуе. А хваляваць таталітарную і ўладную маму — сабе даражэй, ён зразумеў гэта яшчэ ў дзяцінстве.

**Як яго заваяваць?** Варыянт навукова-фантастычны — зрабіць саюзніцай маму. Варыянт рэальны — добраахвотна-прымусова замяніць яе па ўзроўні ўладарнасці і таталітарнасці, усёпаглынальнага клопату і поўнага кантролю (сынок папакутуе, але здасца, як больш моцнаму саперніку). Трэці варыянт — гульня на кантрасце — звычайна заканчваецца правалам. Пяшчотная і жаноцкая, тая, што дае адчуванне сілы і мужнасці, на нейкі час прымусіць «сыночка» стаць моцным і свабодным, але казка хутка скончыцца. Прымаць рашэнні самому — занадта цяжка і складана, і, парэфлексаваўшы, сынок вернецца да ранейшага стылю жыцця.

## Педант

**Чаму ён адзін?** А раптам вы паставіце яго кубак на ніжнюю паліцу замест верхняй і наведзяце парадак на працоўным стале?

**Страх:** каханне — гэтае ўварванне ў маё асабістае жыццё, а раптам яно зменіцца да горшага?

Яго дзень распісаны па хвілінах, а кашулі вісяць толькі ў правай частцы шафы. Ён заўсёды трымае слова, вядзе хатнюю бухгалтэрыю і ніколі не спазняецца на сустрэчы. Падобны педантызм — таксама страх, боязь нязведанага, якое пераверне ўсё жыццё, і невядома, ці да лепшага.

**Як яго заваяваць?** Запасціся цярпеннем, часам і пачуццём такту. Тэлефанаваць у пэўны час, не перавозіць сваю зубную шчотку без папярэджання, карацей, паважаць асабістую прастору. І галоўнае — не патрабаваць у далейшым кампенсацыі за праяўленае цярпенне. Гарачае, усёпаглынальнае каханне з першага погляду — варыянт, які менш падыходзіць. Прааналізаваўшы, колькі нязручнасцяў прыносіць гэтае пачуццё, педант наўрад ці захоча ўносіць у сваё мернае жыццё хаос і безразважнасць.

## Вечны хлопчык

**Чаму ён адзін?** Сорак гадоў — зусім юны ўзрост, можна і пачакаць з выбарам спадарожніцы.

**Страх:** каханне — гэта адказнасць, а раптам у мяне не атрымаецца?

Вечны хлопчык Пітэр Пэн, ён гатовы да рамантыкі і прыгод, але зусім не выносіць сумеснага побыту і абавязкаў. Спантанная паездка ў Піцер, прыезд уначы з букетам і прызнаннем — запраста, але толькі не сумесны паход па прадукты.

**Як яго заваяваць?** Стаўшы цярплівай і клапатлівай мамачкай-Вендзі, вы не атрымаеце ўзамен ні падзякі, ні кахання. Адзіны і вельмі няпросты спосаб дабіцца чагосьці ад Пітэра Пэна — абудзіць у ім адказнасць, неўпрыкмет і дазавана.

## Ідэаліст

**Чаму ён адзін?** Таму што да гэтага часу не сустрэў ідэальнае каханне. Апошняя каханка — жах! — аднойчы спазнілася на 15 хвілін, а пасля шасці з'ела вялікі кавалак піцы.

**Страх:** адносіны — гэта сур'ёзна, а раптам я памылюся?

Як правіла, у ідэалістаў ужо ёсць аб'ект для ідэальнага кахання — прычым аб'ект недаступны і непахісны. Ён можа быць закаханы ў аднакласніцу з мужам і дваімі дзецьмі, якая жыве ў іншым горадзе, строгую калегу або яшчэ каго-небудзь, хто ўжо дакладна не адкажа ўзаемнасцю. А як толькі адкажа, ідэаліст адразу страціць інтарэс, бо ўзаемнасць — гэта адносіны, а адносіны — гэта сур'ёзна. Часцяком ідэаліст яшчэ і няўпэўнены ў сабе і ў глыбіні душы лічыць, што кахаць яго няма за што. А калі хтосьці праяўляе каханне — гэта ўжо вельмі і вельмі падазрона, лепш трымацца падалей.

**Як яго заваяваць?** Пастаянна адпавядаць яго высокім патрабаванням падчас сямейнага жыцця наўрад ці атрымаецца, таму трэба мяняць устаноўкі. Паспрабуйце абудзіць у ім упэўненасць ва ўласных сілах, даўшы магчымасць быць моцным і рашучым. Магчыма, паверыўшы ў сябе, ён паверыць і ў правільнасць зробленага выбару.

## Нарцыс

**Чаму ён адзін?** Так складана, нязручна і клапотна кахаць кагосьці яшчэ, акрамя сябе.

**Страх:** сумеснае жыццё патрабуе душэўнай блізкасці. А ці так бяспечна адкрыць душу іншаму чалавеку?

Дваццаць крэмаў у ванным пакоі, моднае адзенне, здаровае харчаванне. Як правіла, яго любоў да ўласнай персоны — ахоўная маска. Прынамсі, калі ты любіш сябе, то дакладна можаш разлічваць на ўзаемнасць.

**Як яго заваяваць?** Не выдаваць сябе за ракавую жанчыну і не пераймаць яго манеру зносін. Праяўляць клопат — але не залішне, пяшчоту — але не звыш меры, захапляцца ўнутранымі якасцямі, а не знешнасцю, не прэтэндаваць на панаванне ў адносінах.

## Валацуга

**Чаму ён адзін?** Таму што не гатовы ахвяраваць сваімі інтарэсамі.

**Страх:** сям'я павінна быць у жыцці галоўнай, а ў маім жыцці так шмат усяго цікавага. Раптам я гэта страчу?

У куце лыжы і заплечнік, а можа, веласіпед і спінінг, фотаапарат і маска для падводнага плавання, гітара і ролікі. Ён любіць вандроўкі і вялікія кампаніі, раманы, якія ні да чаго не абавязваюць, і цярпець не можа ціску.

**Як яго заваяваць?** Мець свае інтарэсы і захапленні і ўсяляк дэманстраваць матрыманіяльную незацікаўленасць. Другі, больш доўгі варыянт — чакаць, калі ён стоміцца ад пералётаў і дыму вогнішча і захоча ціхага сямейнага шчасця. Праўда, раней 40 гадоў гэта наўрад ці адбудзецца.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

**ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА**

**ПОСТАВСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (211875, Витебская обл., г. Поставы, пл. Ленина, 25)**

**19 июля 2011 года в 10.00 ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**на право заключения договора аренды сроком на 25 лет земельного участка с кадастровым номером 224050100002000359, площадью 0,0047га для размещения торгового павильона модульного типа по адресу: г. Поставы, Юбилейная, д. 3Б.**

Аукцион проводится в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25) в кабинете заместителя председателя райисполкома по экономике (III этаж, каб. 58).

Начальная цена предмета аукциона **8 899 190** (восемь миллионов восемьсот девяносто девять тысяч сто девяносто**)** белорусских рублей.

Победитель аукциона обязан в 10-дневный срок со дня принятия райисполкомом решения о предоставлении земельного участка в аренду:

- внести в местный бюджет плату за право заключения договора аренды земельного участка в размере, заявленном на торгах;

- возместить организатору аукциона (Поставскому райисполкому) расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка в сумме **2 164 144**;

- заключить с исполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении земельного участка в аренду государственную регистрацию возникновения права на земельный участок;

- приступить к занятию земельного участка по целевому назначению не позднее 6-ти месяцев со дня получения свидетельства о государственной регистрации.

По вопросам получения дополнительной информации о земельном участке, ознакомления с земельно-кадастровой документацией, подачи заявления на участие в аукционе обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома по адресу: г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. № 11, контактный телефон 8 (02155) 43180.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 со дня публикации настоящего объявления **до 15 июля 2011 года включительно.**

К заявлению на участие в аукционе прилагаются:

- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

- представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке задаток.

При подаче документов на участие в аукционе представители юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Размер задатка – 889 919 белорусских рублей.

Реквизиты получателя платежа для перечисления денежных средств (задатка за участие в аукционе) – Поставский райисполком РБ, счет № 3641324000009 в ЦБУ № 230 филиала № 216 ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Полоцке, код банка 150801648, код 648.

## Надвор'е

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить УП «Минский городской центр недвижимости» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под роспись.

В соответствии с Инструкцией о порядке сдачи в аренду капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, их частей, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 16.12.2009 № 271, договор аренды недвижимого имущества с победителем аукциона заключается на основании решения Мингорисполкома о сдаче в аренду этого имущества на пять лет в срок в соответствии с законодательством.

По объектам недвижимого имущества, право заключения договора аренды которых продано на аукционе, арендодатель оформляет в комиссию Мингорисполкома по упорядочению использования зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности, заявление с просьбой согласовать сдачу недвижимого имущества в аренду и условия договора аренды. Заявление должно быть подписано арендодателем и победителем аукциона, а по объектам, находящимся в хозяйственном ведении ЖРЭО администраций районов г. Минска, согласовано с администрацией района г. Минска, на территории которого расположено недвижимое имущество.

По объектам недвижимого имущества, право заключения договора аренды которых продано на аукционе, арендодатель вправе до получения соответствующего решения Мингорисполкома заключить договор аренды в соответствии с законодательством на срок до 2 месяцев с тем субъектом хозяйствования, в отношении которого им направлено заявление о согласовании сдачи в аренду недвижимого имущества.

**Телефон для справок (017) 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by.**




**Вось такое лета мне падабаецца! Цудоўнае камфортнае надвор'е, якое дазваляе не проста гатаваць, а атрымліваць задавальненне ад стаяння ля пліты, не абліваючыся пры гэтым потам. Таму трэба карыстацца момантам і выкарыстоўваць нашы духоўкі на поўную магутнасць. Прапаную вашай увазе некалькі вельмі цікавых рэцэптаў з вельмі простых і даступных прадуктаў.**

### СУП З КУРЫНЫМІ І СЫРНЫМІ КЛЁЦКАМІ

**Вазьміце:** *1,5 л вады, 300 г бульбы, 1 сярэднюю моркву (каля 150 г), 80—100 г вермішэлі, 1 чайную лыжку солі, перац, 2—3 лаўровыя лісты, зялёніва. Для курыных клёцак: 200 г курынага мяса, 1 маленькую цыбуліну (50 г), 1/4 чайнай лыжкі солі, соду на кончыку нажа. Для сырных клёцак: 60 г сыру, 1 яйка, 1 сталовую лыжку мукі, дробку солі, перцу, соду на кончыку нажа.*

Бульбу абабраць і парэзаць маленькімі кубікамі. Прамыць у халоднай вадзе ад крухмалу. Моркву ачысціць і парэзаць кружкамі. У каструлі давесці да кіпення 1,5 літра вады. Усю гародніну скласці ў каструлю. Варыць 15 хвілін. Пакуль варыцца гароднiна, падрыхтаваць дзве масы для клёцак.

**Курыная маса.** Курынае мяса прапусціць праз мясарубку. Цыбуліну надзерці на самай дробнай тарцы ў кашку. Змяшаць курыны фарш, цыбульную пасту, соль, перац і соду.

**Сырная маса.** Сыр надзерці на сярэдняй тарцы. У місцы размяшаць яйка з соллю і перцам. Калі хочацца вострага смаку, то дадаць які-небудзь востры соус ад курку́му, кары, востры чырвоны перац. Усыпаць дзёрты сыр і перамяшаць. Насыпаць муку з содай, яшчэ раз перамяшаць. Павінна атрымацца ліпкае, даволі густое цеста. Калі цеста вадкае, то дадаць яшчэ мукі.

Агароднінны суп пасаліць і пры дапамозе дзвюх лыжак запусціць курыныя клёцкі. Памер адной клёцкі павінен быць прыкладна з палову чайнай лыжкі. Пасля курыных клёцак у булён засыпаць вермішэль і пакласці лаўровы ліст. Давесці да кіпення і, зменшыць агонь і варыць 4—5 хвілін. Затым у суп увесці сырныя клёцкі, таксама пры дапамозе дзвюх лыжак. Варыць 1 хвіліну, затым падаць суп на стол. Пры падачы ў талеркі з супам можна пакласці дробна парэзанае зяленіва — кроп, пятрушку, кінзу.

### БУЛЬБЯНАЯ ЗАПЯКАНКА ПА-ФРАНЦУЗСКУ

**Нам спатрэбіцца:** *1 кг бульбы, 1,5 шклянкі малака або 10—20-працэнтных вяршкоў, 1 зубчык часнаку, 30—50 г масла, 30—40 г смятаны, 0,5—1 чайная лыжка солі.*

Бульбу пажадана ўзяць сопкіх гатункаў. Абабраць, парэзаць на тонкія скрылікі таўшчынёй не больш як 3 мм і прамыць у халоднай вадзе, каб пазбавіцца ад крухмалу на зрэзе.

Нацерці глыбокую бляху або форму для запякання зубчыкам часнаку. Даць соку падсохнуць і злёгку намазаць маслам. Бульбяныя лустачкі выкласці па крузе радамі так, каб яны заходзілі адна на адну (накшталт дахоўкі). Не запаўняйце бляху больш чым на дзве траціны.

У малацэ растварыць соль і заліць страву малаком, каб яно ледзь пакрывала бульбу. Зверху намазаць тонкі слой смятаны. Для ўтварэння скарыначкі на смятану пакласці тонкія лустачкі (або стружку) сметанковага масла. Паставіць форму з бульбай у разагрэтую да тэмпературы 200—220 °C духоўку, праз 15 хвілін панізіць тэмпературу да 180 °C і запякаць яшчэ 30—45 хвілін, пакуль малако не ўбярэцца ў бульбу, а смятана не ўтворыць залацістую скарыначку. Калі скарыначка пачне падгараць, а бульба яшчэ будзе сырой, прыкрыйце форму зверху фольгай. Гатоўнасць бульбы правяраецца праколам нажа — нож павінен уваходзіць лёгка, плаўна і без характэрнага парыпвання.

Бульба атрымліваецца вельмі далікатнай, таму пры накладванні ў талеркі яе варта браць асцярожна, захопліваючы знізу вялікай лыжкай або лапаткай і прытрымліваючы зверху відэльцам.

### ПІРОГ З МЯСНЫМІ ШАРЫКАМІ

**Вазьміце:** *3 яйкі, 100 г смятаны, 1 шклянку мукі, 0,5 чайнай лыжкі солі, перац, 1 чайную лыжку разрыхляльніку, соду на кончыку нажа, пры жаданні — кроп. Для начынкі вазьміце 400 г гатовага фаршу (мяса, цыбуля, соль, перац).*

Гатуем цеста. Яйкі ўзбіць міксерам з соллю і перцам. Пры жаданні можна дадаць дробна парэзаны кроп (без цвёрдых сцёблаў). Умяшаць спачатку смятану, а потым муку з содай і разрыхляльнікам. Павінна атрымацца густое вязкае цеста. Цяпер гатуем начынку. З фаршу скачаць шчыльныя шарыкі памерам з грэцкі арэх. На дно формы для запякання пакласці паперу для выпечкі або фольгу (фольгу шчодра намазаць алеем). Выкласці цеста і разраўнаваць яго. На цеста блізка адзін ад аднаго выкласці мясныя шарыкі, крыху ўціскаючы іх у цеста. Духоўку разагрэць да тэмпературы 180—200 °C і паставіць у яе форму з пірагом на 45—50 хвілін — да гатоўнасці мяса. Калі шарыкі пачнуць прыгараць зверху, накрыць форму лістом фольгі.

**Ядомы анекдот**

Парады маладой гаспадыні: «Каб прыгатаваць суп з фрыкадэлькамі, спачатку ачысціце пельмені ад лупіны».

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

## ДЗЕВАМ НЕ ВАРТА ІДЭАЛІЗАВАЦЬ НАВАКОЛЬНЫХ, А ШАЛЯЎ ЧАКАЕ ШЭРАГ ЯРКІХ ПАДЗЕЙ

**АВЕН.** Час падвесці папярэднія вынікі зробленага ў апошні час, пахваліць сябе і заняцца больш прыемнымі справамі. У панядзелак пажадана скласці план дзейнняў на найбліжэйшую будучыню, уключаючы ў яго нават зусім малаважныя пункты. Праяўляйце больш ініцыятывы, вам будзе вельмі патрэбен бадзёры і актыўны настрой. У другой палове тыдня могуць змяніцца ўмовы працы, і гэта выкліча некаторае здзіўленне. Самы час задумацца пра адпачынак.

**ЦЯЛЕЦ.** Паспрабуйце ў пачатку тыдня пазбягаць канфліктаў з блізкімі людзьмі. У канцы тыдня вам могуць прапанаваць цікавую працу — як след падумайце і, калі ўсё задавальняе, згаджайцеся. Прысвяціце прывядзенню свайго дома ў парадак хоць бы адзін дзень. Праяўляйце шчодрасць. Дайце дзецям дастаткова ўвагі і паклапаціцеся пра іх, бо яны маюць патрэбу ў вашай мудрай парадзе.

**БЛІЗНЯТЫ.** Творчая праца будзе станоўча ўплываць на настрой і працаздольнасць. Паспрабуйце перамагчы вострае жаданне ўвязацца ў авантуру, калі такое паўстане, бо нічым добрым для вас яна не скончыцца. Прыслухайцеся да парад блізкіх і сваякоў, яны дапамогуць вырашыць нават тупіковыя на першы погляд пытанні. Плануйце рашучыя дзеянні, пачатак новай справы — не выпускайце свой шанц, выкарыстоўвайце спрыяльны час.

**РАК.** Надыходзячы час вельмі спрыяльны для ажыццяўлення любых ідэй. Нядаўнія знаёмыя могуць занадта актыўна ўмешвацца ў ваша асабістае жыццё, так што старайцеся трымацца ад такіх людзей падалей. У сераду зможаце бліскуча абараніць свае погляды на жыццё. У гэты дзень не выпусціце шанц умацаваць сваё становішча на кар'ерных усходах, а то і зрабіць яшчэ пару крокаў угору. У чацвер варта адкласці ўсе сур'ёзныя справы, бо яны не прынясуць поспеху. Суботу і нядзелю лепш прысвяціць сям'і і дому, тым больш што вам будзе пад сілу гарманізаваць прастору навокал.

**ЛЕЎ.** Надыходзіць спрыяльны тыдзень. Даверцеся інтуіцыі — і зможаце рэалізаваць планы і задумы. Скарыстайцеся новай інфармацыяй і ўменнем пераконваць. Чацвер — спрыяльны дзень для пачатку доўгатэрміновых праектаў, нават самыя грандыёзныя з іх апынуцца здзяйсняльнымі. Выдатна пойдуць справы, звязаныя са страхаваннем і спадчынай. Прыкладайце больш намаганняў для пошуку дадатковага заробку. Падбадзіць вас пажаданне. Магчыма, павышэнне ўзроўню сваёй кваліфікацыі. Могуць пацешыць весткі здалёку. Магчыма, дзеці запатрабуюць да сябе больш часу і ўвагі.

**ДЗЕВА.** Усё будзе наўпрост залежаць ад ступені прыкладзеных намаганняў. У панядзелак магчымая сустрэча, якая зменіць планы на найбліжэйшую будучыню. Серада можа прынесці нечаканы стрэс: апынецеся ў цэнтры падзей — пастарайцеся атрымаць з гэтага максімум карысці. Нават калі вы заўсёды стараліся не распаўсюджвацца пра свае справы, зараз не атрымаецца захаваць іх у тайне. Паспрабуйце не рыхтаваць сабе глебу для будучых расчараванняў — не ідэалізуйце навакольных і вашы з імі адносіны.

**ШАЛІ.** Тыдзень будзе суправаджацца шэрагам яркіх і выдатных падзей. У іх ліку, верагодна, доўгачаканае падарожжа з каханым чалавекам або разам з сябрамі, выкананне даўніх жаданняў і задум. Калі вас ахопіць кругаварот удалых спраў і прыемных далягляддаў, у вас можа паўстаць толькі адна праблема — як паспець і нікуды не спазніцца. Але ўжо з ёй якраз вам справіцца па сілах. Для тых, чый адпачынак ужо мінуў або яшчэ не наступіў, пажадана прыцішыць свае амбіцыі, пачакаць з праявай ініцыятывы — цяпер для гэтага не лепшы час. Складана будзе праяўляць дыпламатычнасць у некаторых сітуацыях.

**СКАРПІЁН.** Напэўна захочацца навесці на працы парадак і прыгажосць: вось тут усе і зразумеюць, што вы неардынарная асоба. Назапашаныя веды і досвед будуць спрыяць умацаванню аўтарытэту, аднак не варта імі занадта часта казырацца. У вас з'явіцца шанц увасобіць у жыццё пэўныя планы і задумы. Не бярыцеся за справу, калі ў гэтай галіне вы не зможаце бліснуць прафесіяналізмам. У суботу ваша звычайная праніклівасць часова можа падвесці. Вы, вядома, можаце цешыць сябе ілюзіямі, але сур'ёзных рашэнняў у гэты дзень лепш не прымаць.

**СТРАЛЕЦ.** Цярпенне і праца, а таксама поўная абыякавасць да эмоцый, якія выказваюць навакольныя, дазволяць захаваць здароўе і самапавагу. Нямала цікавых ідэй паўстане ў вас менавіта цяпер. Усё будзе гарэць у руках, і вы проста гуляючы справіцеся з усімі назапашанымі дробнымі справамі. Таварыскасць не будзе вашай моцнай якасцю, затое сабранасць зможаце стварыць вельмі выгаднае ўражанне.

**КАЗЯРОГ.** Паспрабуйце мець зносіны з навакольнымі роўна гэтулькі, колькі неабходна, — не трэба празмернасцяў. Зрэшты, гэта не датычыцца зносін з тымі, хто вам сімпатычны. У прыватнасці, панядзелак — удалы дзень для адпачынку або паездкі на пікнік разам з сябрамі. Аўторак падыдзе для рашэння складаных праблем і для давядзення да розуму даўно пачатых спраў. У сераду паспрабуйце знізіць нагрузку да мінімуму, не прызначайце сур'ёзных сустрэч. У суботу ваша праца будзе малаэфектыўнай, так што для дасягнення жаданага выніку давядзецца прыкласці максімум намаганняў. Нядзеля — адзін з самых насычаных дзён тыдня. Вас могуць чакаць прыемныя нечаканасці, але сцеражыцеся агляддацца назад, не варушыце мінулага.

**ВАДАЛЕЙ.** Гэты тыдзень прынясе адчуванне ўнутранай свабоды. Актыўна рухайцеся да вызначаных мэты — памятайце, што партнёры дапамогуць і падтрымаюць. Калі ўсё ўжо вырашана і прадумана, то гэты тыдзень спрыяльны для змены працы. У аўторак не бярыцеся за некалькі спраў адразу, гэтая ноша можа апынуцца не пад сілу. У другой палове тыдня дзеці запатрабуюць пільнай увагі. У выхадныя можа паўстаць праблема выбару, напрыклад: або зарабіць добрыя грошы, або цікава правесці час.

**РЫБЫ.** Давядзецца пазмагацца з канкурэнтамі, зрэшты, вялікія шанцы выйсці з барацьбы з перамогай і давесці навакольным сваю здольнасць з бляскам пераадольваць шматлікія цяжкасці. У аўторак вас чакае дарога, магчымая камандзіроўка або вандроўка. У пятніцу з'явіцца нагода ганарыцца сабой. Дзеці могуць запатрабаваць пэўных капіталаўкладанняў.

Віншуем! Віншуем! Віншуем!

Дарагіх дзяцей **Косцю Базылева і Юлю Маркевіч з найсвятлейшай падзеяй — стварэннем сям'і!** Каханне, шчасця вам у сямейным жыцці, заўсёды паважайце адно аднаго, жывіце ў згодзе і радасці.

Каб ваш саюз быў самым трывалым і вечным, любові да ладу вам на доўгія гады!



**З любоўю, надзеяй і верай бацькі Валянціна Адамаўна і Пётр Усеваладавіч.**

*г. Мінск.*

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

**СМАЧНА ЕСЦІ**

## У нас на абед трускалкі!

### САЛАТНАЯ ЗАПРАЎКА

**Гэтая лёгкая летняя салатная запраўка падыдзе да любой зялёнай салаты.**



**Неабходныя прадукты:** *50 г алею, 50 г свежай трускалкі (нарэзаць на скрылікі), 1/2 ч. л. гатовай гарчыцы, 1 ст.л. віннага воцату (а яшчэ лепш бальзамічнага), соль і молаты чорны перац на кончыку нажа, цукар па смаку.*

Здрабніць ягады ў пюрэ. Дадаць воцат, гарчыцу і ўсе астатнія заправы. Добра змяшаць, затым дадаць алей і ўзбіваць да крэмападобнага стану. Паспрабаваць і, калі трэба, падсаліць або дадаць цукар. Яшчэ раз размяшаць. Запраўку можна захоўваць у халадзільніку не больш 2—3 дзён.

### КУРЫНАЯ ГРУДКА З ТРУСКАЛКАМІ ПА-КІТАЙСКУ

**Неабходныя прадукты:** *350 г курыных грудак без костак і скуры, 12—15 свежых трускалак,1/4 шклянкі вады, 1 ст. л. апельсінавага соку,1 ст. л. лімоннага соку, 1 ч. л. цукру, 1 ч. лыжка крухмалу, 2—4 ч. лыжкі вады , 3 ст. л. раслiннага алею для смажання, 1 ч. л. здробненага часнаку, 1 ч. л. здробненага свежага кораня імбіру. Для марынаду: 1 ст. л. соевага соуса, 1 ч. л. віннага воцату,1,5 ст. л. крухмалу.*



Курыныя грудкі нарэзаць на тонкія палоскі даўжынёй 6—7 см, скласці іх у міску, дадаць соевы соус, вінны воцат, пасыпаць крухмалам, змяшаць і пакінуць марынавацца на 15 хвілін.

У кубку змяшаць 1/4 шклянкі вады, апельсінавы і лімонны сокі і цукар. У іншым кубку развесці адну чайную лыжку крухмалу ў 2 або 4 чайных лыжках вады (2 лыжкі вады — для гусцейшай падліўкі, а 4 — для больш вадкай). Трускалкі парэзаць на 4 часткі. Разагрэць патэльню з тоўстым дном, уліць у яе 2 сталовыя лыжкі алею. Калі алей добра разагрэецца, дадаць палову здробненага часнаку і кораня імбіру. Абсмажваць да з'яўлення паху (каля 10 секунд), затым пакласці кавалачкі марынаванага мяса кураняці. Смажыць каля 30 секунд, пакуль не падрумяніцца, змяшаць і дасмажваць мяса амаль да гатоўнасці (да белага колеру), часта памешваючы. Выкласці мяса на талерку. У патэльню ўліць алей, які застаўся, дадаць астатні часнаку і кораня імбіру. Абсмажваць каля 10 секунд, затым пакласці падрыхтаваныя трускалкі. Абсмажыць ягады вельмі хутка (каля 30 секунд). Яшчэ раз добра размяшаць падрыхтаваную сумесь крухмалу і вады і ўліць яе ў атрыманую ягадную падліўку, пры гэтым хутка памешваць, пакуль падліўка не згусне. Калі падліўка згусне, пакласці ў яе кавалачкі мяса кураняці, добра размяшаць, размяркоўваючы ўсе інгрэдыенты раўнамерна, і трохі прагрэць на павольным агні да поўнай гатоўнасці мяса. На гарнір лепш за ўсё падыдзе рыс.

### ПАСТА З ТРУСКАЛАК

**Спатрэбіцца**: *100 г плаўленага сыру (лепш сметанкавага),150—200 г свежых трускалак, 2 ст. л. цукровай пудры.*

Расцерці плаўлены сыр, дадаць цукровую пудру і дробна нарэзаныя трускалкі. Усё добра расцерці відэльцам і змяшаць у аднастайную масу, лепш блендарам. Атрыманую пасту намазаць на свежыя тосты з белага батона, лустачкі багету або свежыя бліны. Можна намазваць такую пасту на салодкія булачкі або кексы, калі вы любіце салодкае і не турбуецеся аб сваёй фігуры.

***(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 11 чэрвеня.)***

-2760-

**ПЕРАЙМАЙ!**

## Цяпліца з бутэлек

**Фермер са Швецыі Бент Івенсэн знайшоў вельмі арыгінальнае і, што немалаважна, карыснае ўжыванне пустым бутэлькам. Ён збудаваў з іх невялікую цяпліцу.**

Пастаўленыя стаўма 400 штук бутэлек запоўнілі пралёты драўлянага каркаса: бутэлькі першага шэрагу былі звернуты донцамі ўніз, наступнага шэрагу — донцамі ўверх, зазоры латаліся цэментным растворам. Паўночны бок цяпліцы фермер выклаў цёмна-зялёнымі і карычневымі бутэлькамі, астатнія тры сцяны — бясколернымі. Па такім прынцыпе быў зроблены і дах цяпліцы, у цэнтры якой пакінуты люк, які нагадвае фортачку. Святла ў такой «бутэлькавай» цяпліцы дастаткова для нармальнага росту гародніны.

**ЛЕЧЫМСЯ БЕЗ ЛЕКАЎ**

## Карыца дапаможа дыябетыкам



Як высветлілі амерыканскія навукоўцы, у карыцы ёсць вельмі карысная якасць — яна здольная зніжаць узровень цукру ў крыві. Таму медыкі рэкамендуюць людзям, якія пакутуюць на дыябет, дадаваць карыцу ў ежу. Вельмі карысная карыца людзям з дыябетам другога тыпу, бо людзі, якія пакутуюць на гэтае захворванне, маюць устойлівасць да інсуліну.

Таксама даследаванні паказалі, што карыца зніжае ўзровень халестэрыну ў крыві, але медыкі не раяць есці выпечку, салодкія стравы, запраўленыя карыцай. Яе лепш дадаваць у свой звычайны рацыён, і паловы чайнай лыжкі ў суткі будзе дастаткова.

Карыцай запраўляюць самыя розныя стравы. Адразу адчуваецца грэцкі ўплыў, калі бараніну запраўляюць карыцай, а гарнір з тушанай зялёнай фасолі або цукіні. Ва ўсходняй кулінарыі карыцу дадаюць да страў з птушкі, а ў Кітаі карыцай запраўляюць свініну. У рускай кухні рэзкай карыцай запраўляюць малочныя супы, кашы, аладкі, марынаваную рыбу. Але неабходна памятаць пры гатаванні страў, што пры доўгай цеплавой апрацоўцы можна сапсаваць смак стравы, бо карыца набывае горкі прысмак. Карыцу лепш дадаваць у канцы гатавання.

## Цыбуля не дасць састарэць



Карысныя ўласцівасці цыбулі вывучалі японскія і французскія навукоўцы і былі здзіўлены атрыманымі вынікамі. Даўно ўсе ведаюць, што цыбуля дапамагае пры інфекцыйных захворваннях, дэзінфікуе, дапамагае пры цынзе, але вынікі паказалі, што не толькі гэтымі ўласцівасцямі багатая цыбуля. Рэпчатая цыбуля, дзякуючы актыўным серным рэчывам, якія ёсць у ёй, чысціць клеткі галаўнога мозгу і запавольвае працэс старэння. Гэтыя рэчывы трапляюць у кроў і ўздзейнічаюць на шэраг галаўных зон. Яны могуць актывізаваць і амаладзіць клеткі галаўнога мозгу, якія адказваюць за эмоцыі і памяць. А французскія навукоўцы правялі даследаванні сярод жанчын, і выявілі, што калі ў ежу ўжываць цыбулю і часнок, то гэта вядзе да зніжэння верагоднасці захворвання ракам грудзей.

-2761-

Міхаіл КАВАЛЁЎ:

# «Выйсці з крызісу можна, толькі дзейнічаючы супольна»

**Свой пункт гледжання на актуальныя праблемы развіцця беларускай эканомікі падчас відэабрыфінгу выказаў Міхаіл КАВАЛЁЎ, прафесар, дэкан эканамічнага факультэта БДУ. У прыватнасці, ён лічыць, што сённяшнюю сітуацыю назваць валютным крызісам нельга:**

— Зараз назіраецца востры дэфіцыт валюты, але я б гэта не класіфікаваў як валютны крызіс, бо валютны крызіс — гэта калі поўнасцю спустошаны валютныя рэзервы, а ў нашага Нацбанка нават па методыцы МВФ ёсць амаль 4 мільярды долараў золатавалютных рэзерваў, плюс крэдытныя лініі. Таму гэта насамрэч толькі востры дэфіцыт валюты. Чаму ён адбыўся? Я б сказаў так, што уклад у гэтую сітуацыю ўнеслі ўсе, — мяркуе Міхаіл Кавалёў.

Далей ён больш падрабязна расказаў, хто і што зрабіў для пагаршэння сітуацыі:

— Насельніцтва хацела жыць трошкі лепей, чым працавала (у нас за пяцігодку грашовыя даходы насельніцтва выраслі на 70%, а ВУП — толькі на 40%). Нам не вельмі хацелася купляць тое, што мы зрабілі сваімі рукамі, мы аддавалі перавагу імпарту — ён вырас да канца пяцігодкі ў два разы. Нізкай была і норма зберажэнняў: мы ўсе хацелі жыць добра менавіта сёння. Вядома, уклад унеслі прамысловыя прадпрыемствы, якім хацелася хутчэй абнавіць свае тэхналагічныя лініі. Яны ахвотна бралі крэдыты за мяжой і абнаўлялі сваю вытворчасць. І сёння асноўныя даўгі не ў дзяржавы — беларуская дзяржава вінна недзе каля 10 мільярдаў долараў, гэта зусім невялікая лічба. А вось карпаратыўны сектар вінен толькі кароткатэрміновых даўгоў каля 13 мільярдаў. У сукупнасці — каля 30 мільярдаў. Заўважу, што па міжнародных нормах знешні доўг зусім не вялікі, бо па амерыканскіх цэнах наш ВУП недзе перавышае 140 мільярдаў долараў (на сайце МФВ больш дакладная лічба). Свой істотны ўклад у востры дэфіцыт валюты ўнеслі і будаўнікі, якія занадта шмат будавалі ў доўг. І ясна, што дапамагаў ім ў гэтым Нацбанк, які ахвотна рэфінансаваў камерцыйныя банкі пад будаўніцтва жылля і пад іншыя дзяржпраграмы. Каб выйсці з крызісу, усе краіны свету павялічваюць грашовы попыт, і мы ў 2009 годзе крыху павялічылі, але асабліва наш рэгулятар (Нацбанк) павялічыў грашовую прапанову ў 2010 годзе, калі грашовыя актывы банкаўскай сістэмы за адзін год фактычна прыраслі на трэць. Гэта сапраўды вельмі шмат. І вось сукупнасць гэтых фактараў стварыла пэўныя дыспрапорцыі ў эканоміцы — мы пачалі жыць трошкі ў доўг.

Таксама штуршком для крызісу Міхаіл Кавалёў лічыць і дэвальвацыйныя чаканні:

— Мы так спакойна працягвалі б жыць і далей, у нас экспарт зараз расце вельмі імклівымі тэмпамі, калі б не сфарміраваўся пасля заявы МВФ у пачатку сакавіка агульны негатыўны інфарматыўны фон і не праявіліся дэвальвацыйныя чаканні насельніцтва. Калі б мы тады дэвальвавалі нашу нацыянальную валюту працэнтаў на 10, ну можа на 20, то ўсё б супакоілася. Бо аб'ектыўных, глыбокіх прычын для крызісу не было і няма сёння. Ёсць некаторая разагрэтасць пэўных сегментаў рынку, у першую чаргу рынку будаўніцтва жылля, рынку тавараў, якія зроблены з імпартных камплектных частак з невысокай дабаўленай вартасцю. Яны разагрэлі нашу эканоміку, а гэта пры невысокай норме зберажэння і пры жаданні насельніцтва як мага хутчэй усяго купіць прывяло да таго, што чыстая норма зберажэнняў стала адмоўнай: наша насельніцтва пазычыла ў банках грошай болей, чым прынесла ў банкі. Гэта ўсё ў сукупнасці пры ўмове негатыўнага фону і прывяло да дэфіцыту валюты. Яшчэ раз падкрэслю, што нейкіх глыбокіх прычын у эканоміцы для крызісу няма, — сказаў Міхаіл Кавалёў.



Пры гэтым ён заўважыў, што свой уклад у крызіс унеслі і знешнія абставіны:

— У нас у апошнія гады складвалася адмоўнае гандлёвае сальда, яно амаль раўнялася прыросту цэн на газ. Бо калі яшчэ ў канцы мінулай пяцігодкі за газ мы плацілі паўмільярда долараў, то ўжо сёлета мы заплацілі 4,5 мільярда долараў. І калі паглядзець наша гандлёвае сальда тавараў і паслуг, разам узятых, яно якраз і адмоўнае не нашмат большае за 4 мільярды долараў.

Што тычыцца курса беларускага рубля, то дэкан эканамічнага факультэта БДУ лічыць, што Нацбанк павінен стабілізаваць яго на ўзроўні 5 тысяч за 1 долар:

— Я перакананы, што Нацбанк таму і называецца рэгулятарам, што ён павінен рэгуляваць валютны курс. Ён на нейкі час пайшоў з валютных рынкаў, каб не памяншаць свае золатавалютныя рэзервы. Але цяпер, калі паступяць крэдыты ад ЕўрАзЭС і МВФ, безумоўна, Нацбанк павінен умешвацца ў сітуацыю і паспрабаваць стабілізаваць курс на ўзроўні 5 тысяч, магчыма нават і ніжэй.

Дарэчы, калі ўжо казаць пра крэдыты, то Міхаіл Кавалёў мяркуе, што іх трэба патрацiць менавіта на стабілізацыю курсу беларускага рубля:

— Зрасходаваць і той, і другі крэдыты трэба, безумоўна, толькі на адну мэту — на стабілізацыю курсу беларускага рубля на максімальна нізкім узроўні. Мы ўжо ўсвядомілі ўсе, як цяжка пераносяць і суб'екты гаспадарання, і насельніцтва істотную дэвальвацыю. Дэвальвацыя наогул — вельмі вялікае зло... Усё-такі гэта часовае дзеянне. Пазней дэвальвацыя пройдзе па поўным гаспадарчым ланцужку, цэны немінуча выраўнуюцца і эфект звядзецца да нуля. Акрамя таго, узнікнуць вялікія праблемы ў тых, хто ўзяў калісьці валютныя крэдыты. Добра, што мы год назад якраз па маёй прапанове адмянілі выдачу валютных крэдытаў насельніцтву, — сказаў прафесар і дадаў, што ў выйгрышы ад дэвальвацыі засталіся тыя асобы, якія паспелі ўзяць крэдыт у рублях. — У выйгрышы, безумоўна, апынуцца тыя, хто паспеў да дэвальвацыі ўзяць рублёвы крэдыт і купіць кватэру — гэтыя людзі зацікаўлены ў максімальна вялікай дэвальвацыі, бо вярнуць трэба будзе меней. Так што ёсць і тыя, хто выйграе ад дэвальвацыі.

Выказаўся Міхаіл Кавалёў і пра так званую антыкрызісную праграму ўрада з 35 пунктаў:

— Праграма ёсць, і названая яна ўдала — праграма дзеянняў. На жаль, пакуль дзеянняў асаблівых мы не бачым. Мне здаецца, што сёння трэба мець загадзя падрыхтаваныя праграмы для такіх крызісных сітуацый і дзейнічаць рашуча, а не чакаць, што з 1 ліпеня будзе зроблена гэта, з 1 жніўня яшчэ нешта і г.д. Я перакананы, што калі б мы пачалі больш рашуча дзейнічаць у сакавіку, а не спадзяваліся, што сам рынак нешта ўрэгулюе, мы б спыніліся на ўзроўні чатырох тысяч за долар, а не пяці. Зараз выйсці з крызісу можна, толькі дзейнічаючы супольна. Вось калі сінхронна будзе дзейнічаць уся краіна, Нацбанк, эканамічныя ўлады і асабліва насельніцтва, калі мы ўсе зразумеем, што жыць ў доўг не трэба, што жыць трэба толькі па сродках, па зробленых сродках, то мы імгненна выйдзем з крызісу і адновім той жыццёвы ўзровень, які ў нас быў у канцы мінулага года і пачатку гэтага. Перакананы, што гэта магчыма. Адзінае, трэба спакойна ставіцца да таго, што пэўныя імпартныя тавары стануць дарагімі, трэба аддаваць перавагу ў гэтай сітуацыі айчынным таварам. Адным словам, трэба купляць тое, што зрабілі сваімі рукамі.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

**МГКУ дорожно-мостовое предприятие**
**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ЗАПРОС ЦЕНОВЫХ ПРЕДЛОЖЕНИЙ**
**на закупку в 2011 году:**

- резцов W-6H с ограничительной шайбой или аналог для фрез WIRGEN DC 2000 и W-500 в количестве 2000 шт.;
- резцов ДЗ-7 или аналога для фрезы АМКАДОР 8047 А в количестве 1000 шт. за счет собственных средств предприятия.

Ориентировочная стоимость закупки составляет 158 000 000 руб. РБ.
Конечный срок подачи конкурсных предложений **до 12.00 27.06.2011 г.**
По условиям процедуры закупки и с предложениями обращаться по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Габровская, 9; т/ф 8 0222 48 03 38, адрес электронной почты: MGKUDMP@tut.by.
УНП 700265690

# «НЕЛЬГА БЫЦЬ ТРОШКІ ЦЯЖАРНЫМ...»

**З-за складанасцяў на валютным рынку ў беларускіх лізінгавых кампаній узніклі даволі вялікія цяжкасці — прычым попыт на лізінг ёсць, але заключаць дамовы з-за адсутнасці нармальнага механізму канвертацыі валют стала не так проста. Сваімі праблемамі і перспектывамі працы з журналістамі падзяліліся члены Асацыяцыі лізінгадаўцаў.**

## Кампаніі просяць Нацбанк дазволіць лізінг у замежнай валюце

Ужо некалькі гадоў лізінг у Беларусі магчымы толькі ў нацыянальнай валюце. У прынцыпе, гэта зразумела і нармальна, але толькі не для сённяшняй сітуацыі, мяркуе **Максім ЛІСІЦКІ, дырэктар «Райффайзен-лізінг»:**

— У канцы 2008 года Нацбанк фактычна забараніў лізінг унутры краіны за замежную валюту. Для развітых эканомік гэтая мера зразумелая, яна тады ішла ў духу дэдаларызацыі эканомікі — нават калі мы з чымсьці былі не згодныя, але ўсё роўна разумелі логіку рэгулятара. Але гэтая логіка працуе ў адкрытых эканоміках, дзе валютны рынак менш рэгулюемы, чым у нас. І калі зараз мы атрымалі валютны рынак, які дрэнна працуе, то шмат якія лізінгавыя кампаніі пачалі несці пэўныя страты. Бо яны прыцягвалі замежнае фінансаванне, укладвалі яго ў здзелкі, кліенты плацілі рублямі, а за гэтыя рублі куплялася валюта па курсе Нацбанка. На сёння курсы развялі, і ў гэтых лізінгавых кампаній узніклі праблемы. Усе гэта разумеюць, але рэальных дзеянняў, каб дазволіць унутраны лізінг у замежнай валюце, пакуль няма, — патлумачыў Максім Лісіцкі сутнасць праблемы і дадаў, што адпаведныя прапановы ў Нацыянальны банк лізінгавымі кампаніямі былі накіраваны. — Рэгулятары павінны больш аператыўна рэагаваць на тыя змены, якія дорыць нам жыццё: калі нешта ў свой час забаранілі, то давайце гэта аператыўна дазволім, каб не дапусціць сур'ёзных страт аператараў.

У сувязі з такім становішчам лізінгавыя кампаніі сваю дзейнасць трохі згарнулі:

— Цяпер мы дзейнасць прыпынілі: робім новы бізнес, але не ў тых аб'ёмах, у якіх маглі б. Па тых здзелках, якія на кліентаў былі зацверджаны раней, мы выдаём усе лініі, і ніводная з іх не была спынена. Новы бізнес робіцца ў асноўным у беларускіх рублях. Пачынаюць праводзіць здзелкі і ў замежнай валюце, але яны робіцца ад нашай роднаснай кампаніі «Райффайзен-лізінг» у Літве. Такім чынам, лізінгадаўцам з'яўляецца кампанія нерэзідэнт, а лізінгаатрымальнікам — беларуская кампанія. Тады разлікі ў валюце дазволены, і такія здзелкі мы праводзім, працягваем пастаўляць валюту на беларускі рынак і абнаўляць сродкі вытворчасці нашых кліентаў. Але валютныя здзелкі мы праводзім толькі з кліентамі, якія маюць валютную выручку, — сказаў Максім Лісіцкі і дадаў, што, у прынцыпе, стаўкі па лізінгу амаль не змяніліся, але кліентаў, у якіх лізінгавая кампанія не ўпэўнена, яны проста не фінансуюць.

Што тычыцца пратэрміновак лізінгавых плацяжоў, то яны існуюць, але пакуль дырэктар «Райффайзен-лізінгу» не лічыць іх крытычнымі:

— Іх аб'ёмы ў кожнай кампаніі розныя. Што тычыцца нас, то яны пакуль кантралюемыя і малыя — у межах 2-3%. Чаму? Усё-такі кожная кампанія мае пэўную спецыялізацыю. Мы ўніверсальныя, бо ў нас у партфелі ёсць усё, хоць усё-такі большую частку займае нерухомасць (палова партфелю), потым ідуць абсталяванне (каля 30%) і транспарт (каля 20%). У нас таксама сур'ёзны рызыка-падыход да кліента, мы выкарыстоўваем еўрапейскія падыходы. Таму зараз у нас пратэрмінаванасць у межах 2-3%, і мы сапраўды ведаем, што гэта ніжэй за сярэднюю па рынку. У розных галінах кліентаў яна будзе розная. Напрыклад, у экспарцёраў і перавозчыкаў пратэрмінаванай запазычанасці практычна няма. У кліентаў, якія завязаны на ўнутраны рынак, яна вышэйшая. Самая праблемная кліенцкая зона — гэта кліенты, якія маюць крэдыты ці лізінгі ў замежнай валюце, а аб'ём продажаў робяць за беларускія рублі на мясцовым рынку.

Ён таксама акрэсліў перспектывы, якія чакаюць беларускую лізінгавую галіну ў бліжэйшы час.

— Лізінг будзе рухацца за эканомікай, будзе шукаць кропкі росту ў эканоміцы, якія будуць там з'яўляцца і ў час крызісу, і пасля яго. Мы будзем старацца падтрымліваць менавіта плацежаздольных кліентаў. Бо задача лізінгавай галіны — знайсці кліента, які развіваецца, якому не страшна даць грошы, дапамагчы яму прыцягнуць інвестыцыі. І чым лепш кліент развіў бізнес, тым большы шанц, што мы вернем свае грошы і заробім сваю маржу.

Калі ж канкрэтна казаць пра кропкі росту ў эканоміцы, то іх зараз дырэктар «Райффайзен-лізінгу» бачыць такімі:

— Цяпер нам падаюцца найбольш прывабнымі, безумоўна, экспарцёры — прычым тыя, якія маюць як мага меншую долю спажывецкага імпарту ў сваёй вытворчасці. Экспарцёры не толькі тавараў, але і паслуг — у першую чаргу перавозчыкі. Гэта, напэўна, вытворцы спажывецкіх тавараў, якія будуць, на наш погляд, павялічваць тут сваю долю рынку і ажыццяўляць яшчэ і спажывецкі экспарт за межы. Бо ва ўмовах крызісу насельніцтва заўсёды імкнецца эканоміць: яно будзе купляць айчынныя тавары, калі яны будуць не моцна адрозніваца па якасці ад імпартных і будуць дастаткова адчувальна адрозніваца па цане. Адпаведна, вытворцы спажывецкіх тавараў, на наш погляд, будуць мець добрыя перспектывы. Таму гэтыя тры галіны мы найбольш ахвотна зараз фінансуем ва ўмовах крызісу і будзем фінансаваць далей.

## Парадаксальна, але цяжкасці ёсць і з экспартным лізінгам

Цікава, што з-за праблем на валютным рынку з цяжкасцямі вядзення бізнэсу сутыкнуліся і лізінгавыя кампаніі, якія займаюцца экспартным лізінгам: аддаюць замежным асобам ў лізінг тэхніку беларускай вытворчасці.

— Да гэтай праблемы з валютным рэгуляваннем у нас, у прынцыпе, было ўсё нармальна. Сёння ў «Прамагралізінгу» незадаволеных заявак на тэхніку з-за мяжы — больш за 70 мільёнаў долараў, — тлумачыць сутнасць праблемы **генеральны дырэктар ААТ «Прамагралізінг» Павел КРУПНОЎ.** — Звязана гэта перш за ўсё з тым, што цяпер прадпрыемствы не могуць зарыентавацца з курсаўтварэннем. З-за гэтага мы маем вельмі вялікую праблему пры пасоўванні прадукцыі на экспарт. Мы купляем прадукцыю за беларускія рублі, але пры фарміраванні валютнага кошту вымушаны ставіць яе на баланс па курсе Нацбанка. Але па такім курсе яны нам не грузяць — шмат якія прадпрыемствы ставяць курсы, скажам так, «сярэднястолевыя». І мы на першым жа этапе трапляем у страты... Курс павінен стабілізавацца, быць для ўсіх аднолькавым. Гэта вельмі сур'ёзная праблема. Мы можам шмат чаго прапанаваць ураду, але гэта асноўны стрымальны фактар. І чым хутчэй мы вырашым гэтую праблему, тым лепш, бо кліент наш не чакае. Калі мы ім кажам, што не можам зрабіць, то яны ідуць у іншыя кампаніі і купляюць расійскую, украінскую, нейкую іншую тэхніку.

Павел Крупноў дадаў, што зараз яны пакуль прыпынілі экспартны лізінг, але, тым не менш, на месцы не сядзяць і шукаюць іншыя варыянты працы з заводамі — і цэлы шэраг прадпрыемстваў сітуацыю разумее і ідзе на кампраміснyя ўмовы. Ён таксама падкрэсліў, што на беларускую тэхніку за мяжой існуе вялізны попыт:

— Нашыя кліенты нават пачынаюць пісаць лісты ў беларускі ўрад, каб заводы нарэшце вызначыліся са сваёй палітыкай. Нельга быць трошкі цяжарным... А попыт існуе вялікі. Калі згубім аператыўнасць — на наша месца прыйдуць іншыя, бо ў спіну дыхаюць і амерыканскія вытворцы, і расійскія. Чым далей мы гэтую праблему адцягваем, тым больш іншыя прыходзяць на рынак і займаюць нішу беларускіх тавараў.

Яшчэ адна праблема экспартнага лізінгу звязана з тым, што некаторыя беларускія заводы не могуць адысці ад старых схем працы:

— Псіхалагічна на кліента ўздзейнічае не цана аб'екта лізінгу, а працэнтная стаўка. Мы просім у заводаў: дайце нам зніжку як дылеру, мы закладзём меншую маржу і прапануем кліенту не 9% або 6-7%, а 3 працэнты. На жаль, шмат якія нашы заводы не могуць забыць тыя часы, калі чарга на іх прадукцыю была 3-4 месяцы, калі была перадаплата і ўсё забіралі адразу з канвеера. Зараз сітуацыя змянілася, — лічыць Павел Крупноў.

## Сёлета выжывуць толькі моцныя?

Максім Лісіцкі мяркуе, што сёлета лізінгавыя кампаніі мусяць збавіць свае абароты:

— У 2010 годзе быў добры вынік, але ў 2011 годзе ён будзе значна больш сціплы, наколькі — пакажа жыццё. Асноўная задача зараз — не дапусціць лавінападобнага росту пратэрмінаванай запазычанасці і неплацяжоў. Але тыя, хто выжыве ў гэтым годзе, у наступным пакажуць дастаткова добрыя вынікі.

Той жа самай думкі прытрымліваецца і **Аляксандр ЦЫБУЛЬКА, старшыня Беларускага саюза лізінгадаўцаў:**

— Рынак стабільна рос на працягу апошніх гадоў, праўда, за выключэннем 2009 года, калі аб'ём новага бізнэсу (пад новым бізнэсам тут падразумяваецца сума заключаных за год дагавораў лізінгу) упаў на 34% (у Еўропе — на 32%, у Расіі — на 56%). У 2010 годзе рынак лізінгу вырас роўна на 100%... Зараз зноў крызіс, бо няма канвертацыі валют, няма крыніцы пагашэння знешніх запазычанняў — безумоўна, гэта балюча б'е па тых кампаніях, якія мелі такія запазычанні. А гэта перш за ўсё шмат якія лідары рынку. Я спадзяюся, што яны стойка перанясуць складанасці, не ў першы раз. Там працуюць прафесіяналы высокага ўзроўню, і наогул я хачу сказаць, што сёння рынак лізінгу дастаткова прафесійны. Я не думаю, што сітуацыя іх зломіць, мяркую, што гэта мы сітуацыю пераломім.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**АДКАЗЫ НА СКАНВОРД**

**Па гарызанталі:** Шайба. Бумеранг. Фура. Тара. Акт. Спуд. Гак. Удод. Грыб. Сіл. Абрус. Граната. Пан. Ліпа. Уран. Капітан. Гітара. Сібарыт. Тар. Танкер. Кока. Сага. Валан. Каса. Тэрмас. Маса. Драч. Крытыка. **Па вертыкалі:** Нібелунгі. Скіт. Молат. «Атас». Пара. Сапфір. Грот. Пліта. Тата. Арфа. Панда. Карма. Урад. Нанка. Мяч. Барак. Спас. Тур. Сена. Сак. Цір. Збан. Лусака. Гарнір. Рол. Пазыка. Туркестан. Танкетка.

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.37 | 21.45 | 17.08 |
| Віцебск — | 4.18 | 21.43 | 17.25 |
| Магілёў — | 4.27 | 21.35 | 17.08 |
| Гомель — | 4.33 | 21.22 | 16.49 |
| Гродна — | 4.54 | 21.58 | 17.04 |
| Брэст — | 5.04 | 21.49 | 16.45 |

**Месяц**

*Поўня 15 чэрвеня.*
*Месяц у сузор'і Вадалея.*

**Імяніны**

**Пр.** *Апалона, Дарафея, Ігара, Канстанціна, Леаніда, Нікандра, Фёдара.*
**К.** *Альжбеты, Аманды, Паўлы, Марка, Марцэля.*



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.




## 18 чэрвеня

*Дзве даты*



**1806 год** — нарадзіўся (маёнтак Парэчча Слонімскага раёна) Міхаіл Валовіч, беларускі рэвалюцыянер, сацыяліст-утапіст. У 1822-25 гадах вучыўся ў Віленскім універсітэце. Удзельнічаў у паўстанні 1830-31 гадоў у Польшчы, Беларусі і Літве. Пасля разгрому паўстання эміграваў у Францыю. Уваходзіў у склад эміграцкіх палітычных арганізацый. Крытычна ацэньваў вопыт паўстання, якое, на яго погляд, не мела «чалавекалюбных мэт», выказвала толькі інтарэсы шляхты. Прытрымліваўся радыкальных поглядаў на шляху сацыяльнай перабудовы грамадства. Выступаў за ліквідацыю буйнога памешчыцкага землеўладання, а таксама за абвяшчэнне Беларусі і Літвы дэмакратычнай рэспублікай, звязанай федэратыўнымі адносінамі з Польшчай. Сродкам дасягнення дэмакратычнага і справядлівага грамадскага ладу лічыў сацыяльную рэвалюцыю агульнаеўрапейскага маштабу. Для падрыхтоўкі выступлення ў сакавіку 1833 года ў якасці начальніка паўстанцаў Слонімскага і Навагрудскага паветаў прыбыў у Беларусь. Вёў агітацыю сярод сялян. Стварыў у ваколіцах Слоніма невялікі партызанскі атрад, але шырокай падтрымкі насельніцтва не атрымаў. У маі 1833 года атрад быў разбіты, а Валовіч арыштаваны. Па прысудзе ваенна-палявога суда ў тым жа годзе быў павешаны ў Гродне.

**1840 год** — імператар Мікалай I выдаў указ аб забароне выкарыстання ў афіцыйных дакументах тэрмінаў «Беларусь», «Літва», «беларуская губерня», «літоўская губерня» і ўвядзенне замест іх назвы «Паўночна-Заходні край».

*Цытата дня:*

***«Чалавецтва, у масе сваёй, ніколі не будзе імкнуцца бачыць рэчы такімі, якія яны ёсць».***

**Мэцью Арнолд (1822—1888), англійскі паэт і педагог.**

# «ХАДЗІЦЬ ПА БЕЛЫМ»

**СЁННЯ мы працягваем традыцыі продкаў, хоць і ў крыху зmененым выглядзе. З аднаго боку, мы падаліся позняй навацыі і апранаем нябожчыка ў адзенне цёмнага колеру, а з іншага — захавалі памяць пра мінулае: памерлага пакрываюць саванам — тканінай белага колеру, абсалютна чыстай.**

● На дно труны (радзей — у магілу) клалі белы ручнік — знак дарогі са свету жывых у свет продкаў. У Баранавіцкім раёне ў труну, пад галаву памерлага, і сёння абавязкова кладуць новую белую прасціну.

● Дзяўчат і дзяцей, паводле традыцыі продкаў, і сёння хаваюць у белым адзенні: апранаюць дзяўчат-нябожчыц у белае звязана з абрадам «пахаванне-вяселля», бо паўсюдна іх лічылі Божымі нявестамі.

● Яшчэ і сёння ў вёсках ад вельмі старых людзей можна пачуць успаміны пра тое, як хавалі іх дзядоў. Абавязковай умовай пахаванняў было: выкласці бераґі магілы белай тканінай; абсыпаць магілу белым пяском (выкласці глінай); і пазнейшае — кінуць на дно магілы белы ручнік (кавалак белай тканіны).

● Людзі старэйшага пакалення ўвесь час нагадваюць пра катэгарычную забарону: чырвоны колер у адзенні памерлага не павінен прысутнічаць нават фрагментарна, бо гэта магло пацягнуць за сабой яшчэ адну смерць кроўнага сваяка. У той жа час адно з першых рытуальных дзеянняў пасля канстатацыі смерці чалавека — абараніць цяжарную жанчыну і малалетніх дзяцей, перавязаць іх паясніцу чырвоным поясам-абярэгам ці запясце чырвонай стужкай, якую закрывалі рукавом адзення. «На Палессі і некаторых іншых раёнах Беларусі, калі цяжарная вымушана была ісці на пахаванне, яна прывязвала да пояса чырвоную стужку ці пакрывала галаву чырвонай хусткай».

● Часам функцыю абярэга выконвала чырвоная нітка, завязаная на пальцы. Акрамя гэтага, у заходняй частцы Беларусі былі зафіксаваны выпадкі, калі труну з памерлым некалькі разоў перавязвалі чырвонай ніткай ці папярок цела памерлага клалі чырвоную нітку. Такія дзеянні засцерагалі ўсіх прысутных ад кантакту з тым светам.

● Некалькі дзесяцігоддзяў назад труну з памерлым апускалі ў магілу на спецыяльна вытканых для гэтага ручніках. Прычым труна знаходзілася на яго белай частцы, а тыя, хто апускаў труну, трымалі ручнік за яго хвасты, як правіла, з арнаментам ці гафтам ярка-чырвонага колеру.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся!

Дачка тэлефануе маці і скардзіцца:
— Мой муж не хоча есці грэчку...
— Дачушка, раскажы, а як ты яе варыла?
— ВАРЫЛА???

☺

**Інспектар ДАІ Пятроў з болем у сэрцы і слязьмі на вачах аштрафаваў свайго пяцігадовага сына, які ехаў на трохколавым ровары і не быў прышпілены.**

☺

— Якая розніца паміж Кірай Найтлі і Ганнай Семяновіч?
— Ну, па-першае, дзве вялікія розніцы...

☺

**А больш за ўсіх ад крызісу пацярпеў Вовачка. Ён атрымаў двойку ў той дзень, калі яго нервовы бацька трапіў пад скарачэнне.**




У гэты цудоўны сонечны дзень сардэчна віншуем прыгожую маладую пару **Аляксандра Сахончыка і Настассю Казакевіч з узяццем шлюбу.**

*Хай кросны рупныя жыцця*
*Дарожку ткуць вам доўга-доўга,*
*І каб яна заўжды была*
*Шчаслівай, светлаю дарогай.*

**З найлепшымі пажаданнямі родныя з Мінска і Слуцка.**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, бухгалтэрыі: 292 22 03.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 2895.

Нумар падпісаны ў 19.30 17 чэрвеня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12